ВАЛЯНЦІН АКУДОВІЧ

# КОД АДСУТНАСЦІ

## (АСНОВЫ БЕЛАРУСКАЙ МЕНТАЛЬНАСЦІ)

МІНСК 2007

УДК 882.6-31
ББК 84 (4 Беи)
А 44

**Рэдактар выдання**

Алесь І. АНЦІПЕНКА

**Карэктар**

Аксана СПРЫНЧАН

**Кампутарная вёрстка**

Алесь А. АНЦІПЕНКА

**Вокладка**

Артур КЛІНАЎ

**Акудовіч В. В.**
А 44 Код адсутнасці (асновы беларускай ментальнасці)/
Акудовіч Валянцін. — Мн.: Логвінаў, 2007. — 216 с.

ISBN

**УДК 882.6-31**
**ББК 84 (4 Беи)**

© Акудовіч В. В., 2007
© Клінаў А. А., вокладка, 2007

# З М Е С Т

## I. АСНОВЫ БЕЛАРУСКАЙ МЕНТАЛЬНАСЦІ


Зачын ........ 8

1. Гістарычнае і нацыянальнае ........ 10

2. Рэлігійнае і нацыянальнае ........ 15

3. Уласна нацыянальнае ........ 22

4. Рэфлексія з нагоды ........ 27

5. Праблема ўласных межаў ........ 28

6. Межы Айчыны і мовы ........ 32

7. Расейская імперыя — калыска беларускай нацыі ........ 40

8. Паўстанне аўтсайдэраў ........ 45

9. Пакліканне прасторы ........ 51

10. Дзяржава і нацыя ........ 53

11. Другая сусветная вайна ........ 60

12. Урбанізацыя ........ 72

13. Рэванш нацыяналізму ........ 79

14. Расея і мы ........ 81

15. Францішак Багушэвіч і Адам Міцкевіч ........ 86

16. Мы і Расея ........ 92

17. Гісторыя эмацыйнага ........ 96

18. Воля да ўлады ........ 98

19. Ідэя Адраджэння ........................................................................................ 106

20. Мова (Знак бяды) ........................................................................................ 118

21. Героі адсутнасці ........................................................................................ 131

22. Беларусь як прастора сакральнага ................................................................ 137

23. Вялікая здрада ........................................................................................ 143

24. Ідэалогія і тэхналогія .................................................................................. 154

25. Наастачу ........................................................................................ 156

## II. ДАДАТАК

Гульня ў віртуальную дзяржаву ...................................................................... 167

Йохан Хейзінга і мроі пра віртуальную дзяржаву ............................................... 170

Этычны імператыў на скразняках прагматыкі ................................................ 174

Жыццё і смерць у дыскеце з Айчынай ........................................................... 177

Доўгая, вельмі доўгая паўза ........................................................................ 180

Асоба і гісторыя ........................................................................................ 192

Улада і мова ........................................................................................ 203

## III. ЛІРЫЧНЫ (МЕТАФІЗІЧНЫ) ЭПІЛОГ

Лірычны (метафізічны) эпілог ...................................................................... 211

# АСНОВЫ
# БЕЛАРУСКАЙ
# МЕНТАЛЬНАСЦІ

*Гэтая кніга, нечаканая мне самому, адасобілася з цыклу лекцыяў "Асновы беларускай ментальнасці", падрыхтаванага для Беларускага Калегіуму. Улегшыся ў адукацыйную працу, я ў нейкі момант адчуў мусовую патрэбу выйсці за лекцыйны фармат і скінуць да адной купы ўсё тое думанне пра Беларусь, што вярэдзіла мяне цягам доўгага часу. Зрэшты, у гэтай эмацыйнай патрэбы была свая, уласная, логіка. З ХХ стагоддзем скончылася і вялікая эпоха "буры ды націску", у выніку якой паўсталанезалежная Беларусь. Далей пачалося нешта цалкам іншае, але ніяк не падобнае да таго,аб чым мроілася і марылася на пачатку дзевяностых гадоў. Мы патрапілі зусім не туды, куды імкнуліся, мы наўсцяж апынуліся не там, дзе хацелі быць. Чаму так сталася? Кніга "Код адсутнасці" ёсць маім вымерам адказу на гэтае запытанне.*

**Аўтар**

# ЗАЧЫН

“Калісь яшчэ свет толькі зачынаўся, дык нічога нідзе не было. Усюды стаяла мёртвая вада, а пасярод вады тырчэў нібы камень, нібы што...”

Гэта пачатак аднаго з касмаганічных міфаў беларускай аўтэнтыкі. Я яго нагадаў, каб далей разрозніць *гісторыю Беларусі* (абмінаючы пакуль праблему самога этноніму “Беларусь”) і *нацыянальную гісторыю*. Дык вось, *гісторыя Беларусі* пачынаецца з таго моманту, калі Пярун ударыў у гэты “нібы камень, нібы што...”, іншымі словамі — са стварэння свету. І яна будзе доўжыцца, пакуль свету наканавана існаваць, незалежна ад таго, якімі яшчэ словамі стане пазначацца нашая зямля ў наступныя эпохі, і як сябе будуць тады называць насельнікі гэтай зямлі.

Зусім іншая рэч — *нацыянальная гісторыя*... Нацыянальны чалавек паўстаў з крызы рэлігійнага чалавека і, шырэй, з крызы цывілізацыі рэлігійнага тыпу. Калі гэткае здарылася, тады на цэнтрапалеглае месца, якое раней займала ідэалагема Бога, была пакліканая ідэалагема Нацыі. Як вядома, згаданы тут акт радыкальнай мадэрнізацыі светаўладкавання адбыўся зусім нядаўна, ад роду яму ўсяго некалькі стагоддзяў. Таму бывае дзіўна чуць пра “старыя” і “маладыя” нацыі, прынамсі, у гістарычным вымярэнні мы, скажам, з немцамі, лічы што, пагодкі. (Паміж смерцю Гердэра і Фіхтэ ды нараджэннем Багушэвіча ўсяго некалькі дзесяцігоддзяў.)*

Ясная рэч, што Багушэвіч кагадзе згадаўся невыпадкова. Бо менавіта ён найбольш паўплываў на расчын нашай *нацыянальнай гісторыі*, геніяльна сфастрыгаваўшы паэтычны міф з назвай “Беларусь”. Наступная, роўнавялікая Багушэвічу, падзея — газета “Наша Ніва”...

З іншага боку, у канцэптуальным плане мы мелі б прыбліз-

на тое самае, што маем, і без Багушэвіча, і без “Нашай Нівы”. Было б залішне рамантычна (ці містычна) звязваць такую анталагічную падзею, як нараджэнне нацыі, з несістэмнымі выпадкамі прыватнага тыпу. Сувязь тут хутчэй цалкам адваротная: і Багушэвіч, і “Наша Ніва” — гэта ўсяго толькі адметныя моманты фармалізацыі новай нацыі, якая ўжо саспела, каб выйсці з латэнтнага стану ў сітуацыю культурнай і геапалітычнай рэальнасці.

Што да праблемы канца нацыянальнай гісторыі, дык яна ляжыць не ў сферы геапалітыкі. Не залежыць яна і ад унутранага развою нацыякультурнага патэнцыялу. І знадворкавыя, і ўласныя антынацыянальныя чыннікі могуць марудзіць, замінаць, татальна прэсінгаваць нацыянальную гісторыю, але яны ніколі не здолеюць перапыніць яе канчаткова да той пары, пакуль не зменіцца наяўны тып цывілізацыі на іншы, у якім нацыянальнае ўжо не будзе актуальным.

З таго, што чалавек тысячагоддзямі жыў без праблемы *нацыянальнага*, лагічна выснаваць, што рана ці позна гэткая пара зноў надарыцца і людзі стануць сябе ідэнтыфікаваць (ведаць і разрозніваць) не паводле нацыянальнага коду, а неяк інакш. Ужо ж напэўна калісьці так яно і будзе...

Але, відавочна, яшчэ не надта хутка. І таму праблема нацыянальнага пакуль застаецца і рэальнай, і актуальнай.

---

* “У 1797 годзе Іаган Вольфганг Гётэ і Фрыдрых Шылер задаюць знакамітае пытанне: “Германія? А дзе ж яна? Не ведаю, дзе знаходзіцца гэтая краіна”... Праз 50 гадоў, у 1848 годзе, немцы ўсё яшчэ будуць мець кардынальна адрозныя погляды на тое, чым ёсць Германія” (Раман Шпарлюк, “Фармаванне сучаснай Украіны: заходні вымер”).

## 1. ГІСТАРЫЧНАЕ І НАЦЫЯНАЛЬНАЕ

Нацыя — мадэрновае ўтварэнне. Але ніводная нацыя не робіць акцэнт на ўласнай навіне, хаця звычайна кожная супольнасць падкрэслівае і вылучае Ўсялякі акт радыкальнай мадэрнізацыі, як найлепшы аргумент на карысць сваёй жыццядайнасці*.

У чым тут справа? Чаму нацыя замест таго, каб пафасна дэклараваць уласную мадэрновую сутву, прагне нізрынуцца на самае прадонне гісторыі, як бы знікнуць у атаясамленні сябе з гісторыяй, і не толькі летапіснай, а і міфалагічнай?

Адным словам, чаму кожная нацыя хоча быць *старой нацыяй* — як мага больш старой, нават у супрацiў гістарычным фактам і хоць якой уцямнай матывацыі?

Каб адказаць на гэтае пытанне, нам спатрэбіцца згадка пра кнігу Бенедыкта Андэрсана “Уяўныя супольнасці”. Аўтар, прааналізаваўшы шляхі фармавання нацыяналізму на розных кантынентах, адзначыў (далёка не ўпершыню) адсутнасць нейкай універсальнай формулы паўставання і функцыянавання нацыяў. Адсюль і паходзіць яго знакамітая выснова: нацыі — гэта *ўяўныя супольнасці*.

Мы, у сваю чаргу, праз гэтую выснову паспрабуем адказаць на ўласнае запытанне: навошта нацыянальнаму гістарычнае?

Перадусім звернем увагу на слова “ўяўнае”. Нацыя не ёсць нечым рэальным, але паколькі яна ёсць, адбылася, дык шукае спосабы, каб нейкім чынам уцялесніцца ў рэальнае. Адным з найбольш эфектыўных спосабаў гэтага ўцеляснення і сталася якраз гістарычнае, якое нагружае “ўяўную супольнасць” *рэальнасцю мінулага*.

Само гістарычнае не ёсць падставай (прынамсі, непасрэднай) нацыянальнага, але праз упісанасць гістарычнага ў

“астральную” фігуру нацыі, апошняя набывае цялеснасць у прасторы і часе, а з гэтага і легітымацыю ў ментальным дыскурсе. Вось чаму кожная нацыя звычайна праецыруе на сябе ўсю сацыяльную і культурную гісторыю падлеглага ёй логатопу.

Урэшце, гэткая маніпуляцыя цалкам зразумелая. Бо гістарычная рэтраспектыва і дасюль застаецца ці не адзіным (хоць якім) алібі на карысць рэальнасці нацыі. Таму калі мы канчаткова парвем звяз нацыянальнага з гістарычным, дык у метафізічнай праекцыі нам застанецца высноўваць нацыянальнае з містычнага, а ў праекцыі рэальнасці — з футурыстычнага. Аднак тая жорстка дэтэрмінаваная сувязь, што існавала між імі раней, сёння выдае на анахранізм.

Разам з тым, нават мноства грунтоўных навуковых даследванняў, якія ў ХХ стагоддзі, здаецца, дарэшты развеялі міф аб “старажытнасці” нацыяў, не змянілі ўяўлення масавай свядомасці аб сваёй нацыянальнай лучнасці з пракаветнымі прашчурамі. Сведчанняў таму ўсюды нямерана, але мы не станем за імі далёка хадзіць. Згадаем Беларусь канца васьмідзесятых — пачатку дзевяностых (ХХ стагоддзя), калі магутная хваля нацыянальнага Адраджэння ўзножыла краіну. Дык вось, не звяртаючы ўвагі на ўсю сучасную аналітыку гэтай праблемы, ідэолагі і тэарэтыкі Адраджэння ўлегліся рэканструяваць яго нацыянальную складовую ад першых летапісных звестак пра гісторыю нашага краю. І па сёння тая канструктыўная хімера застаецца дамінуючай у масавай свядомасці, хаця, здаецца, ужо даўно пара было б унікнуць штучна-прымусовага задзіночання несумерных ды несуладных феноменаў з розных часоў і розных прастораў у адной задушлівай цэлі. Але нам усё яшчэ падаецца абгрунтаваным сашчэплiваць ідэяй нацыянальнай Беларусі ў нейкую вектарна паслядоўную і трывалую еднасць Усяслава Чарадзея і Цішку Гартнага, Кірылу Тураўскага і Стэфана Баторыя, Сымона Буднага і Пятра Машэрава, Полацкае княства, Рэч

Паспалітую і БССР, крэваў, ліцвінаў, русінаў, яцвягаў, "сарматаў", вялікалітоўцаў, тутэйшых, крэсавякаў, беларусаў, мы-рускіх...

Колькі не адно ідэалагічна, а і ідэалагемна амаль ніякім чынам не стасоўных сусветаў спрадвеку табарылася ў нашай прасторы, і з якім дзівам, абурэннем ці рогатам успрыняла б бальшыня герояў тых разнаітых і ўжо даўно прамінулых сусветаў звестку з будучыні, што яны, атрымліваецца, працавалі, змагаліся, пакутавалі і ахвяравалі сваімі жыццямі на карысць *ідэі нацыянальнай Беларусі* і таму цяпер фігуруюць адныя ў пантэоне, а другія ў іканастасе змагарных ваяроў і святых пакутнікаў гэтай ідэі.

Дзіўная аблуда... Усе тыя людзі жылі (ні сном, ні духам ведаць не ведаючы пра нейкую там Беларусь), а падзеі здараліся дзеля апрычоных задачаў і мэтаў,— між іншым, арганізаваных ды ідэалагічна забяспечаных нейкімі ўласнымі стратэгіямі, што робіць ужо зусім непрыстойным бясконцае перацягванне нябожчыкаў за вушы з адных ідэалагемаў у іншыя... І на якую такую трасцу нам гэтыя не вельмі далікатныя і не надта плённыя некрафільскія мітрэнгі?! Вунь ужо колькі ўсяго панацягвалі, а сэнсу? Няўжо не бачна, што ўніверсалісцкі ўцэнтраваная ідэя нацыянальнай Беларусі так і не змагла (і не магла і не зможа — тым болей у кантэксце сучасных светаглядных тэндэнцыяў) ахапіць, злагодзіць і жыццядайна дапасаваць да свайго эйдычнага фантому ўсе тыя шматлікія дыскурсы рэальнага бытнага, што разгортваліся ў гэтым логатопе цягам тысячагоддзяў.

Зрэшты, апошняе запытанне было звычайнай рыторыкай. Крызіс *ідэі* ***нацыянальнай*** Беларусі (у моўна-этнаграфічнай перспектыве) навідавоку, як навідавоку і спробы пераадолець яго праз замену адной збанкрутаванай логацэнтрычнай уявы на такую самую, але іншую. Сярод "іншых" сёння найперш міжсобку канкуруюць за лідэрства канцэпты крываў і ліцвінаў.

Малаверагодна, што адзін з гэтых двух канцэпцтаў ці нейкі яшчэ трэці хоць у якой аддаленай віртуальнасці пераможа хай сабе ўжо і збанкрутаваную *ідэю* нацыянальнай Беларусі ды зойме цэнтрапалеглае месца ў ідэалагемнай кампазіцыі нашага бытнавання. Аднак калі падобнае і здарыцца, дык з гэтага вялікага гармідару мы будзем мець раўнютка тое самае, што маем і цяпер. Усяго толькі і будзе навіны, што на месцы ўжо звыклых з'явяцца занатаваныя раней адно на маргіналіях альбо тады ўвогуле адсутныя на нацыянальных скрыжалях гістарычныя фігуры і падзеі. Бо паводле сваёй логацэнтрычнай сутвы *нацыянальная ідэя* Крываў (як і Ліцвінаў) нічым не розніцца ад *ідэі* нацыянальнай Беларусі і гэтаксама як апошняя ахоплівае толькі адно з вымярэнняў *дыскурсу* Беларусі, адсякаючы і марнуючы ўсе шматлікія іншыя.

І што з усяго гэтага вынікае? Ды тое, што як па-добраму, дык ужо пара было б нам неяк пакрысе пераставаць займацца марнатраўствам уласных энергіі і часу. Сэнс не зробленага — заставацца не зробленым. І паколькі ў свой час нам не было наканавана выштукаваць на гістарычным подзе ўсялякія цэнтрапалеглыя канструкцыі і абстракцыі, у тым ліку і такія, як, скажам, нацыянальная ідэя і нацыянальная дзяржава, то і не трэба сёння жыць прамінулым днём, згодна прымаўкі: лепей позна, чым ніколі... Ніяк не лепей позна, хаця часам і вельмі карціць, каб у нас усё хоць калі было, як у суседзяў было некалі. Тае бяды. Не станем лішне нурыцца з таго, што ў нашай гісторыі адсутнічае колькі там эпохаў сацыяльнай фармалізацыі ідэальных універсаліяў. Бо праблема палягае зусім у іншым, а менавіта ў тым, што і цяпер мы ўсё яшчэ глядзім на свет праз бельмы сімулякру гамагеннай нацыі і таму не бачым Беларусь як дыскурс шматлікіх і разнастайных сусветаў, якія без калецтва кожнага з іх не могуць быць паяднаныя ў нейкую агульнасць нічым яшчэ, апрача як *дыскурсам* Беларусі.

## 2. РЭЛІГІЙНАЕ І НАЦЫЯНАЛЬНАЕ

Як ужо казалася ў зачыне, "нацыянальны чалавек паўстаў з крызісу рэлігійнага чалавека і, шырэй, з крызісу цывілізацыі рэлігійнага тыпу. Калі гэткае здарылася, тады на цэнтрапалеглае месца, якое раней займала ідэалагема Бога, была пакліканая ідэалагема Нацыі"... Але такое здарыцца не хутка, да гэтага еўрапейскаму чалавецтву будзе наканавана больш як на паўтары тысячы гадоў схавацца ў татальна рэлігійнае жыццё.

Рэлігійная канцэпцыя бытавання чалавека ў гранічна аголенай і максімальна спрошчанай схеме выглядае прыкладна так: ёсць Бог і ёсць адзін, сам-насам, чалавек. І больш нікога і нічога няма, прынамсі, усё астатняе не-істотнае... Бог і чалавек звязаныя між сабою верай чалавека ў Бога і любоўю (хаця гэта часам і выклікае сумнеў) Бога да чалавека.

Праўда, з цягам часу выявілася, што лучва Бог—чалавек функцыянуе куды больш прадуктыўна, калі мае пасярэдніка — інстытут Бога. У нашым выпадку ім сталася Царква. Яна мацуе веру чалавека і тлумачыць прынцыпова невытлумачальную трансцэндэнцыю Бога. Вось і ўсё. Гэтым у схеме і вычэрпваецца рэлігійны тып цывілізацыі. І для такога спосабу існавання не патрэбныя ні Францішак Скарына, ні Леў Сапега, ні Сімяон Полацкі. Нават і Лазар Богша не патрэбны, бо ў дачыненнях паміж Богам і чалавекам дзве змацаваныя накрыж трэскі маюць аднолькавую каштоўнасць з крыжам Ефрасінні Полацкай. А, верагодна, трэскі — нават і большую. Бо эстэтычна самакаштоўная аздоба ўраўноўвае знак трансцэндэнтнага з творчым актам чалавека і ў пэўным сэнсе нават

---

* Літаральна тое самае турбуе і Б.Андэрсана: "Але чаму нацыі праслаўляюць сваю старажытнасць, а не сваю маладосць?" ("Уяўныя супольнасці").

супрацьпастаўляе людскае боскаму — спакушае веру культурай. У той час, як ідэал рэлігійнага ладу жыцця найлепей выяўляе наступная трыяда: пячора, аскеза, пустэльнік. Век апошняга належыць віртуальнаму дыялогу з Богам і чаканню персанальнай сустрэчы з Ім...

Ідэальны вернік не лучыць сябе ні з мінулым, ні з будучым, ён па-за людствам, па-за гісторыяй, па-за быційнасцю. Ён адразу і назаўжды — суб'ект вечнасці, для якога іманентнае зямное жыццё — толькі прыкрая недарэчнасць, на якую пажадана як мага хутчэй забыцца.

Калі б не зацятая апазіцыйнасць быційнай культуры, дык зусім верагодна, што рэлігійная артадаксальнасць была б даведзеная да лагічнага абсалюту, і ў скутку хрысціянскі варыянт цывілізацыі нагадваў бы глухое напаўдзікунскае мястэчка Назарэт, уся акраса жыцця якога згорнутая да відовішчаў містычнага экстазу вандроўных месіяў. Зрэшты, Еўропа ў прамежку ад скanання Рымскай імперыі і да пярэдадня Рэнесансу была амаль што гэткім самым Назарэтам.

Усталяванне хрысціянства — гэта магутная па маштабах акцыя з мэтай перавесці цывілізацыю з інтэлектуальнага спосабу быцця на інтуітыўны, з рацыянальнага на ірацыянальны. Як казаў Тэртуаліан: “Пасля Ісуса Хрыста нам не патрэбнае веданне, а пасля Святога Дабравесця — пошукі”.

На рацыянальным антычным ладзе жыцця быў пастаўлены ірацыянальны хрысціянскі крыж. Больш за тысячагоддзе еўрапейскія народы існавалі ў межах рэлігійнага закону, сфармуляванага Нікейскім саборам. Без перабольшвання можна сцвярджаць, што царква зрабілася формай і мерай свету. Паводле словаў Іаана Салсберыйскага, яна стаяла “над усімі царамі, царствамі, дзеямі, чалавекамі і народамі”.

Эпоху першай буйной паразы Рэлігіі мы называем Рэнесансам. Менавіта з гэтай эпохі ірацыянальная сутва светагляду

зноў пачынае саступаць рацыянальнай. На нашай зямлі канец ірацыянальнага абсалютызму быў зафіксаваны фактам стварэння Статута Вялікага Княства Літоўскага. Статут — быційная альтэрнатыва рэлігійнаму закону, ён — сведчанне расколу цэльнага вобразу існавання на два складнікі: зямны і нябесны; надалей яны яшчэ доўга будуць існаваць у агульным ладзе, але ўжо кожны паасобку. Аднак праз пэўны час "зямны" чыннік станецца спрэс дамінуючым, калі ўнутры самога сябе вынайдзе альтэрнатыву Рэлігійнаму. Імя гэтай альтэрнатывы — Нацыя.

Феномен нацыі і па сёння застаецца толькі названым, але не вытлумачаным. Скуль гэтая патрэба ў чалавеку быць належным да пэўнай супольнасці людзей, адчуваць адказнасць за яе гістарычны лёс і нават ахвяраваць дзеля яе жыццём? Чаму чалавеку не стае быць чалавекам, а патрэбна яшчэ беларусам звацца? З чаго гэта яму замала самога сябе, сваёй сям'і, сябрыны, суседзяў, чалавецтва ўрэшце? Тым болей, што Нацыя — не гарант бяспекі, як Дзяржава, не надзея на па-за існае векаванне, як Рэлігія. У прагматычным сэнсе чалавеку з Нацыі аніякай карысці. І ўвогуле, з пэўнага гледзішча Нацыя — гэта толькі слова, агульнае найменне — "номен". (Універсаліі рэальна не існуюць, сцвярджалі схаласты сярэднявечча — ёсць толькі адзінкавае, "рэс сінгулярэс".)

Яшчэ адзін цьмяны бок феномену Нацыі — гэта яе вызначальная роля ў стварэнні новаеўрапейскіх дзяржаваў, а пазней — і на іншых кантынентах свету. Новы час прадэманстраваў выразна акрэсленую тэндэнцыю згортвання Дзяржавы ў памер, вызначаны нацыянальнымі межамі. Найлепшым сведчаннем таму — сістэмны распад вялікіх і малых імперыяў. Натуральна, Дзяржава не мела ніякай ахвоты ўціскацца ў памер Нацыі, але іншага выйсця ў яе не было. Нечакана для самой сябе некалі самадастатковая і пыхлівая Дзяржава неўпрыкмет ператварылася ўсяго толькі ў вартаўніка

нацыянальнага саду, што адначасна падпрацоўвае ў ім садоўнікам. Але ўзаемадачыненні Нацыі і Дзяржавы — іншая тэма, і мы яе пакуль пакінем.

Як і Дзяржава, Рэлігія таксама не імкнулася ісці ў паслужкі да Нацыі, аднак у сітуацыі крызісу рэлігійнага светаўладкавання, каб заставацца, быць — яна, з перыяду Рэфармацыі, мусіла падладджвацца спачатку пад патрэбы Дзяржавы, а затым — Нацыі. Дарэчы, кальвінізм, лютэранства, уніяцтва і да таго падобнае — гэта не што іншае, як выдзяленне з універсальнай прасторы рэлігійнага тых лакальных дыскурсаў, якія ў большай меры тоесніліся з сугестыяй нацыянальнага...

Агульную тэндэнцыю да нацыяналізацыі Рэлігіі выразна акрэсліў пераклад Бібліі на нацыянальныя мовы,— у друку распачаты немцам Марцінам Лютэрам і неўзабаве працягнуты беларусам Францішкам Скарынам.

Працэс нацыяналізацыі рэлігійнага ахоплівае стагоддзі, і, натуральна, у розных краінах ён складваўся па-рознаму. У звязку з вылучанай праблемай мы звернем увагу толькі на нашых бліжэйшых суседзяў. Спачатку цытата з Мікалая Бярдзяева: “Расейская гісторыя прадэманстравала выключна ўнікальнае відовішча — абсалютную нацыяналізацыю царквы Хрыстовай, якая вызначае сябе як сусветную. Царкоўны нацыяналізм — уласцівая расейская з’ява, ім наскрозь прасякнута стараверства. Але той самы нацыяналізм уладарыць і ў пануючай царкве”.

Не станем засяроджвацца на сцвярджэнні выключнасці нацыяналізму ў расейскай царкве. Расейскай ментальнасці ўласціва надаваць статус выключнасці ўсяму, што дзеецца ў Расеі. Спынім увагу адно на характарыстыцы сітуацыі, якая наўпрост аргументуе нашыя папярэднія развагі... (Праўда, тут, бадай, не лішне будзе яшчэ раз нагадаць агульнавядомае: у Візантыі, у адрозненне ад Свяшчэннай Рымскай імперыі, Царква ад пачатку была адзяржаўленай і ў такой якасці перайшла да

спадчыннікаў. Таму ў Расеі Царква ніколі не працавала непасрэдна на ідэю Рэлігіі. Наперадзе заўсёды былі альбо патрэбы Дзяржавы, альбо, пазней, Нацыі, а ўжо потым, пры магчымасці, патрэбы самой веры.)

Трохі інакш азначаная сітуацыя складвалася ў Польшчы. Надоўга пазбаўленая дзяржаўнасці, польская нацыя абапіралася на Касцёл і гуртавалася Касцёлам (як у зусім іншую эпоху маскоўцы гуртаваліся Царквой супраць Арды). У выпадку з Польшчай уяўляе цікавасць той факт, што нават у адсутнасці Дзяржавы, Нацыя можа ператварыць Рэлігію ў магутны сродак свайго фармавання.

Цяпер колькі словаў пра нашу Бацькаўшчыну. Мы выспелі як Нацыя без непасрэднага ўдзелу Царквы. Калі на абшарах нашай краіны адбывалася адзяржаўленне Рэлігіі (ВКЛ, Рэч Паспалітая), Нацыя яшчэ не выспела. Калі Нацыя выспела, ужо не было ні *сваёй* Дзяржавы, ні *сваёй* Царквы.

Мы вызначыліся ў прасторы і часе выключна як быційная самасць. Бо мала таго, што Рэлігія ў Беларусі, як і кожная Рэлігія ў любым іншым месцы, драбіла этнас на паасобныя суб’екты і гэткім чынам вышморгвала нашых продкаў, так бы мовіць, па вертыкалі з быційнасці ў трансцэндэнцыю, дык яна яшчэ і шкамутала этнас па гарызанталі. Канфесійная рознапежнасць цягнула Нацыю адразу ў розныя бакі, як лебедзь, рак і шчупак — крылоўскі вазок. І калі б не быційная, а рэлігійная культура была асновай беларускай Нацыі, дык ад нас ужо даўно і шматкоў не засталося б.

Сёння мы ў параўнанні з суседзямі, лічы, чысты феномен быційнай культуры. Прынамсі, на апошнім этапе нацыянальнага выспявання беларусы абыходзіліся выключна ўласнымі сіламі, паўставалі самі з сябе. Хаця тут трэба падкрэсліць, што менавіта на апошнім этапе, бо калі мерыць на глыбіню ўсёй мінуўшчыны, якая папярэднічала паўста得ванню Нацыі, дык нельга не

заўважыць, што ідэя ірацыянальнага ладу жыцця ўплывала на нас не з меншай сілай, чым на іншыя еўрапейскія супольнасці, і роля Рэлігіі ў нас была адпаведнай, і нават Царкву, лічы, амаль адзяржавілі.

Але збольшага натуральны, як для еўрапейскага народа, працэс быў спынены ў апакаліптычных войнах семнаццатага і наступных стагоддзяў, калі папярэдні беларусам этнас быў вынішчаны амаль да каранёў. Натуральна, гэтаксама лёс абышоўся і з нашай Дзяржавай, і з нашай Царквой. Таму беларуская нацыя паўстала на тле не ўласнай, а ўніверсальнай крызы рэлігійнага. Апошняе фармальна ніяк не адбілася ні ў спосабе, ні ў канструкце легалізацыі нацыянальнага. Аднак, па сутнасці, страта была непапраўнай, бо, як сведчыць досвед іншых народаў, Нацыя толькі тады досыць хутка набывае паўнавартасны і самадастатковы чын, калі фармалізуецца праз нацыяналізацыю Дзяржавы і Царквы (ці хаця б аднаго з гэтых інстытутаў). У супрацьлеглым выпадку гісторыя рыхтуе Нацыі вельмі пакручасты і цалкам няпэўны шлях. Беларусы добра гэта ведаюць.

Іншая рэч, што мы трагічна памыляемся, калі ўскладваем спадзяванні на Веру і Царкву ў справе пабудовы Нацыі і нацыянальнай дзяржавы. Як ні дзіўна, але і найразумнейшыя з беларусаў не жадаюць заўважаць канцавога антаганізму паміж Рэлігіяй і Нацыяй, іх смяротнага двубою, дзе адно перамагае толькі коштам другога*. З дзіцячай непасрэднасцю нашыя рамантыкі амбівалентна спрабуюць злагодзіць у сваім сэрцы самую шчырую любоў да Бога і самую апантаную любоў да Нацыі (для мяне няма больш трагічнага відовішча, чым укленчаны беларус, які моліць Бога, каб той зберог ягоную нацыю). А між іншым, яшчэ за дзве тысячы гадоў да з’яўлення Нацыі, Бог (зноў здзівімся Ягонай відушчы) сурова папярэдзіў будучых вернікаў, якія памкнуцца ўзяць на душу грэх нацыяналізму: “Няма ні эліна, ні іудзея”.

## 3. УЛАСНА НАЦЫЯНАЛЬНАЕ

“З усіх светапоглядаў і веравызнанняў, якія змагаюцца за душы людзей у сучасным свеце, найбольш пашыранай і трывалай ёсць нацыянальная ідэя. Іншыя ідэі дасягнулі больш значнага, але часовага поспеху ці знайшлі сабе апірышча ў адной пэўнай краіне. Некаторыя светапоглядныя сістэмы ўздымалі людзей на больш герaічныя ці нават жахлівыя дзеянні. Але нішто не змагло так паспяхова ўсталявацца ў кожнай частцы свету, прывабіць столькі людзей featureізнага жыццёвага досведу ў розных краінах, як нацыяналізм. Ні адна іншая ідэя не праяўлялася ў такіх разнастайных абліччах і не перажывала часовы заняпад толькі дзеля таго, каб пасля стаць яшчэ больш моцнай і трывалай. Ні адзін іншы светапогляд не пакінуў такога моцнага адбітку на мапе свету і на нашым пачуцці саматоеснасці. Перш за ўсё нас атаясамліваюць з нашай “нацыяй”.

Гэтымі словамі распачынае сваю кнігу “Нацыяналізм у дваццатым стагоддзі” Энтані Сміт, сёння адзін з самых вядомых даследчыкаў абранай намі праблемы. (Дарэчы, у 1995 годзе згаданая кніга Энтані Сміта была выдадзеная на беларускай мове ў серыі “Адкрытае грамадства”.)

Феномен *нацыянальнай ідэі* сапраўды ўражвае сваёй універсальнасцю, але не ўніверсальнасцю канону, як, скажам, хрысціянства ці будызм, а прыдатнасцю, дапасаванасцю, стасоўнасцю да самых розных соцыя-культурных і геапалітычных канфігурацыяў, у якіх яна фармалізуецца. З гэтага і зместам, і формай нацыянальная ідэя ў розных краінах часам нават рашуча адрозніваецца, і, бадай, толькі “вялікая салідарнасць” (Эрнэст Рэнан)* прыпадабняе ўсе нацыяналізмы адзін да аднаго.

Панятак “нацыя” (ад лацінскага natio — племя, народ) мае доўгую і пакручастую гісторыю, за часы якой, здаралася, ягоная

семантыка мала чым нагадвала тую, што вядомая сёння. Але мы не пойдзем разблытваць гэтыя шляхі, бо нас цікавіць не тэрмін, а сама з’ява, якая пачала канкрэтна “матэрыялізоўвацца” (тут меркаванні шматлікіх даследчыкаў збольшага сыходзяцца) у пару нараджэння сярэдняга класу, буржуазіі, капіталізацыі грамадства і урбанізацыі соцыума.

Натуральна, легітымнага і адназначнага пункту адліку (што ў часе, што ў прасторы) для гэтай праблемы ніхто ніколі не знойдзе. І таму ў залежнасці ад абранай пазіцыі і метадалогіі даследчыкі шукаюць першапачаткі нацыянальнай ідэі ў самых розных падзеях. Скажам, у сваю пару была досыць пашыранай канцэпцыя, згодна якой перадумова гэтай ідэі найраней выявілася ў сярэднявечным руху за тысячагоддзе Валадарства Божага на зямлі — больш чым спрэчная канцэпцыя, пра што кажа і Энтані Сміт.

Асабіста мне (сярод усіх іншых) найлепей пасуе простая і выразная маркіроўка гэтага пачатку, зробленая тым жа Энтані Смітам: “Першае яснае фармуляванне гэтай (нацыянальнай — **В.А.**) ідэі адбываецца ў пару Французскай рэвалюцыі. У тэкстах таго часу мы можам прачытаць, што адно нацыя ёсць сапраўдным суверэнам, што чалавек павінен быць адданы перадусім нацыі, і што толькі нацыя можа ўсталёўваць свае законы для сваіх грамадзян. Тут таксама ўпершыню можна пачуць заклікі да зброі ў абарону Бацькаўшчыны (patrie) і думку пра тое, што “грамадзянін” Францыі мае пэўныя правы і абавязкі. Хоць

---

* “Застаецца па-за сумневам, што самасцвярджэнне нацыі з гледзішча хрысціянскай рэлігійнасці ёсць грахом. Праблема нацыянальнасці можа быць здзейсненай у нацыяналістычным кірунку толькі ў варунках адмовы ад тых ісцінаў, што сцвярджае хрысціянства. Да хрысціянства значна бліжэйшыя тыя прыхільнікі інтэрнацыяналізму, якія цалкам ігнаруюць нацыяналізм, чым тыя нацыяналісты, што выдаюць сябе за хрысціянаў” (Аляксандр Меер).

Французская рэвалюцыя была не першай праявай новай "нацыянальнай" эпохі, яна была першай гістарычнай падзеяй, падчас якой добраахвотна аб'яднаныя грамадзяне дзейнічалі на карысць "нацыі", а не дынастыі. І ўпершыню грамадзяне намагаліся пашырыць адзіную культуру і адзіную мову на ўсе рэгіёны сваёй краіны, зламаць усе бар'еры паміж гэтымі рэгіёнамі, стаць адзінай нацыяй, адданай адной ідэі".

Тыпалагічныя праблемы Нацыі яшчэ больш заблытаныя за храналагічныя. Не будзем сягаць на іншыя кантыненты, але нават у Еўропе, радзіме гэтага феномену, розныя даследчыкі базавымі прапануюць самыя розныя мадэлі, на падставе якіх усе іншыя кадыфікуюцца ў залежнасці ад меры іхняй мадыфікацыі.

Як і ў выпадку з храналагічнай праблемай, для сябе мы абярэм самы просты і выразны канцэпт, які падвойваецца на гэтак званыя французскую і нямецкую мадэлі.

"Французская" канцэпцыя нацыі робіць акцэнт на *грамадзянскай супольнасці*, а "нямецкая" — на *моўна-этнічнай* (калі заўгодна — расавай). Відавочна, што зводзіць іх у нешта адно, хай сабе і праз апазіцыю, можна толькі ў ракурсе метадалогіі, бо іх сутнасныя ядры, як і вектары праекцыі на рэальнасць не проста супрацьлеглыя, а рознавымерныя.

У рамках пастаўленай задачы далей нам трэба згадаць пра праблему сістэматызацыі тых сацыяльна-гістарычных падвалінаў, на якіх паўставалі нацыі. Відавочна, што "стартавыя магчымасці" ў розных нацыяў былі розныя, ды і распачыналі яны свой шлях далёка не ў адначассе, а значыць, нават і цывілізацыйна зусім у непадобных умовах. Да таго ж даводзіцца ўлічваць, што для многіх нацыяў рух на дыстанцыі ад "старту" да "фінішу" не аднойчы і, здаралася, надоўга перапыняўся. У гэтым сэнсе прыклад Беларусі ёсць хутчэй адной з нормаў, а не выключэннем.

У сваім памкненні да сістэматызацыі "падвалінаў" перадусім

вылучым нацыі, якія паўсталі ва ўлонні на той час існуючых дзяржаўных утварэнняў і змаглі іх досыць хутка нацыяналізаваць, гэта значыць, уціснуць Дзяржаву ў Нацыю, хай і не без пэўных стратаў, часам і вялізных, як у выпадку з Брытанскай імперыяй (і не мае значэння, што канчатковы распад імперыі адбыўся толькі ў сярэдзіне ХХ стагоддзя). Апрача Англіі ў гэты хаўрус першымі просяцца Францыя ды Іспанія.

Наступную групу мы сфармуем з краінаў, якія праз нацыянальнае задзіночанне змаглі аднавіць раней страчаную дзяржаўнасць. Сярод самых выразных прыкладаў згадаем Германію, Італію і Польшчу. Магчыма, да гэтай групы трэба далучыць краіны, якія былі заснавальнікамі вялікіх імперый (Турцыя — Асманскай, Аўстрыя і Венгрыя — Аўстра-Венгерскай), а пасля іх развалу, з парэшткаў імперскай велічы, стварылі нацыянальныя дзяржавы.

Але, магчыма, іх нароўні з астатнімі больш карэктна будзе занесці ў трэцюю групу, а менавіта да ўсіх тых нацыяў, што паўсталі ў выніку распаду гэтых (ды іншых) імперыяў. Бо і па часе, і па спосабе паўставання Турцыя мала чым адрозніваецца ад, да прыкладу, Балгарыі, а Чэхія ад Аўстрыі (і г.д.).

Праўда, пры такім падыходзе задача сістэматыка ўскладняецца тым, што бадай кожная нацыя, якая ўладкавалася хоць на якім фрагменце былой (хоць якой) імперыі, імкнецца знайсці (і знаходзіць) у сваім мінулым свой дзяржаўны аналаг (Украіна — Кіеўскую Русь, Беларусь — Полацкае княства і ВКЛ, Туркменія — Сельджукскую імперыю, і г.д., і да т.п.).

Але, падобна, разблытваць (ці заблытваць?) што тут да чаго — задача не культуралогіі, а міфатворчасці. Мы ж са свайго боку проста падкрэслім, што існуюць тры базавыя пазіцыі, якія складаюць аснову прапанаванай сістэмы паўставання нацыяў:

1. Нацыі, якія нацыяналізавалі існыя дзяржавы;

2. Нацыі, якія адрадзілі былыя дзяржавы;

3. Нацыі, якія самі з сябе стварылі нацыянальныя дзяржавы**.

Натуральна, прапанаваная схема не адмаўляе і розных камбінацый з гэтых пазіцый.

## 4. РЭФЛЕКСІЯ З НАГОДЫ

Пад нацыяналізмам найчасцей разумеюць не ўніверсальную экзістэнтную ідэю, а ўсяго толькі суплёт нацыянал-патрыятычных эмоцыяў. Як быццам — дарэмна, але ўнікнем супрацьпастаўлення. У нацыяналізму і нацыянал-патрыятычных эмоцыяў агульны корань, а розніць іх між сабой, разводзіць у адваротныя станы — асоба. Толькі ёю і вызначаюцца ўсе вартасці і заганы нацыяналізму. Каб праілюстраваць гэтую банальную выснову, згадаю побач з расейскім мысляром Васілём Розанавым (ці не найбольш жорсткім, але і ці не найбольш адказным аналітыкам габрэйства) — маскоўскага рамізніка, які гатовы быў уласнай рукой выдзерці пейсы ўсім жыдам, колькі іх ёсць на белым свеце...

Па вялікім рахунку, нацыяналізм для секулярызаванага “я” — гэта парэнча над безданню абыякавага да чалавека быцця. Таму можна ненавідзець нацыяналізм усёй нянавісцю сэрца за тое, што ён трымае цябе пры сабе, але паспрабуй адштурхнуць парэнчу — і адразу ляціш у нікуды.

Праўда, пры жаданні можна рабіць выгляд, быццам ты адважна крочыш над прадоннем, ні на што не абапіраючыся, аднак гэта ўсяго толькі фіглярства. Сапраўды мужныя (Купала ці Уітмен, Дастаеўскі ці Гайдэгер) не фіглярнічалі. Яны ведалі, што іх трымае, і не памыляліся ў глыбіні прадоння.

# 5. ПРАБЛЕМА ЎЛАСНЫХ МЕЖАЎ

І па форме, і па сутнасці паўсталая ў другой палове XIX стагоддзя *беларуская нацыянальная ідэя* не мае ў сабе нічога беларускага ў тым сэнсе, што яна была аформленая пад стандарт “моўна-этнаграфічнай” мадэлі (гэтак званай нямецкай, сфармуляванай Іаганам Гердэрам), — бадай, самай пашыранай на нашым кантыненце. Таму ў канцэптуальным плане перад беларусамі стаялі тыя ж самыя задачы, што і перад іншымі еўрапейскімі народамі...

Нацыянальнае ўладкаванне свету нарадзіла некалькі праблемаў, якіх не ведаў папярэдні, “дынастычны” тып гуртавання супольнасцяў.

Па-першае, гэта выбар самой нацыянальнай мадэлі і затым мера яе мадыфікацыі, бо як мадэль “грамадзянскай супольнасці”, так і “моўна-этнаграфічная” мадэль патрабавалі дапаўнення адна адной і да таго ж яшчэ і ўлучэння ў сябе шэрагу не-сістэмных, у кожным разе апрычоных, элементаў.

А па-другое,— пошук *сваіх межаў*.

“Дынастычны” тып дзяржавы ніводнай з гэтых праблемаў не ведаў. Першая (выбар мадэлі) у ім адсутнічала па азначэнні. А другая вырашалася праз каланізацыю ці збройны чын. Груба кажучы, колькі дзяржава магла паняволіць прастораў і народаў, столькі яна іх і мела (ідэалагічная матывацыя гэтых захопаў/падзелаў/прылучэнняў выкарыстоўвалася адно ў якасці фармальнага дадатку ”волі да ўлады”)*.

Ідэя Нацыі запатрабавала радыкальна іншага падыходу да прасторавага ўладкавання. Яшчэ ў 1792 годзе Жорж Жак Дантон звярнуўся да Францыі з заклікамзнайсці свае “натуральныя межы”. Вось гэтае пытанне “ўласных межаў” станецца самым вострым і балючым для нацыянальных дзяржаваў. Дарэчы, яно так ніколі і не будзе станоўча вырашаным, незалежна ад фармату

нацыянальнай ідэі. Бо ў тым выпадку, калі базавай абіралася "грамадзянская супольнасць", рэпрэсаваліся моўна-этнічныя чыннікі, асабліва на краях дзяржаўнага дыскурсу. А калі за аснову браўся "моўна-этнічны" прынцып, дык ён не мог адэкватна рэалізавацца з таго, што амаль заўсёды нейкія фрагменты "тытульных" этнасаў (і часам досыць ладныя) заставаліся за межамі краіны, і ніхто іх аддаваць камусьці, дзеля тарнавання да асноўнага масіву, не збіраўся. (Згадаем хаця б Славакію, дзе венгры складаюць 10% ад агульнага насельніцтва краіны, ці этнічна беларускую Беласточчыну ў Польшчы). Сюды далучым і эсхаталагічныя праблемы малалікіх нацыянальных утварэнняў у дыскурсе дамінуючых.

Але перадусім гэтыя калізіі апынуліся невырашальнымі таму, што хаця ў справе гуртавання супольнасцяў Дзяржава і саступіла вяршнасць Нацыі, аднак пазіцыі Дзяржавы заставаліся досыць моцнымі, каб у канфлікце супрацьстаяння з Нацыяй не толькі трымаць парытэт, але і раз-пораз перамагаць, гэта значыць, раскатваць Нацыю ў памер канфігурацыі ўласных межаў. (Хельсінская хартыя аб непарушнасці існуючых дзяржаўных межаў, падпісаная кіраўнікамі ўсіх еўрапейскіх краінаў, у пэўным сэнсе засведчыла контррэфармацыйную перамогу ідэі Дзяржавы над ідэяй Нацыі).

Аднак як бы там сітуацыя ні складвалася ў кожным канк-

---

* Да месца нагадаем яшчэ адну вельмі цікавую характарыстыку нацыі, сфармуляваную Эрнэстам Рэнанам: "Сутнасць нацыі не толькі ў тым, што ўсе індывіды маюць паміж сабой шмат агульнага, але і ў тым, што яны супольна забылі. Ні адзін француз пэўна не ведае, ці быў ён бургундцам, аланам альбо вестготам, але кожны француз мусіць забыць разню ў Варфаламееўскую ноч…"

** Метадалагічна прапанаваны падыход часткова супадае з тым, які мы сустракаем у Эрнэста Гельнера ("Нацыі і нацыяналізм").

рэтным выпадку, з пачаткам паўставання нацыянальнага логасу, актуалізоўвалася і праблема нацыянальнага топасу. Беларусь тут не выключэнне. У знакамітай прадмове Францішка Багушэвіча да зборніку вершаў “Дудка беларуская” ўвага даследчыкаў звычайна акцэнтуецца на “мове” (“Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!”), хаця не менш, а можа, і больш істотны фрагмент гэтай прадмовы звернуты да вызначэння абрысу “ўласных межаў”. “Ужо больш як пяцьсот гадоў таму, да панавання князя Вітэнэса на Літве, Беларусія разам з Літвой баранілася ад крыжацкай напасці, і шмат местаў, як Полацк, прызнавалі над сабой панаванне князёў Літоўскіх, а пасля Вітэнэса Літоўскі князь Гедымін злучыў зусім Беларусію з Літвой у адно сільнае каралеўства і адваяваў шмат зямлі ад крыжакоў і ад другіх суседаў. Літва пяцьсот дваццаць гадоў таму назад ужо была ад Балтыцкага мора ўдоўжкі аж да Чорнага, ад Дняпра і Днястра ракі да Нёмна; ад Каменьца места аж да Вязьмы — у сярэдзіне Вялікаросіі; ад Дынабурга і за Крамяньчук, а ў сярэдзіне Літвы, як тое зярно ў гарэху, была наша зямліца — Беларусь!”

Абрыс “уласных межаў”, прапанаваны Францішкам Багушэвічам, досыць абстрактны, гэта хутчэй яшчэ толькі пастаноўка праблемы і першая спроба яе прамацвання. А канчаткова метадалогія маркіроўкі нацыянальнага дыскурсу была сфармуляваная Вацлавам Ластоўскім на гістарычным пасяджэнні Рады БНР 25 сакавіка 1918 году: “Няхай жыве незалежная Беларусь у сваіх этнаграфічных межах!”. (За колькі дзён да гэтай гістарычнай падзеі Выканаўчы Камітэт Рады 1-га ўсебеларускага з’езду выдаў Другую ўстаўную грамату, якая абвяшчала Беларусь “у рубяжох рассялення і лічбавай перавагі беларускага народу”).

Нягледзячы на публіцыстычны пафас выказвання Ластоўс-

кага, гэты заклік не быў усяго толькі рытарычнай фігурай. Рэч у тым, што на тую пару шматлікімі доследамі, найперш расейскіх навукоўцаў, этналінгвістычны арэал беларусаў быў акрэслены досыць выразна і пераканаўча. Калі параўнаць этнаграфічныя мапы Беларусі, складзеныя на пачатку XX стагоддзя Яўхімам Карскім, Мітрафанам Доўнар-Запольскім і Яўсеем Канчарам, дык пры ўсіх несупадзеннях (часам і досыць значных) скраеня абрысу, яны адназначна перагукаюцца паміж сабой адносна выявы Беларусі, як цэлага.

Для той пары, калі палітычныя рухі, захопленыя нацыянальнай ідэяй, спрабавалі пабудаваць нацыянальную дзяржаву амаль з "чыстага аркушу", тэарэтычная формула "Беларусь у сваіх этнаграфічных межах" бачыцца ўдалай, асабліва што да публічнай прэзентацыі ідэі. Але яна адразу выявілася залішне ідэалістычнай як адносна рэальнай палітычнай сітуацыі, так і для ўласнага станаўлення ва ўжо зусім іншых умовах канца XX стагоддзя.

## 6. МЕЖЫ АЙЧЫНЫ І МОВЫ

Гісторыя Беларусі — гэта суплёт разрываў паміж яе рознымі гісторыямі. Здаецца, наспела пара, каб нехта ўдумлівы паспрабаваў наўсцяж абнаявіць "хроніку" гэтых разрываў, бо яны, што відавочна, у лёсе нашага краю адыгрывалі куды больш істотную ролю за тыя фрагменты ўласна гісторыі, якімі мы спрабуем азначыць свой паслядоўны шлях праз вякі і стагоддзі.

На самой справе ніякага паслядоўнага поступу не было. Спрэс былі адно разрывы. І пасля кожнага радыкальнага разрыву пачыналася штосьці цалкам адметнае, раўнуючы з тым, што мелася раней. Вялікае Княства Літоўскае — гэта нешта

зусім іншае ад Полацкага княства, а Рэч Паспалітая — ад ВКЛ. "Паўночна-Заходні край" не меў амаль нічога агульнага ні з першым, ні з другім, ні з трэцім. А БССР, здаецца, увогуле была пазбаўленая хоць якіх аналагаў з усім папярэднім... Бадай, толькі Рэспубліка Беларусь, прынамсі, хаця б на юрыдычна-адміністрацыйным узроўні, наўпрост наследуе сваю папярэдніцу — БССР. (І гэта вельмі добры знак!).

Кожны раз, суб'ектна ўзнікаючы наноў, мы паўставалі не проста ў іншай геапалітычнай рэальнасці — мы паўставалі ў іншай *цывілізацыйнай* рэальнасці. Чамусьці тэарэтыкі праблемы нацыянальнага на гэты фактар найменей звяртаюць увагі. Хаця кожнаму зразумела, што ідэалы грамадства, якое жыве, скажам, патрыярхальным ладам, зусім не падобныя да тых, што мы маем у тэхнагеннай цывілізацыі. З гэтага шмат чаго вынікае, але як да нашай гаворкі, дык перадусім заўважым: чалавеку ранейшых эпохаў мысліць у катэгорыях нацыянальнага было гэтаксама немагчыма, як старажытнаму вершніку ў катэгорыях сучаснага дарожнага руху.

Улегшыся ў адбудову гістарычнай рэтраспектывы, мы, у сваёй нацыянальнай апантанасці, вельмі часта неабачліва нагружаем нашых далёкіх продкаў уласнай, толькі нам актуальнай праблематыкай. У гэтым сэнсе ці не найбольшай ахвярай стаўся перыяд фармавання беларускага этнасу, які, па агульным меркаванні, прыпадае на пару ВКЛ. Паколькі доўгі час лічылася, што паўставанне нацыі немагчымае без сфармаванага этнасу, дык *ідэалагемна* этнас і нацыя амаль не разрозніваліся і прачытваліся ўсяго толькі як розныя перыяды агульнай падзеі. Аднак насамрэч і па форме, і па сутнасці гэта зусім розныя феномены.

"У тыя часы магнаты і шляхта Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага не мыслілі ў *нацыяналістычных*

*катэгорыях* (курсіў мой — **В.А.**), характэрных для эпохі пасля Французскае рэвалюцыі; яны хутчэй мелі свае ўласныя патрыятычныя каштоўнасці і пачуццё асобнасці, якога не хацелі пазбыцца ў новаўтворанай федэрацыі (маецца на ўвазе Рэч Паспалітая пасля Люблінскай уніі 1569 году — **В.А.**),— слушна заўважае Янка Запруднік у кнізе “Беларусь на гістарычных скрыжаваннях”.

Бясконца цытуючы Францішка Скарыну (“чалавек дзе нарадзіўся... да таго месца вялікую ласку мае”, “мяне літасцівы Бог з гэтае мовы на свет пусціў”), Васіля Цяпінскага (“з любоўю да маёй Айчыны”, “занядбанне сваёй слаўнай рускай мовы”) ці Льва Сапегу (“законы нашыя выдадзеныя не на нейкай чужыннай мове, а на сваёй роднай”), мы зазвычай пакідаем абапал *межы* як тады дэклараванай “Айчыны”, так і “роднай мовы”.

А каб не праміналі ўвагай гэтае пытанне (ці то спехам, ці то наўмысна), дык адразу б зацемілі, што для Васіля Цяпінскага “Айчына” — гэта абстрактная “Слаўная славянская манархія”, для Францішка Скарыны — усяго толькі ягоны “родны кут” Полацк, а для Льва Сапегі зусім наадварот — хай сабе і не заканстытуяваная, але вялізная імперыя ад Балтыйскага да Чорнага мора, у аблогах якой табарыўся гурт народаў, сярод якіх яшчэ не было і знаку таго, які потым з узгляду на свой этнонім, назаве і тую краіну, і тую мову беларускімі.

Падкрэслім, пытанне не ў тым, што “беларусы” тады сістэмна не згадваліся ні ў якасці этноніму, ні, на худы канец, палітоніму (хаця для этна- і нацыяўтваральных працэсаў гэта надзвычай істотны момант), а ў тым, што для пары ВКЛ і “Айчына”, і “мова” — гэта пакуль усяго толькі тапаграфічны патрыятызм і лінгвістычная прагматыка (узмоцненыя красамоўнай рыторыкай і паэтычнымі тропамі).

Любоў да места, дзе ты “ўскормлены суть по Бозе” (Скарына) — абсалютна натуральнае пачуццё для кожнага чалавека ў

якіх заўгодна геаграфічных каардынатах і ў якую заўгодна эпоху. Але калі пэўны “местачковы” ці “дзяржаўны” патрыятызм мы праз стагоддзі таясамім з нашай любоўю да “ўяўнай супольнасці”, дык паводзім сябе, далікатна кажучы, не зусім карэктна. Бо хаця з фармальна-выяўленчага боку “любоў да маёй Айчыны” Васіля Цяпінскага і “О, Літва, Айчына мая!” Адама Міцкевіча нічым асабліва не розняцца, але, па сутнасці, гэта дзве канцэптуальна іншыя любові, амаль ні ў чым не сумерныя адна адной.

Да з’яўлення Нацыі калектыўна-салідарнай любові грамадства падлягала толькі адна ўніверсалія — Бог. Што да “Айчыны”, дык яе, у нашым разуменні, не ведалі не толькі паспалітыя, але і самыя “прасунутыя” героі тых эпохаў. Той жа Скарына за межамі ВКЛ у адных дакументах называе сябе “ліцвінам”, у другіх — “русінам”, а ў трэціх — “палачанінам”. Этнанімічная дыферынцыяцыя насельніцтва Вялікага Княства Літоўскага была неверагодна размаітай і разбэрсанай. У тагачасных дакументах на роўных пералічваюцца так званыя экзаэтнонімы (літва, татарва, ляхі, немцы, жамойты, угры, латыгове, ліфлянты, славакі, чэхі) з зямляцкімі этніконамі (палачане, віцябляне, смаляне, случане,籍 дручане, валыняне, бранцы, кіяне). У гэтым шэрагу на парытэтных умовах былі і поліэтнонімы, і тое, што можна, з пэўнай доляй умоўнасці, ужо залічыць у этнонімы: “...а послу из нашее земли

*Як, скажам, у выпадку паслання вялікага князя Вітаўта імператару Свяшчэннай Рымскай імперыі, напісанага 11 сакавіка 1420 году, калі Вітаўту спатрэбілася легітымізаваць валоданне Жамойціяй: “Вы выказаліся і прынялі пастанову наконт зямлі Жамойтаў, якая ёсць нашай спадчынай і ўласнасцю як законная спадчына ад прадзедаў і дзядоў нашых, якою валодаем і цяпер, ды якая ёсць і заўсёды была адзінай з зямлёй Літвы, бо ж адна тая самая гаворка і тыя самыя людзі” (Паўла Урбан, “Старажытныя ліцьвіны”). Падобныя ідэалагічныя” аргументы” скарыстоўвала і Кацярына II, далучаючы ўжо беларускія землі Вітаўта да Расеі пры падзеле Рэчы Паспалітай, хаця ў той самы час захоп польскіх земляў абышоўся без хоць якой уцямнай аргументацыі.

из Литовскоъ, и гостю — или Ляхъ, или Литвинъ, или Русинъ, или Полочанинъ, или Витеблянинъ, или Смолянинъ...” (“Этнаграфія Беларусі”). Ці яшчэ адтуль жа прыклад: “...родом он литвин латыш белорусец Оршанского повету”.

Як бы мы сказалі сёння, у тую пару ў кожнага чалавека была свая “малая радзіма”, а вось “Вялікай Радзімы” на зямлі ніхто не меў, бо для ўсіх агулам яна знаходзілася “на нябёсах”. І гэта нам уявіць бывае настолькі цяжка, што нават такі ўдумлівы даследчык як Янка Запруднік, зусім слушна заўважыўшы, што магнаты і шляхта ВКЛ “не мыслілі ў нацыяналістычных катэгорыях”, праз некалькі старонак піша: на Беларусі XVI стагоддзя “...і вясковыя жыхары, і значная большасць месцічаў заставаліся праваслаўнымі. Прычына гэтага супраціву рэфармацыйным плыням ляжала ў спольшчанасці большай часткі магнатаў, так што адданасць веры продкаў была для большасці беларусаў справаю *нацыянальнага выжывання* (курсіў мой — **В.А.**).

Тут так і хочацца выгукнуць: якое “*нацыянальнае* выжыванне” ў тую пару?! Скуль яно, *“нацыянальнае”*, тым болей у жыхароў вёсак, якія і праз тры стагоддзі, калі ідэалогія нацыяналізму ахопіць і перафармуе ўсю Еўропу, будуць у Беларусі ўнікаць гэтага *“нацыянальнага”* як нячысцік ладану.

У метадалагічным плане праблема “межаў мовы” не шмат чым розніцца ад праблемы “межаў Айчыны”. Словы “Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!” Францішка Багушэвіча (XIX стагоддзе) і “мяне літасцівы Бог з гэтай мовы на свет пусціў” Францішка Скарыны (XVI стагоддзе) пры фармальным падабенстве абапіраюцца на два рознавымерныя ідэалагемныя канцэпты, і таму ў першым выпадку гэта сапраўды фатальная дылема, бо ў межах “моўна-этнаграфічнай” мадэлі нацыянальнага смерць і жыццё Нацыі наўпрост залежаць ад стану мовы. А вось

любоў Францішка Скарыны, Сымона Буднага, Васіля Цяпінскага... да старабеларускай (рускай, славянскай, русінскай, ліцвінскай — як па-рознаму называлі яе тады) мовы, хаця і не пазбаўленая патрыятычных эмоцыяў, не мае (і не можа мець) эсхаталагічнага пафасу, бо яна заснаваная не на ідэаматыцы, а на прагматыцы бытавання.

Як вядома, старабеларуская (руская) мова “выкарыстоўвалася ў княжай канцэлярыі з самага яе заснавання ў XIV стагоддзі, беларускую мову трэба лічыць адной з найдаўнейшых дзяржаўных нацыянальных моваў у Еўропе. Напрыклад, кастыльскую мову было загадана ўжываць у гішпанскіх урадавых дакументах у XIII стагоддзі, англійская набыла афіцыйнае прызнанне ў 1362 годзе, а парыжскі дыялект французскай дамогся такога статусу ў 1400 годзе” (Янка Запруднік). Тое, што мова княскай канцылярыі была яшчэ і моваі нейкай (хай сабе і вялікай) часткі паспалітага насельніцтва ВКЛ было на тую пару зусім не істотна ні для каго (ну хіба для некалькіх найбольш празарлівых “асветнікаў”). Істотным выяўлялася адно тое, што гэта была мова ўлады (ад палітычнай і рэлігійнай да фінансавай і культурнай). Таму на ёй, незалежна ад этнічнай ці племяннай прыналежнасці, размаўлялі, пісалі (ці хаця б збольшага яе ведалі) усе, хто быў пры ўладзе альбо імкнуўся заняць пэўнае месца ў яе структурах. Але як толькі мовай Улады стала рабіцца польская, дык старабеларуская адразу і заняпала, бо яна была каштоўнай не сама па сабе (не як тое, што ідэнтыфікуе і суб’ектывізуе пэўную супольнасць),— яна была каштоўнай толькі як камунікатыўны сродак зносінаў паміж рознымі ўладамі і ўнутры кожнай з іх. І выцясненне беларускай мовы польскай не казала ні пра што іншае, апрача як пра змену ўладных элітаў. Апошнім і былі выкліканыя ноткі трагізму ў часткі палітычных, рэлігійных і культурных дзеячаў ВКЛ, якія ў сітуацыі змены палітычных прыярытэтаў апыналіся ў ролі аўтсайдэраў (найперш тыя, што

не змаглі — ці не схацелі — мадэрнізавацца, гэта значыць у патрэбны час “скаталічыцца” ды “спольшчыцца”, каб патрапіць, хай сабе і не на першых ролях, ва ўладныя эліты Кароны). Адсюль і палымяныя заклікі да магнатаў не пакідаць “здавна славного языка словенского” (Будны), супрацьстаяць “занядбанню сваёй слаўнай рускай мовы” (Цяпінскі) і да т.п. Пэўна, далёка не ўсе гэтыя красамоўствы былі абумоўленыя толькі *персанальным эгаізмам,* хапала тут і футурыстычнай трывогі за заняпад усяго таго сусвету, у якім і шляхта, і паспалітыя жылі сваім звычаем ужо некалькі стагоддзяў. Але як у адным, так і ў другім выпадку не трэба блытаць іхні непакой з сучаснай нам трывогай за”Айчыну”, “мову”, “народ”. Будзем памятаць, што соцыякультурна тады ўся еўрапейская шляхта складала адметную і досыць цэласную супольнасць, якая толькі ўладна і маёмасна тоесніла сябе з пэўнай прасторай, а са сваімі паспалітымі падданымі дык і ўвогуле жыла ў розных сусветах — хаця і на адной зямлі (па сутнасці, уся тагачасная еўрапейская арыстакратыя ўяўляла з сябе асобную і досыць гамагенную цывілізацыю — Норберт Эліас назваў яе “куртуазнай”).

Іншае пытанне, наколькі мова княскай канцэлярыі, усіх дзяржаўных і рэлігійна-культурных інстытуцыяў супадала з мовай сялянаў, рамеснікаў, гандляроў? Тут магчымыя розныя прачытанні сітуацыі, але мы абмінем гэтую праблему, бо істотная для нас выснова ўжо зробленая: з таго, што старабеларуская пісьмовая мова была мовай Улады і толькі ўладай трымалася, дык яна натуральна знікла адначасна са змарненнем апошняй (дакладней, з канцэптуальнай пераменай ейнага фармату)...

І знікла амаль адразу, уся, цалкам, татальна. І ніколі ўжо не адрадзілася. І не магла адрадзіцца, нават калі б Напалеон выканаў свае абяцанкі і аднавіў ВКЛ, бо цывілізацыйна гэта была ўжо іншая пара, якая патрабавала ўжо іншай мовы (і структурна, і лексічна).

Лінгвістычна мы можам колькі заўгодна шукаць і знаходзіць лакальныя падабенствы паміж старабеларускай і ўжо ўласна беларускай мовамі. Але хто б колькі не даводзіў пра іхнюю пераемнасць — у прасторы тэксту ніякай пераемнасці паміж імі няма. І нават не таму, што паміж ВКЛ і"нацыянальнай дзяржавай" татальны (без хоць якой лучвы) разрыў у паўтара стагоддзі, а таму, што старабеларуская мова (прынамсі, пісьмова) фармавалася як *камунікатыўны ды ўладны інструмент Дзяржавы*, а пісьмова ўжо ўласна беларуская мова паўставала як *сутнастваральны чыннік* Нацыі. Праўда, гістарычная наяўнасць старабеларускай мовы ў паўставанні ўласна беларускай адыграла вельмі істотную **ідэалагічную** ролю. Абапіраючыся на славутае прамінулае, было значна прасцей і абгрунтоўваць, і даводзіць патрэбу ва ўласнай мове. Але гэтым уся "пераемнасць" і завяршвалася. Ні структурна, ні лексічна, ні культуралагічна старабеларуская мова не падтрымала беларускую ў пару яе фармавання. Асноўную ролю тут адыгралі лінгвістычныя канструкты суседзяў, якія, як лякалы, былі пакладзеныя на вербальны дыскурс нашай вясковай цывілізацыі, і па форме якіх выціналіся схемы будучага функцыянавання літаратурнай беларускай мовы.

## 7. РАСЕЙСКАЯ ІМПЕРЫЯ — КАЛЫСКА БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫІ

Упартае трыманне за ідэю "пераемнасці" (што да праблемаў мовы, што да праблемаў нацыянальнага будаўніцтва ўвогуле) завязанае на ўсё яшчэ дамінуючую эвалюцыйную канцэпцыю лінейна-паслядоўнай хады гісторыі, дзе кожнае паўставанне нацыі тлумачылася праз папярэдні яму працэс этнагенезу.

Але, па-першае, для фармавання нацыянальнай ідэі зусім

не абавязковая *этнічна* скансалідаваная супольнасць. Прыкладаў тут колькі заўгодна — тая ж амерыканская нацыя. А па-другое (працытую трохі ўласных радкоў з эсэ “Горад, якога няма”), “...магчыма, пару нашага існавання было б слушна падзяліць на дзве эры, і другую, якая пачалася пасля татальнага мораку XVII—XVIII стст., чытаць не толькі як новую гісторыю адной і той самай нагоды, але і як гісторыю новага этнасу, бо, пэўна, *беларусы* — гэта ўжо нешта іншае ад крэваў, русінаў, ліцвінаў... узятых, як кожны паасобку, так і агулам. А *Беларусь* нешта зусім адрознае ад усяго, што было раней на гэтых абшарах”.

Як да *нацыянальнага* выспявання (і выспявання *нацыянальнай* мовы), дык асабіста мне падаецца куды больш істотным не перыяд ВКЛ з яго “залатым” шаснаццатым стагоддзем, а вось гэтая пара “татальнага мораку” XVIII—XIX стагоддзяў. Больш за тое, я схільны лічыць (хай сабе пакуль толькі ў фармаце версіі), што не ў часы ВКЛ, а менавіта ў гэтую “нічыйную” пару і сфармаваліся беларусы, як этнас — маючы на ўвазе ўжо ўласна *беларускі этнас*.

Не адмаўляючы традыцыйнай этналагічнай канцэпцыі, якая актуалізуе працэсы этнагенезу з XIII—XIV стагоддзяў, гэта значыць з пары фармавання ВКЛ, я адважуся памеркаваць, што гэтыя працэсы былі скіраваныя не зусім у той бок, дзе потым аб’явяцца “беларусы”.

Калі б ВКЛ — пры ўсіх магчымых гістарычных трансфармацыях,— не страціла дзяржаўнасці да нашага часу, дык, напэўна, сёння мы б не мелі знаку ні сучаснай беларускай нацыі, ні беларускай мовы (іншая рэч, што з узгляду на сучасны стан і нацыі, і мовы, гэтай віртуальнай рэтраспектывай нікога не ўстурбуеш — хутчэй наадварот). Але мы тут зусім не пра тое, як было б лепш, каб было не так, як было. А пра тое, што калі мераць

ад таго, як сталася (і *што* сталася), дык версія аб *іншым* часе фармавання беларускага этнасу, магчыма, і не будзе выглядаць авантурай “на злом галавы”.

Пасля канчатковага падзелу Рэчы Паспалітай усе тыя працэсы этнагенезу, што з XIII стагоддзя падтрымліваліся інстытутамі ўсіх формаў улады (ад палітычна-фінансавых да рэлігійна-культурных) натуральна здэградавалі і заняпалі, як толькі пазнікалі ўсе гэтыя ўладныя інстытуты. Жыццё краю мусіла радыкальна мяняць і свае вектары, і свае арыенціры ўжо хаця б таму, што цэнтр Улады апынуўся ў зусім іншым баку і формы гэтай улады былі цалкам непадобнымі да ранейшых. А значыць, у той ці іншай ступені змянілі свае формы і накірункі тыя працэсы этнагенезу, якія раней абапіраліся ці падтрымліваліся ўладнымі дыскурсамі ВКЛ. Усё гэта і дае падставы для меркавання, што ўласна *беларускі этнас* (як *толькі* беларускі) распачаў фармаванне і выспеў да памеру Нацыі ўжо адно ў кантэксце Расейскай імперыі, якая ідэалагічна і адміністрацыйна адмовіла ліцвінам, русінам, беларусцам... у праве на легітымнае існаванне. Дарэчы, у гэтага непрыкметнага выспявання ёсць адзін цікавы момант. Яно адбывалася ў ценю змагання (праз русіфікацыю) Расейскай дзяржавы з апалячваннем нашага краю. Але паколькі што “апалячванне”, што “русіфікацыя” (што іхні двубой) пераважна выяўляліся ў дыскурсах улады, дык нішто не замінала беларускаму этнасу натуральным самачынам фармавацца ў пазбаўленай каналаў хоць якой улады вёсцы.

Верагодна, мая версія пра час і месца абнаўлення беларускага этнасу трохі авантурная. Але бадай ніхто не стане спрачацца, што беларусы як Нацыя аформіліся менавіта і толькі ў дыскурсе Расейскай імперыі. Між іншым, не мы адныя, *а і самі расейцы*, і палякі, і латышы, і эстонцы, і грузіны, і ўкраінцы...

І дзейна **заманіфеставалі** сваё права на “нацыянальнае самавызначэнне” амаль усе разам (улучна з расейцамі) і прыблізна ў той самы час (1917—1920 гады), гэта значыць, калі абрынулася дынастычная імперыя Раманавых. Зразумела, што расейскі нацыяналізм узнік значна раней, але пакуль існуе дынастычная дзяржава, казаць пра паўставанне нацыі і нацыянальнай дзяржавы (у дадзеным выпадку, расейскай) — гэта аксюмаран*.

Аднак мы трохі запабеглі наперад... Калі землі нашай Бацькаўшчыны былі пабраныя ў склад Расейскай імперыі, дык **тут** Беларусі *яшчэ* не было, але *ўжо* не было і ВКЛ. Канстытуцыя Рэчы Паспалітай ад 3 траўня 1791 году супольную з ВКЛ дзяржаву называе толькі Польшчай і ніводзін народ, апрача палякаў, там не згадваецца**. Пры ўсёй фармальнай і юрыдычнай федэратыўнасці Рэчы Паспалітай, насамрэч яна досыць хутка ператварылася ў інструмент каланізацыі (праз каталізацыю і паланізацыю) усёй прасторы ВКЛ. Інакш кажучы, яшчэ да таго, як на нашыя землі прыйшлі расейцы, мы ўжо былі грунтоўна скаланізаваныя палякамі. Таму, калі адбыўся канчатковы падзел Рэчы Паспалітай, дык, па-першае, гэтым распачалася расейская каланізацыя менавіта прасторы Рэчы Паспалітай і палякаў (а не ВКЛ і ліцвінаў), а па-другое, наследуючы фармальнай логіцы, расейская экспансія якраз і вызваляла ВКЛ ды ліцвінаў-беларусцаў (“народ издревле нам родной”) з-пад польскай каланізацыі. За што, з сённяшняга досведу, мы мусілі б быць Расеі нават удзячнымі, бо ў XVIII стагоддзі ніякіх тэндэнцый да будучага паўставання незалежнай Беларусі ў Рэчы Паспалітай аніяк не праглядвалася... (Між іншым, пазней гэтаксама. Згадаем прылучэнне Заходняй Беларусі да Польшчы ў міжваенны перыяд XX стагоддзя, дзе беларушчыну ніштожылі не раўнуючы нават з бальшавікамі).

Схема, у якой Беларусь прадстаўленая апалоненай і скаланізаванай Расейскай імперыяй, відаць, наўпрост скалькаваная з уласна польскай сітуацыі, дзе падобнае насамрэч адбылося. Гэта значыць, што элементарная бінарная апазіцыя “каланізацыя — супраціў”, цалкам прыдатная для палякаў, была запазычаная беларусамі без крытычнай рэфлексіі, адно з узгляду на вызвольныя парыванні Польшчы 1831, 1863, 1921 гадоў.

Расея была не толькі турмой народаў, але і *калыскай нацыяў*. Прынамсі, для беларусаў апошняе не менш істотнае за першае. І тут не трэба шукаць супярэчнасцяў. Метафара “турмы” можа быць цалкам слушнай для пабраных Расейскай імперыяй прастораў і паняволеных ёю народаў. Але калі мы наўпрост таясамім прастору, народ і нацыю, дык шмат чаго заблытваем і з гэтага атрымліваем “скаланізаваную беларускую нацыю”, што ніяк не адпавядае сапраўднасці***. Мы проста па чужой завядзёнцы таясамім Расейскую імперыю, калыску беларускай нацыі, з уласна расейскім нацыяналізмам, які бязлітасна ніштожыў бліжэйшых канкурэнтаў.

## 8. ПАЎСТАННЕ АЎТСАЙДЭРАЎ

У плане этнагенезу мы сапраўды вясковая нацыя, бо ўсе нашыя эліты папярэдніх эпохаў перманентна знікалі ў тых ці іншых, але спрэс *не нашых* (па сённяшнім вымеры), уладных дыскурсах. І толькі вёска, як казалася вышэй, пазбаўленая каналаў хоць якой улады, няўзнак для самой сябе спеліла патэнцыял беларускай прышласці.

А далей нам істотна зразумець, што ў адрозненне ад этнасу, які паступова фармуецца натуральным ходам сацыяльна-

культурных узаемадачыненняў і стасункаў, Нацыя паўстае адно праз волю да ўлады нейкай цывілізацыйна новай сілы, што выспела для гэтай ролі ва ўлонні этнасу ці свядома абрала яго, як пляцоўку дзеля рэалізацыі свайго ўладнага патэнцыялу. Гэта значыць, Нацыя не з'яўляецца сама па сабе, а ствараецца пэўнымі інтэнцыямі: спачатку праз фармуляванне ідэалагемы Нацыі, а затым — праз палітычную барацьбу ці збройны супраціў.

Што да беларускай Нацыі, дык пытанне пра тыя новыя цывілізацыйныя сілы, якія неўпрыкмет набрынялі воляй да ўлады — надзвычай складанае. Рэч у тым, што ніводнага з базавых складнікаў (шматлікі сярэдні клас, капіталізацыя і урбанізацыя), неабходных для паўставання Нацыі, Беларусь ні ў XIX, ні на пачатку XX стагоддзя не мела. Сярэдні клас, нават у сваёй этнічна беларускай частцы, ментальна тоесніў сябе альбо з расейцамі, альбо з палякамі; у тых жа дыскурсах, толькі з дадаткам габрэйскага, адбывалася і капіталізацыя грамадства. Яшчэ больш неспрыяльнай сітуацыя выглядала ў вымеры трэцяй базавай кампаненты — урбанізацыі. Згодна перапісу 1897 году, у гарадах і мястэчках жыло толькі 17,1% беларусаў (тут дамінавалі габрэі — 57,5%; расейцаў было — 16,7%, палякаў — 6,1%), да таго ж беларусы пераважна належалі да ніжэйшых класаў у сацыяльнай іерархіі горада.

Адсутнасць ментальна беларускага сярэдняга класу сваімі наступствамі мела яшчэ і тое, што менавіта сярэдні клас ёсць радовішчам інтэлектуалаў, якія адно і могуць сфармуляваць ідэалагему Нацыі і тым самым запачаткаваць яе станаўленне. Гэта разумелі і тыя піянеры нацыянальнага руху, якія пісалі ў першым нумары падпольнага часопісу “Гоман” (Санкт-Пецярбург, 1884 г.): “Беларускі народ, як нацыя плебейская, чакае яшчэ з'яўлення сваёй інтэлігенцыі. Да гэтага часу ён выдзяляў з сябе сілы, якія служылі або польскай, або вялікарускай культуры. Глуха, але настойліва пратэставаў ён супраць здрадніцкіх спробаў

паланізаваць ці абвялікарусіць яго, і абедзве сілком навязаныя яму культуры праходзілі міма, не прышчапіўшыся да яго. Свята захоўвае ён асновы свайго жыцця ў чаканні сваёй інтэлігенцыі, якая будзе не ламаць гэтыя асновы, а развіваць і ўдасканальваць іх...”.

Пытанне аб прычынах з’яўлення ў прасторы “плебейскай” нацыі інтэлектуалаў (публіцыстаў, паэтаў, гісторыкаў), палітыкаў і нават бізнесоўцаў ёсць адным з самых інтрыгуючых пытанняў станаўлення беларускай Нацыі.

Найперш мы мусім адзначыць, што ніводны з піянераў і будучых герояў нацыянальнай будоўлі не быў, так бы мовіць, чыстым плёнам жыццядайнасці самога беларускага народу. Усе яны **вярталіся** на сваю *этнічную* радзіму з нейкіх іншых этнакультурных абсягаў — найперш расейскага, польскага і ўкраінскага. Гэта значыць, што яны атрымалі адукацыю, пэўны сацыяльны статус, ідэнтыфікацыйную легенду як гадаванцы небеларускіх нацыянальных кодэксаў. Што і зразумела, бо беларусы на тую пару не мелі ўласных інстытуцыяў ні ў культуры, ні ў палітыцы, ні ў эканоміцы (гэта нягледзячы на тое, што ў 1897 годзе адсотак пісьменных людзей у Беларусі складаў 32%, тым часам як у Расеі і на Украіне — адпаведна 29,6% і 27,9%).

Дарэчы, вось гэтая *сітуацыя вяртання* застанецца дамінуючай і праз усё XX стагоддзе. Бо хаця ў 20-я гады і будзе створаная сістэма нацыянальнай адукацыі, і пакрысе сфармуюцца сферы (пераважна гуманітарныя), дзе можна будзе жыць *амаль* паўнавартасным нацыянальным жыццём, але выбар нацыянальнай формы жыцця ў Беларусі да гэтага часу залежыць ад персанальнага выбару, які кожны мусіць зрабіць сам. Ці не зрабіць — што “масаваму” чалавеку больш натуральна.

Далей мы зацікавімся вось якім пытаннем: а чаму гэта беларусы (з сярэдзіны XIX стагоддзя) пачалі вяртацца на *этнічную* радзіму? Раней жа не вярталіся?

Так, не вярталіся, бо не было куды. Аднак не ў тым сэнсе, што раней беларусаў, як этнасу, не было — *было*, прынамсі, ужо ладны кавалак часу. Не хапала іншага: усведамлення этнасу (нацыі), як універсальнай каштоўнасці, якая адначасна надае высокую каштоўнасць і твайму сінгулярнаму кону. А падобнае разуменне не магло з'явіцца да таго часу, пакуль не запанавалі ідэі "свабоды, равенства, братэрства" ўсіх саслоўяў. Толькі адсюль "плебейская" нацыя ўжо магла быць убачанай як ахвяра збудаванага на гвалце свету, вартая і спагады, і любові, але найперш — вызвалення з-пад гэтага гвалту.

Як ужо казалася, хваля пераўладкавання свету на нацыянальны капыл абрынулася на Еўропу з канца XVIII стагоддзя і досыць хутка захліснула і нашыя землі, чаму найбольш выразным сведчаннем паўстанні 1830 і 1863 гадоў.

Але прэсінг вялікага палітычнага стылю — гэта толькі неабходная перадумова для з'яўлення такога феномену, як сістэмнае вяртанне на *этнічную* радзіму. А вось сам акт вяртання (у кожным разе звязаны з персанальным выбарам) быў абумоўлены мноствам самых розных псіхалагічных, сацыяльных, палітычных і культурных матывацыяў. Сярод гэтага мноства мы, з аднаго боку, вылучым высокі рамантызм, а з другога — інтуітыўны (ці свядомы) прагматызм.

Першы выпадак мае за грунт натуральны патрыятызм. У тую пару, калі ў розных кутках Еўропы ўсе народы памкнуліся ўцялесніваць уласную нацыянальную ідэю, мы, маючы славутую гістарычную спадчыну і сфармаваны этнас, не маглі калісьці не апынуцца ў гэтым універсальным працэсе любові да свайго і да саміх сябе ў гэтым сваім.

Значна больш складана патлумачыць, што я разумею пад "інтуітыўным прагматызмам". Вышэй ужо казалася, што кожны, хто потым навярнуўся на беларушчыну, да гэтага меў пэўны сацыяльны статус і нейкую перспектыву ў дыскурсе Расейскай

імперыі. Аднак з прычыны іхняй, хай сабе і адаптаванай, але “іншасці”, бальшыні з этнічных беларусаў было наканавана заставацца сярод аўтсайдэраў ва ўладным полі метраполіі, як бы высока яны ні падымаліся па іерархічнай лесвіцы (для прыкладу згадаем хаця б Фадзея Булгарына). У стабільныя эпохі аўтсайдэры, звычайна, моўчкі трываюць свой кон — затое, калі пачынаецца пара вялікай крызы, яны актыўна выходзяць на авансцэну гісторыі.

*Беларускі нацыянальны рух быў сфармаваны аўтсайдэрамі* з іншых нацыянальна-ўладных дыскурсаў. Гэта досыць абразлівая выснова для нашага гонару, але суцешым сябе тым, што яна *тыпалагічная,* калі вядзецца гаворка пра паўставанне новых нацыяў (і ўвогуле новых дыскурсаў).

Лідэры не вяртаюцца. Тыя, што патрапілі ва ўладныя эліты метраполіі, ніколі не вяртаюцца на *этнічную* правінцыю. Вяртаюцца адно аўтсайдэры, якія не маюць шанцаў займець адпаведнага сваім амбіцыям месца ва ўжо сфармаваных кастах элітаў. Так амбіцыі Кастуся Каліноўскага падштурхнулі разыграць “беларускую карту” ў “польскім” паўстанні, дзе яму не было першай ролі нават сярод рэгіянальных кіраўнікоў; так далучыўся да збройнага чыну БНР Булак-Балаховіч, так Янка Купала пакінуў вершаваныя практыкаванні ў польскай мове, а Максім Багдановіч — у рускай, так было ў безлічы самых розных іншых выпадкаў; і так працягваецца да гэтага часу (бальшыня сёння вядомых апазіцыйных палітыкаў, якія абапіраюцца на нацыянальна заангажаваны электарат — гэта аўтсайдэры дыскурсу паноўнай улады).

Я не належу да адэптаў псіхааналізу, бо не люблю корпацца ў сутарэннях чужых свядомасцяў і, тым болей, падсвядомасцяў (а да таго ж яшчэ паважаю суверэннасць асобы). Вось чаму мае адсылкі да персаналіяў, што тут згаданыя дзеля канкрэтных прыкладаў да абстрактнай версіі пра “комплекс

аўтсайдэра як нацыястваральны чыннік", прашу a priori лічыць не карэктнымі. І рэч тут не толькі ў маім скептычным стаўленні да псіхааналізу як такога. У кожным асобным выпадку выбар на карысць вяртання да *этнічнай* радзімы адбываецца праз збег мностваў матывацыяў — сітуацыйных, прагматычных, палітычных, сацыяльных, рамантычных, містычных, метафізічных і г.д, і да т.п. Таму вылучэнне з гэтага багатага суплёту матывацыяў нейкай адной з іх ужо паводле азначэння ёсць хібай.

Але я гатовы адстойваць вышэй згаданую "прагматычную" версію ў якасці адной з базавых схемаў нацыянальнай рэвалюцыі, бо гэтаксама сацыяльныя аўтсайдэры рабілі рэлігійныя, феадальныя, буржуазныя, а затым і пралетарскія рэвалюцыі.

Уласна кажучы, усе вялікія перамены ў гісторыі чалавецтва зробленыя аўтсайдэрамі... Амбітнымі аўтсайдэрамі, якіх ужо назапасілася столькі, што яны вымагаюць сабе новых прастораў

---

* Сучасны гісторык Дамінік Лівен сфармуляваў гэтую сітуацыю наступным чынам: "Нават у 1914 годзе расейцы на самой справе яшчэ не былі нацыяй". Але не сталіся яны нацыяй і адразу пасля рэвалюцыі. У 1918 годзе Тамаш Масарык пісаў пра расейскі народ: "Яны выбавіліся ад цара, аднак і да гэтай пары не пазбавіліся ад царызму".

**Юліуш Бардах у кнізе "Штудыі з гісторыі Вялікага Княства Літоўскага" падрабязна разглядае, як Рэч Паспалітая Абодвух Народаў у Канстытуцыі 3 траўня 1791 году ператварылася ў Польскую Дзяржаву. Шмат месца ён надае аналізу *Узаемных Заручынаў Абодвух Народаў,* юрыдычнаму дакументу, які мусіў пацвердзіць усе асноўныя правы Вялікага Княства Літоўскага, ужо не згаданага Канстытуцыяй. Але, здаецца, мае рацыю Леснадорскі, які кажа, што хоць Узаемныя Заручыны "ў форме наследавалі даўнейшыя акты уніі, у сапраўднасці... сцвярджалі інкарпарацыю Літвы ў Польшчу з забеспячэннем толькі мясцовай, г.зн. польскай альбо спольшчанай шляхце шырокага самакіравання".

*** Беларусы *не скаланізаваныя* Расеяй як нацыя, яны, як нацыя, *зрэпрэсаваныя* расейскім нацыяналізмам — а гэта зусім розныя рэчы.

(геаграфічных, палітычных, культурных), дзе ім будзе даволі месца для выяўлення сваёй волі да ўлады.

## 9. ПАКЛІКАННЕ ПРАСТОРЫ

Беларусь усё яшчэ знаходзіцца ў сітуацыі адсутнасці будучыні, прынамсі — пэўнай. З гэтай сітуацыі шмат чаго вынікае, але найперш тое, што ў Беларусі (і з Беларуссю) пакуль усё магчыма. Беларусь яшчэ магчымая як самастойная еўрапейская дзяржава і як шараговая правінцыя адноўленай Расейскай імперыі, як лакальны фрагмент глабальна ўладкаванага свету і як прамотар агрэсіўнай кааліцыі "славянскіх" дзяржаваў...

Аднак пры ўсёй цьмянасці, невыразнасці, шматварыянтнасці магчымасцяў нашай будучыні, няма сумневу, што ў Беларусі ёсць не толькі доля, але і лёс. І вось чаму. Цягам апошняга тысячагоддзя *еўрапейскай гісторыі* Беларусь, як суб'ект гэтай гісторыі, раз-пораз хавалася ў сваю адсутнасць, але яна ніколі не знікала як суб'ект *еўрапейскай прасторы*. Незалежна ад таго, якія дзяржаўныя ўтварэнні апаноўвалі гэтай прасторай (Полацкае княства, ВКЛ, Рэч Паспалітая, Расейская імперыя, СССР), Беларусь заўсёды вымагала для сябе адметнага прасторавага статусу. Нават забараніўшы назоў "Беларусь", Расейская імперыя мусіла вынайсці для яе апрычоную пазнаку ("Северо-Западный край"), нават адсекшы лязом "Брэсцкага міру" Заходнюю Беларусь, Польшча не магла не вылучыць яе з свайго цэлага, як "крэсы всходне"... І колькі б разоў за апошняе тысячагоддзе гэтая прастора не разрывалася на кавалкі living рознымі дзяржаўнымі, ідэалагічнымі, канфесійнымі ўтварэннямі, яна рана ці позна зноў гуртавалася ў нейкую топасную цэласнасць, канфігуратыўна блізкую да прататапалагічнай мадэлі. Усё гэтае разам пераконвае, што прастора, цяпер пазначаная этнонімам "Беларусь", мае сваё *сакральнае* пакліканне, а значыць, і надалей не стане чакаць

сабе хоць якога месца ў будучым, а будзе патрабаваць і займаць яго сама для сябе.

Зусім іншая рэч, якім зместам пабярэцца гэтая сакральна вылучаная прастора, якія каштоўнасці на ёй запануюць? На вялікі жаль, адказы на гэтыя пытанні пакуль залежаць хутчэй ад пажаданняў таго, хто адказвае, а не ад наперад яўленых бачнасцяў, якія самі яшчэ чакаюць будучыні, каб аб’явіцца для нас.

## 10. ДЗЯРЖАВА І НАЦЫЯ

На самым пачатку гаворкі, адзначаючы выключную ролю Францішка Багушэвіча і газеты “Наша Ніва” ў фармаванні ідэалагемы беларускай нацыі, я казаў, што “з іншага боку, у канцэптуальным плане мы мелі б прыблізна тое самае, што маем, і без Багушэвіча, і без “Нашай Нівы”. Было б залішне рамантычна (ці містычна) звязваць такую анталагічную падзею, як нараджэнне нацыі, з несістэмнымі выпадкамі прыватнага тыпу. Сувязь тут хутчэй цалкам адваротная: і Багушэвіч, і “Наша Ніва” — гэта ўсяго толькі адметныя моманты фармалізацыі новай нацыі, якая ўжо саспела, каб выйсці з латэнтнага стану ў сітуацыю культурнай і геапалітычнай рэальнасці”.

Прыкладна тое самае я хачу сказаць і адносна факту паўставання Беларускай дзяржавы. Раз-пораз у публікацыях самых розных аўтараў робіцца акцэнт на выпадковасць, збег абставінаў, сітуацыйнасць, палітычны валюнтарызм і г.д., якія радыкальным чынам паўплывалі на вылучэнне Беларусі ў аб’ект (яшчэ пакуль толькі *аб’ект*) еўрапейскай геапалітыкі. Маўляў, каб на Радзе Усебеларускага кангрэсу (сакавік 1918 году) перамаглі “аўтаномнікі”, а не “незалежнікі”, дык нічога такога і ўвогуле не было б. А з іншага боку, каб не было БНР, то ніхто не ўздумаў бы ствараць БССР. Ці вось яшчэ, каб згодна “Брэсцкага

міру” да палякаў не адпала ўся Заходняя Беларусь (4 мільёны насельніцтва), дык Маскве і не да галавы было б узбуйняць здрабнелую ў нішто БССР паветамі Віцебскай ды Гомельскай губерняў... (і гэтак далей — усяго не пералічыць).

Кожная падобная версія сапраўды мае пад сабой падставы, і часам досыць грунтоўныя. Але ўвесь вэрхал з прылучэннямі/адлучэннямі тэрыторый, зменамі назваў і дзяржаўна-палітычных канструкцыяў краіны (з 1918 па 1922 год Беларусь была і Беларускай Народнай Рэспублікай, і Літоўска-Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікай, і Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікай, і базавай складовай Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік) сведчыць якраз пра адваротнае: пасля развалу Расейскай імперыі гэтая прастора настойліва патрабавала для сябе апрычонага геапалітычнага статусу ў “сваіх этнаграфічных межах”. Дзівіць хутчэй іншае: як у такіх, цалкам неспрыяльных абставінах, не маючы ўнутры сябе дастатковых палітычных сілаў для самапаўставання, наш *край* змог выразніцца сярод іншых у палітычна-адміністрацыйнай канфігурацыі, якая ў асноўным ахоплівала аўтэнтычную Беларусь.

*“Было б залішне рамантычна (ці містычна)”* звязваць паўставанне Беларускай дзяржавы з выпадкам, палітычнымі інтрыгамі, суб’ектыўнымі памкненнямі тых ці іншых асобаў. Тое, што (і як) адбылося найлепей сведчыць пра невыпадковасць таго, што адбылося і што адно пацвердзіла тую тысячагадовую тэндэнцыю, у якой Беларусь ніколі не знікала як суб’ект *“еўрапейскай прасторы”*. З адной толькі розніцай (але звышкардынальнай) — цяпер гэтая прастора зноў пачала вяртаць сабе статус суб’екту *“еўрапейскай гісторыі”*.

Зыходзячы з гэтага, далей я прапаную змінімізаваць “адвечную” (і жорсткую) апазіцыю БНР — БССР. Бо калі ацэньваць сітуацыю ў вялікім вымеры паўставання Дзяржавы, то БНР і БССР пачынаюць выглядаць не як дзве смяротна

варожыя паміж сабой падзеі, а як адна і тая самая, толькі ў розных варыянтах палітычнай фармалізацыі. Калі заўгодна, дык што ідэалагемна, што ідэалагічна БНР з БССР — блізнюкі. І тое, і другое дзяржаўнае ўтварэнне абапіралася на тыя самыя базавыя пастулаты: сацыял-дэмакратыю і нацыяналізм. Рассунула іх у розныя, варожыя бакі — палітыка. У барацьбе за ўладу над Беларуссю бальшавікі (расейскія ў хаўрусе з беларускімі) адолелі не толькі беларускіх незалежнікаў, але, урэшце, і палякаў, якія з не меншым, чым бальшавікі, імпэтам імкнуліся падцягнуць да сябе гэтую прастору.

Істотнасць палітычнай барацьбы за Беларусь менавіта як за Беларусь мусіць быць зразуметая не праз вынік перамогі (ці паразы) тых альбо іншых палітычных сілаў (стратэгіяў), а праз сам факт гэтай барацьбы, які яскрава засведчыў сітуацыю чарговага паўставання Беларусі ў геапалітычным кантэксце Еўропы.

Чытаючы БНР і БССР як дзве зусім розныя падзеі, мы зыходзім з цяперашняга ведання, чым на практыцы для Беларусі (і не толькі для яе) падрахаваўся “Союз нерушимый республик свободных”, а не з самой ідэі БНР і БССР у сітуацыі іх запачаткавання. Згадаем дзеля прыкладу хаця б той вядомы факт, што недзе да 1929 году Савецкая Беларусь цалкам разгортвалася ў нацыяналістычнай мадэлі (“беларусізацыя”), з чаго многія нацыянальна заангажаваныя дзеячы палітыкі і культуры вярнуліся ў Беларусь. На II Усебеларускай палітычнай канферэнцыі ў Берліне (наладжанай Аляксандрам Цвікевічам у кастрычніку 1925 году) было нават пастаўлена пытанне аб скасаванні БНР на карысць БССР.

Дарэчы, праблема стасункаў паміж “нацыяналізмам” і “камунізмам” і сама па сабе надзвычай цікавая. І нацыяналізм, і камунізм — дзеці адной і той самай падзеі, а менавіта Вялікай Французскай рэвалюцыі з яе канцэптуальнай тэзай: “Свабода.

Роўнасць. Братэрства”. Паўстаўшы з агульнай рошчыны, яны і разгортваліся ў адну пару і ў адной прасторы. Здаралася, што ў іх нават “ворагі” былі тыя самыя (манархізм, дынастычная дзяржава, каланіялізм...). Хаця ў сваёй сутве гэта дзве рашуча супрацьлеглыя адна адной ідэалагемы. У сваім канцавым варыянце, камунізм з яго базавай ідэяй інтэрнацыяналізму (“У рабочага няма Айчыны”) татальна адмаўляў нацыяналізму ў праве на існаванне. Зрэшты, яны радыкальна разышліся ўжо на самым пачатку свайго паўставання праз стаўленне да капіталізму. Для камунізму капіталізм быў ворагам па азначэнні, нацыналізм жа, наадварот, сам быў спараджэннем капіталізацыі грамадства і адной з самых выразных яе формаў.

У праблематыцы гэтай апазіцыі, бадай, найбольш цікавае тое, што камунізм, зважаючы на неверагодную папулярнасць ідэі нацыяналізму, у тактычным плане змушаны быў дэманстраваць да яго плюралістычнае стаўленне, з чаго і ўзнік гэты дзіўны сімбіёз — нацыянал-камунізм, з вядомаю тэзаю *аб праве нацый на самавызначэнне.*

Формула нацыянальнай ідэі досыць хутка выявілася настолькі актуальнай, прадуктыўнай і ўніверсальнай, што менавіта пад яе рэфармаваліся старыя і ладзіліся ўсе новыя дзяржаўныя ўтварэнні XIX і XX стагоддзяў. І ўжо адно паследам, у другую чаргу на сфармаваны нацыяналізмам грунт пакладаліся камуністычныя (сацыял-дэмакратычныя) ідэалогія ды практыка, прынамсі, там, дзе гэта атрымлівалася зрабіць. Натуральна, што па гэткай мадэлі будаваліся і ўсе будучыя савецкія рэспублікі (улучна з РСФСР, толькі там сітуацыя была больш “пакручастай”), а пазней і ўсе краіны “камуністычнага блоку”. Зазіраючы наперад, заўважым, што ў сярэдзіне XX стагоддзя камуністычная ідэя на нейкі момант адолела нацыяналістычную, але ўжо канец гэтага ж стагоддзя засведчыў яе татальную паразу, калі ўвесь магутны

камуністычны блок у адначассе распаўся на мноства нацыянальных дзяржаваў.

Аднак вернемся назад, у 20-я гады. На тую пару Беларусь з неверагоднай інтэнсіўнасцю будавала нацыянал-камуністычную дзяржаву. Зразумела, гэтая дзяржава не была эканамічна самастойнай, не мела палітычнай незалежнасці, у яе адсутнічалі шмат якія сімвалы і атрыбуты дзяржаўнасці (сцяг, герб, грошы, войска...), але гэта ўжо была *Беларуская* рэспубліка са сваімі межамі, адміністрацыйна-гаспадарчай структурай, культурай, літаратурай і мастацтвам. (Між іншым, другая палова Беларусі ў складзе Польшчы тады нічога падобнага не мела.)

У чыста тэарэтычным плане можна паразважаць, што каб зададзеная стратэгія саюзу нацыянальных (а яшчэ б і “свабодных”!) рэспублік не была перапыненая рэпрэсіўным кашмарам, які татальна ахапіў усю прастору камуністычнай імперыі ва ўсіх яе праявах і чынніках, дык у скутку мы, верагодна, мелі б і не самы горшы з магчымых варыянтаў мега-дзяржавы (нешта накшталт “еўрасаюзу”, толькі з сацыялістычнымі формамі эканомікі і грамадскага ўладкавання). Але падобныя тэарэтычныя развагі былі б проста інтэлектуальнай гульнёй у “дапушчэнні”, бо якраз тэорыя што камунізму, што нацыяналізму сведчыць аб іх непрымірымай варажнечы, закладзенай у саму прыроду і таго, і другога. І гэты смяротны антаганізм рана ці позна не мог не выявіцца, што і пацвердзілі трыццатыя гады.

Тактычны хаўрус з нацыяналізмам быў гвалтоўна перапынены, як толькі камунізм увабраўся ва ўласную моц. Сфармаваныя па нацыянальным прынцыпе рэспублікі адыгралі сваю ролю ў паўставанні СССР і цяпер маглі быць скасаванымі.

Напэўна адказаць, чаму Сталін, для якога не было праблемай фізічна перасяліць цэлы народ з адной прасторы ў зусім іншую, не прарабіў гэтай, хай сабе і складанай, але ўсяго толькі фармальнай працэдуры — досыць складана. Версіяў тут можа

быць колькі заўгодна, я проста ў гэты віртуальны суплёт дадам яшчэ адну...

Барацьба з "нацдэмаўшчынай", якую камуністы пачалі разгортваць толькі напрыканцы дваццатых гадоў, нечакана выявіла эфектыўныя магчымасці *нацыянальных* рэспублік у вынішчэнні... *нацыянальнага*. Лакалізаваныя ў межах канкрэтнай адміністрацыйна-палітычнай сістэмы, нацыі апынуліся пад татальным наглядам і кантролем, што давала магчымасць рэгуляваць усе нацыянальныя працэсы ў бок іх мінімізацыі, а затым праз тыя ж рэспубліканскія палітыка-адміністрацыйныя і карныя механізмы рэпрэсаваць нацыяналізм як з'яву і персанальна знішчажаць найбольш актыўных яго герояў.

Інакш кажучы, нацыянальныя рэспублікі былі ператвораныя ў своеасаблівыя гета, дзе лакалізаваныя і замкнёныя ў саміх сябе нацыі цягам часу мусілі быць вынішчаныя "на корню". А своеасаблівасць гэтых гета азначаная тым, што іх заўсёды можна было пакінуць — але толькі пакінуўшы там сваю нацыянальную сутву. Да таго ж зусім не абавязкова было выбірацца з нацыянальных гета ў фізічным сэнсе. Дастаткова было змяніць сваю ідэнтыфікацыю — перайначыць сябе з нацыянальнага чалавека ў савецкага, і ты адразу апынаўся на шырокай і вольнай прасторы. (Ужо іншая рэч, што ідэя "савецкага чалавека", апрача ўсяго астатняга, а хутчэй і перадусім астатнім, у сваёй функцыянальнасці мелася быць інструментам па перапрацоўцы нацыянальнага чалавека — праз савецкага — у "рускага".)

Калі б у васьмідзесятыя гады XX стагоддзя ідэалогія і практыка камунізму не апынуліся ў сістэмным крызісе, дык ужо ў першай палове XXI стагоддзя татальная анігіляцыя нацыянальнага камуністычным была б завершаная. Але крызіс апынуўся настолькі глыбокім і ўсёахопным, што неўзабаве ад яго пачатку камуністычны свет разваліўся ў сваім цэлым, пакінуўшы пасля сябе адно некалькі лакальных фрагментаў

(Куба, Паўночная Карэя...) і адзін глабальны — Кітай.

Гэты раздзел мы пачалі з гаворкі, што ў XX стагоддзі Беларусі ўжо было наканавана выявіцца ў нейкай форме дзяржаўнага ўтварэння пры любым збегу гістарычных абставінаў. Таму досыць пашыраная формула, што без БССР не было б і РБ, па сутнасці, нічога нам не кажа. Разам з тым, дзякуючы менавіта наяўнасці БССР, адразу пасля распаду СССР мы займелі цалкам сфармаваную і функцыянальна дзеяздольную Дзяржаву. Заставалася вырашыць толькі ўнутрыпалітычныя праблемы — выбраць ідэалагічную ды сацыял-эканамічную мадэлі і адпаведна гэтых мадэляў публічна запрэзентаваць дзяржаўнасць у сцягу, гербе, гімне, валюце, знешнепалітычным курсе...

Дарэчы, у 1991 годзе (на пачатку беларускай незалежнасці), канцэпцыя “Беларусі ў яе этнаграфічных межах”, з якой пачынаўся наш шлях да дзяржаўнасці, ужо нават не згадвалася ў якасці мадэльнай, бо гэтыя межы сягалі ў цэлы шэраг суседніх краінаў: Расею (Смаленшчына), Украіну (Чарнігаўшчына), Літву (Віленшчына), Польшчу (Беласточчына)... Натуральна, ніводная з нашых суседак і думаць не думала вяртаць нам нашыя “этнаграфічныя землі” (аб чым сцішана мроіла купка нацыянальных рамантыкаў). Зрэшты, як і мы не збіраліся вяртаць тое, што, на іх думку, належала ім...

## 11. ДРУГАЯ СУСВЕТНАЯ ВАЙНА

Другая сусветная вайна для Беларусі выявілася не толькі самай трагічнай, але, бадай, і самай істотнай (пасля стварэння дзяржавы) падзеяй у вымеры ўсяго XX стагоддзя. З аднаго боку — загінуў кожны чацвёрты беларус (ёсць версіі і пра кожнага трэцяга), былі разбураныя гарады, селішчы, заводы ды фабрыкі,

раскалолася на драбкі ўся сацыяльная інфраструктура, на доўгія гады заняпала эканоміка, інтэлектуальнае і культурнае жыццё. А з другога — і праз гэтыя страты, а яшчэ ў большай меры праз збройны партызанскі чын адбылася легітымацыя Беларусі, як праўнага суб'екту сусветнай супольнасці, фармальным пацверджаннем чаго сталася сяброўства ў ААН — ды яшчэ ў статусе аднаго з заснавальнікаў (абмінем тут праблему палітычнай кан'юнктуры, з якой мы і займелі гэты "статус").

Аналізуючы гэтую падзею, перадусім будзем зважаць, што для Беларусі Другая сусветная вайна абярнулася некалькімі войнамі. Першая з іх — гэта тая, якую Савецкі Саюз вёў з Германіяй, і ў якой беларусы (звыш мільёна чалавек) у складзе савецкіх войскаў ваявалі паводле законаў татальнай мабілізацыі, аднолькавай для ўсяго савецкага грамадства. Але для беларусаў галоўнай сталася не першая, лёсавызначальная для ўсяго чалавецтва, а другая вайна, якая табарылася на іх уласнай, акупаванай немцамі, тэрыторыіі. (А была ж яшчэ адна "беларуская вайна", у якой заходнія беларусы ваявалі ў складзе польскага войску — але мы яе пакінем абок гаворкі). Якраз гэтая партызанская вайна і зрабіла Беларусь вядомай у свеце. І, што не менш істотна, суб'ектызавала і міфалагізавала беларусаў для саміх сябе.

Савецкая партызанка (паводле афіцыйных звестак — звыш 440 тысячаў партызанаў і падпольшчыкаў) — першы агульнанацыянальны міф беларусаў. Значнасць гэтай падзеі цяжка перабольшыць. Бо Нацыя, як "уяўная супольнасць", набывае сваю рэальнасць толькі ў міфах і адно праз міфы. Калі заўгодна, Нацыя — гэта нішто іншае, як міф пра Нацыю.

Але, разумеючы ўсю каштоўнасць міфаў для нацыяўтваральных працэсаў, далей мы паспрабуем дэканструяваць Вялікае паданне пра мужны і гераічны беларускі народ, якое дзесяцігоддзямі фармавала магутная ідэалагічная машына

камуністычнай імперыі. І дэканструяваць не дзеля забаўкі, маўляў, што там спадыспаду, а каб не таясаміць міжсобку міф і тую рэальнасць, на якой ён паўстаў.

Як гэта ні дзіўна, аднак у праблеме беларускай “партызанкі” звычайна застаюцца ў баку ці ўзгадваюцца толькі ўскосна самыя прынцыповыя пытанні гэтай падзеі і найперш наступнае: масавы партызанскі рух на Беларусі — штучна створаны прэцэдэнт ці натуральна абумоўлены факт? Паколькі гэтае пытанне ўтрымлівае ў сабе шмат аспектаў, паспрабуем вылучыць у ім аснову. Нашыя вясковыя дзядзькі самахоць пацягнуліся ў лясы, ці наўмысна створаная сітуацыя справакавала іх хавацца ў гушчары і часам хапацца за стрэльбы? І яшчэ больш канкрэтна: партызанская вайна была нязмушаным памкненнем вольналюбівых і мужных беларусаў да вызвалення ад акупацыі ці такі выраз ёй надалі з пэўных ідэалагічных патрэбаў.

На пачатак паспрабуем давесці, што ідэя змагання з нямецка-фашыстоўскімі акупантамі ўвогуле не-беларускага паходжання, бо ў праекцыі на беларусаў яна не мае гістарычна пацверджанага генезісу, прынамсі, ужо не мела яго на той час, паколькі традыцыя вайны з іншаземцамі была перапыненая ў апакаліптычных войнах з Масковіяй другой паловы XVII стагоддзя (“крывавы патоп”). Яе пазнейшая як бы наяўнасць у фактах і лічбах спланаваная звычайным ідэалагічным (рамантычным) памкненнем вылучыць гераічную плынь у бытаванні беларускага народа і тым самым гераізаваць увесь народ. Паасобным фактам 1794, 1812, 1830, 1863 гадоў, паўсталых на парэштках традыцыі *шляхецкай вольнасці*, надаецца значэнне ўстойлівай тэндэнцыі, што і “сацыялагічна”, і “агіяграфічна” ніяк не адпавядае агулу рэальнасці на тую пару ўжо спрэс *плебейскай* беларускай нацыі.

Гераічнай бывае асоба, народ прынцыпова не-гераічны. Масавы збройны гераізм народа — аксюмаран. Калі б гэтая з’ява існавала папраўдзе, а не была толькі рытарычнай фігурай

ідэалагічнага начыння, дык народы ўжо даўно павыбівалі б адзін аднаго ўшчэнт. Масавы гераізм — з'ява больш небяспечная, чым адсутнасць гераізму ўвогуле. Кожная праява масавага гераізму павінна разглядацца як сімптом смяротнай хваробы, за якой страта народам важнейшага з інстынктаў — інстынкту самазахавання.

Невыпадкова ў мове беларускага народа няма слова, якое акрэслівала б гэтую тэндэнцыю. Больш таго, нават асобныя праявы гэтай тэндэнцыі не абапіраюцца на ўстойлівыя лексемы, а кніжнае, з ідэалагічнай лексікі, “герой” у жывым вымаўленні беларусаў гучыць няйнакш, як іранічна.

Няма слова — няма і з'явы. У лакальным змесце падобнае сцвярджэнне мусіць успрымацца як спрошчанае ці авантурнае. Але калі мы азіраем шырокі гістарычны прасцяг і, вызначыўшы ў ім нейкую натуральна абумоўленую заканамернасць, не можам ёй падшукаць адпаведнага слова ў мове народа, дык у нас з'яўляюцца сур'ёзныя падставы запытацца: *а ці быў хлопчык*? Бо не факт і лічба, а ўтаймаванне факту і лічбы ў слове выяўляе іх сапраўдны сэнс альбо ягоную адсутнасць.

Яшчэ да апошняга падзелу Рэчы Паспалітай, вынішчаная войнамі з Масковіяй, Беларусь была ўжо ў нейкай ступені “акупаваная” Польшчай. А далей пацягнулася эра перманентнай акупацыі: шведы, французы, немцы, палякі, зноў немцы, а на пачатку, у прамежку і потым — расейцы, расейцы, расейцы. Паднявольны стан, стан акупацыі зрабіўся натуральным для беларусаў, і з цягам часу яны прызвычаіліся да чужыннага гнёту, як да ціску атмасферы.

Зноў жа звернем увагу, як факт татальнай залежнасці ад чужаземцаў адбіўся ў мове. Вызначаючы час той ці іншай падзеі, беларусы звычайна кажуць: (*гэта было*) за палякамі, за немцамі, за саветамі. Мова народа ўжо не ўтрымлівала катэгорый

самастойнага бытавання на сваёй зямлі.

Дык адкуль тады феномен збройнага супраціву апошняй нямецкай акупацыі? З чаго раптам гэтая ідэя апанавала ўсім народам, які даволі абыякава трываў папярэднія прышэсці чужынцаў, хаця б тых жа самых немцаў яшчэ дваццаць гадоў назад?

Адказ навідавоку: мадэль жорсткага супраціву акупацыі была навязаная беларусам Расеяй. Для расейцаў, якія ад захопу польска-беларускімі войскамі Масквы на самым пачатку XVII стагоддзя зведалі толькі паспешлівы “візіт” Напалеона, чужынец са зброяй у руках сапраўды быў нечым нязвыклым, дысгарманічным, варожым у той апошняй меры, якая вымагала змагання да скону (свайго ці ворага). Тут яшчэ трэба адзначыць, што падобнае стаўленне да акупацыі вынікала не толькі з ментальнасці расейскага чалавека, але і з ягонага ўсведамлення моцы сваёй дзяржавы, якая здольная і мусіць перамагчы кожнага ворага. А з адваротнага боку — з адмаўлення Расейскай імперыяй якой-кольвек каштоўнасці за жыццём асобнага чалавека.

Вось гэткае разуменне акупацыі і было “вменено” паноўнай расейскай ментальнасцю пабраным Расеяй народам, і беларускаму таксама. Адсюль і збройны супраціў, адсюль і акцэнт на знішчэнне ворага, а не на ратаванне чалавека, адсюль — “перамога альбо смерць”.

Аднак тое, што для Расеі было Вялікай Айчыннай вайной, для нас — самазнішчэннем. Інспіраваная “Масквой” партызанка, з аднаго боку, правакавала немцаў на дадатковую, “пазапланавую” жорсткасць, а з другога, што, можа, яшчэ горш, саміх беларусаў да ненатуральнага ім, непатрэбнага і ўрэшце згубнага змагання з акупацыяй.

Здаецца, і па-сёння мы не ўсвядомілі, што для нас і для Расеі гэта былі дзве зусім розныя вайны, і таму ўсё яшчэ ніяк не

выпрацуем сістэму ацэнак тых падзеяў, сыходзячы са свайго разумення каштоўнасці жыцця. Будзем спадзявацца, што некалі такое здарыцца, а пакуль звернем увагу вось на што… Нягледзячы на магутны, татальны ўціск, беларускі *народ* (падкрэслім яшчэ раз — *народ*, а не пэўныя спалітызаваныя групоўкі насельніцтва) не прыняў партызанку. Так — не прыняў. І хай нас не ўводзяць у зман усе лічбы і факты ідыёлагаў і “сацыёлагаў”, успаміны ветэранаў і безліч твораў у мастацкай ды публіцыстычнай літаратуры, якія нібыта адлюстроўвалі рэальную барацьбу з ворагам.

Калі б так яно было папраўдзе, калі б папраўдзе ўвесь народ узняўся на змаганне з акупацыяй, гэта азначала б толькі адно — інстынкт самазахавання этнасу выпетрыўся да тых рэштак, за якімі ўжо нічога няма.

Партызанку зладзілі пакінутыя ў тыле савецкія функцыянеры, падпольныя райкамы, гаркамы, абкамы, дыверсійныя групы, рэйдавыя брыгады, акружэнцы, больш за дзвесце атрадаў НКУС… І ўтрымлівалася яна ідэалагічна, арганізацыйна і матэрыяльна коштам Вялікай Зямлі. А для самога беларускага народа партызанка была чужароднай, марнай і пераважна варожай справай. Яна несла небяспеку смерці ў значна большай ступені, чым сама акупацыя, бо гэтая небяспека была не гіпатэтычнай, а непасрэднай і вынікала як з карных аперацыяў пасля партызанскіх актаў, так і з гвалтоўнай сутнасці самой партызанкі.

Фактаў варожасці шараговага насельніцтва да партызанкі, не кажучы ўжо пра абыякавасць да яе, дакументамі, успамінамі, літаратурай назапашана таксама даволі, аднак яны яшчэ нікім не сістэматызаваныя, і на іх ніколі не рабіўся акцэнт. Толькі для нашых “даследзінаў” гэта і не істотна, бо мы звернем увагу на іншае, а менавіта на скептычную і нават здзеклівую афарбоўку слова “партызан” у жывым вымаўленні. І на захадзе Беларусі

(Гарадзеншчына), і на ўсходзе (Віцебшчына — партызанскі край) у непасрэднай, незаідэалагізаванай гаворцы ў слове “партызан” гучыць што заўгодна, ад з’едлівага скепсісу да панылай абыякавасці, толькі не “беларускія сыны”. (Іранічна-паблажлівае “Маўчыць, як партызан на допыце”, можа, вышэйшая мяжа станоўчай адзнакі, усе астатнія — ніжэй). За выключэннем нешматлікіх фактаў, народная свядомасць адраклася партызанкі, і таму нам не знайсці паважлівых, удзячных, пазначаных гонарам за мужную дзею інтанацый у семантычнай афарбоўцы ўсяго комплексу слоў, якія яе вызначаюць.

Ні з сацыяльна-палітычнага гледзішча (якое-такое вялікае шчасце яны мелі за Саветамі?), ні з натуральнага памкнення зберагчы сябе, сям’ю, род — ідэя змагання з акупацыяй не магла быць успрынята народам, як жыццёвая неабходнасць. І яшчэ. У масавай народнай свядомасці воля — не абстрактная катэгорыя, яна мае выразна акрэслены духоўна-сацыяльны абрыс. Калі мае... На той час беларусы так доўга не карысталіся воляй, што наўрад ці ведалі яе сэнс. А змагацца ні за што, толькі сабе на згубу, не будзе ні адзін народ.

Дык ці была для беларусаў Другая сусветная вайна Вялікай Айчыннай, у кантэксце якой і быў сфармаваны міф пра мужны Партызанскі народ? Верагодна, падобнае пытанне нетактоўна ставіць перад тым канкрэтным беларусам, які лічыў тады і застаецца перакананым да сёння, што змагаўся з фашызмам у Вялікай Айчыннай вайне. Аднак яшчэ больш нетактоўна і нават абразліва яно гучыць у адносінах да ўсяго народа, нацыі, якую прымусілі самазніштажацца, змагаючыся на баку адной хцівай імперыі супраць такой жа другой. Тут трэба дадаць яшчэ вось што. Крытэрый вайны як Вялікай Айчыннай, значна звужае і проста-такі нахабна спрошчвае гэтую неверагодна трагічную падзею, зводзячы яе да аднамернага супрацьдзеяння: “свае” — “чужыя”. І ў дадатак надае вайне высакародны сэнс, якога ў яе

не было і быць не магло.

Там, дзе вайна, там няма высакародства (па-за прыватна-канкрэтнай сітуацыяй). У бруд і кроў упэцкваюцца ўсе. Там, дзе вайна, там няма герояў і антыгерояў, ёсць толькі пакутнікі і ахвяры. І калі наша свядомасць яшчэ не можа абысціся без ідэі гераічнага на вайне, дык няхай паспрабуе перанесці сваё ўяўленне аб гераічным на годнае пакутніцтва ці самаахвярнасць (як гэта зрабіла хрысціянства).

Спроба вылучыць з вайны ў якасці станоўчага прыкладу той ці іншы яе элемент — ідэалагічная маніпуляцыя. Ніякі грамадскі інстытут не здольны быць больш маральным за маральнасць таго часу, таго грамадскага ладу і стану, у якім ён існуе. Ён можа дэклараваць найцнатлівыя маральныя пастулаты, абапірацца на якія заўгодна высакародныя прынцыпы, але дзейнічаць будзе на тых, якія выснаваныя тагачасным жыццём. Этычны кодэкс хрысціянства застаецца нязменным з часоў апостала Паўла, а сама царква ў розную пару бытавання і рабавала, і забівала, і здраджвала сабе і Богу, адным словам падпарадкоўвалася этычнаму пульсу рэальнага жыцця. Больш ці менш маральнай можа быць асоба, але не грамадскі інстытут, не тая ці іншая грамадска-палітычная супольнасць. У вайну ўсе некага забівалі. Забівалі “немцы”, забівалі “рускія”, забівалі “паліцаі”, забівалі “партызаны”. Якое з забойстваў лічыць маральным, а якое амаральным? І што значыць увогуле маральна апраўданае забойства?

Акупант і той, каго ён акупаваў, нкусавец і партызан, калабарант і паліцай — усе яны выклятыя лёсам, усе яны вартыя жалю. Верагодна, такі ўтапічна-пацыфісцкі падыход да праблемы шмат у каго выкліча абурэнне, бо ў маральнай тоеснасці паміж забойцам і ягонай ахвярай праглядваецца здзек з самой сутнасці маральнасці. Але на вайне няма забойцаў ці наадварот — на вайне ўсе забойцы. “Калі ты выбраў вайну, то гэта твая вайна”

(Жан Поль Сартр). І таму ўсё залежыць толькі ад тых абставінаў, у якія патрапіў чалавек. Той, хто апынуўся там, дзе даводзілася забіваць — забіваў. І ўся розніца паміж грэшным і нявінным у тым, што аднаму з іх пашанцавала не патрапіць туды, дзе ён вымушаны быў забіваць, а другому не пашанцавала, і ён забіваў (магчыма, таго, каму пашанцавала не забіваць). Кім стаўся для германцаў той беларус, які, перажыўшы акупацыю і партызанку, быў “завербаваны” ў савецкае войска і страляў немцаў на іх зямлі, бурыў ушчэнт Кёнігсберг і Берлін? Натуральна, што для паспалітых жыхароў Нямеччыны ён быў акупантам, ворагам, забойцам. Гэта ідэолагі прыхарошылі ягоную ролю паганскім словазлучэннем “святая помста”. Помста не бывае святой, прынамсі, яна перастала быць ёю з таго часу, як Ісус узышоў на Галгофу.

Вайна — гэта паганства, вайна — гэта вяртанне чалавека ў задушлівае лона першабога, жорсткага і помслівага. Як быццам не было дзвюх тысяч гадоў цярплівага гадавання этычнага імператыву, як быццам чалавек зноў вярнуўся ў сваю дагісторыю.

Партызаны, партызаны,
Беларускія сыны!
За няволю, за кайданы
**Рэжце** гітлерцаў паганых,
Каб не ўскрэслі век яны.

**Выразайце людаедаў,**
Каб не стала іх і следу.

**Рыйце загадзя магілы,**
**Вырывайце з жывых жылы,**
Кроў за кроў, а смерць за смерць!

**Янка Купала.**

(Тлустым вылучыў радкі — **В.А.**)

Ухваляючы збройны гераізм пераможцаў ці пераможаных, партызанаў ці калабарантаў, мы молімся цьмянаму першабогу з пажаднымі да крывымі вуснамі. На гэтым абагаўленні бога помсты і чалавечых ахвяраў і быў сфастрыгаваны савецкай ідэалогіяй міф пра Партызанскую Беларусь. Аднак, як гэта часта бывае ў гісторыі, падзея, што ладзіцца дзеля нейкіх адных мэтаў, неўзабаве ці пазней выяўляе сваю значнасць у радыкальна іншай перспектыве, часам зусім і не пажаданай для тых, хто яе зладзіў. Савецкія ідэолагі, якія *прыдумалі* гераічны беларускі народ, гатовыя пакласціся ўсім целам на ахвярнік камуністычнай ідэі, меліся на мэце гэтым міфам яшчэ раз сцвердзіць вартасць *сваёй* Ідэі, але ніяк не высокую вартасць беларускага народу, як апрычонага суб'екту еўрапейскай гісторыі... Ды атрымалася, што атрымалася...

У праблемы гераічнай беларускай партызанкі ёсць яшчэ адзін вельмі цікавы аспект. Згодна натуральнай логікі, гэты міф мусіў распушыцца ў нішто адразу пасля дэскрыдытацыі той ідэалогіі, што яго спарадзіла. Аднак нічога такога не здарылася (хаця на самым пачатку "дэмакратычных" дзевяностых гэты міф, відавочна, перажываў сур'ёзны крызіс). І зусім не таму, што ідэю "гераічнай партызанкі", амаль не трансфармуючы, неўзабаве прыўлашчыла пад свае патрэбы ідэалогія новай улады ўжо як бы незалежнай Беларусі. Сітуацыя бачыцца значна больш складанай. Тут найперш трэба звярнуць увагу на той факт, што "партызанка" ў тых жа самых формах і не з меншай актыўнасцю ладзілася і ва Украіне, і ў Прыбалтыцы, і ў Крыме, і на Каўказе, і ў самой Расеі, але ніводны з гэтых рэгіёнаў не стаўся "партызанскім краем", і ніводны з тых народаў не атрымаў мянушку "народ-партызан"...

Тут мы не ў стане заглыбляцца ва ўвесь абсяг гэтай

неверагодна цікавай тэмы, якая сёння так актыўна апрабоўваецца ў інтэлектуальнай эсэістыцы, маладзёвай музыцы і актуальным мастацтве, дзе “партызан” выступае адначасна як канцэптуальны персанаж і як канцэптуальная метафара. Таму адно мімаходзь заўважым, што для беларусаў панятак “партызан” ужо даўно набрыняў пэўным *сакральным* значэннем, якое не змагла спрафанаваць нават савецкая партызанка... “Партызан” ці не найлепей люструе нейкую анталагічную сутнасць беларуса, як у яго прыватным жыцці, так і ў яго пражыванні гісторыі.

Партызан — гэта той, хто ўвесь час хаваецца (хованкі — бадай адзіная нацыянальная гульня беларусаў), партызан — гэта той, хто заўсёды кажа пра сябе — “мяне няма”, партызан — гэта той, хто выяўляецца толькі ў момант дыверсіі, а потым зноў знікае ў адсутнасць самога сябе...

Хвала савецкім ідэолагам, што яны адчулі “анталагічную” сутнасць беларусаў і ў патрэбны для сябе момант скарысталіся ёю на ўсю ейную моц. Шкада толькі (і ганебна), што яны скарысталіся ёю гэтак вычварна, кінуўшы ў ненажэрную пашчу молаха *сваёй* партызанскай вайны сотні тысяч сапраўды *мірных* беларусаў.

**P.S.** У гэтым раздзеле цалкам застаўся па-за ўвагай феномен *нацыянальнай* партызанкі, якая пасля вайны часткова перарасла ў антысавецкую і доўжылася да пачатку пяцідзесятых гадоў. Безумоўна, гэта вельмі цікавая з’ява, але ў вялікім вымеры нацыянальнай гісторыі яна выглядае, з майго гледзішча, усяго толькі лакальнай падзеяй. Куды больш істотнай бачыцца праблема шырокай “калабарацыі”, хаця, па вялікім рахунку, “беларускі калабарант” тыпалагічна не розніцца ад “савецкага партызана”, таму асобна тут і не кранаўся*.

* Цікавую версію “калабарацыі і партызанкі” выказаў Васіль Быкаў у гутарцы з Юрасём Залоскам (“Рэцэпт напою багоў”): “Тое, што мы называлі калабарацыянізмам і калабарантамі і адпаведна да іх ставіліся, як цяпер бачыцца, было куды больш складаней. Існавалі і калабаранты, і калабарацыя — даволі значныя на Беларусі. Я заўсёды пра гэта гаварыў. Калі ў Беларусі было каля мільёну партызан, і яны ваявалі, дык з кім яны ваявалі? Гэта камуністы рабілі такую падмену, што, маўляў, партызаны ваявалі быццам з немцамі. На самой справе якія немцы — у той час як фронт стаяў пад Масквой?.. Немец быў у лепшым выпадку адзін на раён, у раённай адміністрацыі. З кім жа тады ваявалі шматтысячныя партызанскія арміі? Зразумела, з кім — з паліцэйскімі фармаваннямі, каторыя, як і партызанскія злучэнні, рэкрутаваліся з беларусаў альбо з суседзяў — літоўцаў ці ўкраінцаў. Гэта ж атрымалася абсалютна спантанна — Хатынь. Трагедыю Хатыні спрабавалі аднесці на рахунак немцаў, а папраўдзе яе спаліў канкрэтны 118 украінскі паліцэйскі батальён. Дык вось, што датычыць калабарацыі: прыблізна столькі ж, колькі партызан, было і калабарантаў. І тое, што тут адбывалася, мела ўсе прыкметы грамадзянскай вайны. Нямецкія рэгулярныя войскі ў гэтую справу ўлезлі тады, як фронт падышоў к Полацку. Тады яны акружылі і зліквідавалі ўсю партызанскую зону. “Прарыў” — гэта эўфемізм: разгром быў заменены на “прарыў”. Які прарыў? Прарваліся рэшткі... Немцы ўмелі гэта рабіць, гэта не Чачня, партызаны для іх не ўяўлялі ніякай небяспекі... Яны іх акружылі і задушылі меней чым за месяц. Рэшткі, каторыя прарваліся з блакады, пасля хаваліся ў Селіцкай пушчы, я пра гэта пісаў. У густых хвойках яны прывязваліся рамянямі да вершалін і там сядзелі. Ды немцы пусцілі сабак, каторыя аблайвалі дрэвы. Немец падыходзіў і даваў уздоўж ствала некалькі чэргаў... Пасля вайны, у 1947 годзе, калі я прыязджаў на радзіму, на тых хвойках яшчэ бялелі партызанскія косці, абгладаныя вараннём...”

## 12. УРБАНІЗАЦЫЯ

Гісторыя Беларусі ў XX стагоддзі збольшага ўкладваецца ў некалькі словаў: Вайна, Саветызацыя, Індустрыялізацыя, Урбанізацыя, Меліярацыя, Чарнобыль, Незалежнасць. Але за кожным з гэтых словаў стаяць амаль апакаліптычныя падзеі, нават калі йдзецца пра такую мірную справу, як меліярацыя. Бо пасля глабальнай меліярацыі ў нас няма і ўжо ніколі не будзе той краіны, якую Багушэвіч калісьці назваў жаночым імем Беларусь...

Каб ператварыць жывую зямлю ў тапаграфічную мапу, толькі ў 1976 годзе штодня ўлягаліся ў працу 11 тысяч трактароў, больш як 3 тысячы экскаватараў, амаль 3 тысячы бульдозераў і безліч іншай тэхнікі. Ніякі землятрус не змог бы нагэтулькі змяніць ландшафт Беларусі, як змяніла яго меліярацыя. Раней сарамліва схаваная за хмызамі, балацінамі і купамі дрэваў краіна выгалілася да небакраю, зрабілася адкрытай і плоскай, як планшэт, на якім пад транспарцір накрэсленыя прамыя лініі канаваў.

Але ж ці толькі ландшафт зрабіўся іншым? Меліярацыя не былаадно касметычнай дзеяй, гэта была аперацыя па змене, калі можна так сказаць, полу краіны. Пасля гэтай тэхналагічнай інтэрвенцыі Беларусь развіталася са сваёй вільготнай, заблукалай у самой сабе, жаночай сутвай і, грукаючы жалеззем, рушыла напрасткі ў “фалацэнтрычную” будучыню.

Натуральна, меліярацыя сталася не адзіным чыннікам тых ”фалацэнтрычных” пераменаў, што адбыліся ў Беларусі (і з Беларуссю) цягам ХХ стагоддзя. Яна, як і урбанізацыя (і як індустрыялізацыя ва ўсім сваім цэлым), толькі дадатна засведчыла, што Беларусь падхапіў агульны “цывілізацыйны майнстрым”, ад якога яе не змагла адлучыць нават татальная саветызацыя краіны.

Дарэчы, што да нашай рэспублікі, дык саветызацыя тут хутчэй наадварот максімальна паспрыяла разгортванню мадэрнізацыйных працэсаў. Пасля таго, як XIV з’езд ВКП (б) (снежань 1925 года) абраў курс на сацыялістычную індустрыялізацыю, тэмп развою Беларусі ў прамысловасці цягам першых трох пяцігодак амаль удвая пераўзыходзіў сярэднесаюзныя паказчыкі. Але прыкладна так было і потым, аж да распаду Савецкага Саюзу, за выключэннем адной сямігодкі (1959—1965), калі мы не апярэджвалі агульнасаюзных тэмпаў.

Зразумела, што сістэмны тэхнакратычны прарыў не мог быць абумоўлены выпадковым збегам акалічнасцяў. Беларусь і

ўсім сваім еўрапейскім прамінулым, і той сваёй сучаснасцю, з якой яна сустракала XX стагоддзе, патэнцыйна была падрыхтаваная да цывілізацыйнага лідэрства (супольна з мегаполісамі Масквы і Ленінграда) у адной з дзвюх супердзяржаваў другой паловы таго ж стагоддзя.

Дарэчы, гэта быў не першы выпадак, калі нам даводзілася выконваць падобную ролю. Згадаем хаця б ВКЛ у пару "залатога веку". Тады нашыя продкі былі цывілізацыйным лідэрам ва ўсім *кірылічным свеце*, забяспечваючы гэты свет супермадэрновай на той час друкаванай прадукцыяй і самымі сучаснымі тэхналогіямі па яе вырабе.

Магутным фактарам паскарэння цывілізацыйных працэсаў сталася і само геапалітычнае месца Беларусі. Усю гэтую прастору ў XX стагоддзі скалануў глабальны "камунікатыўны выбух" (Філіп Брэтон, Серж Пру), і яго магутная хваля накрыла разам з цэнтральнай Еўропай і Беларусь, між іншым, ужо загадзя падрыхтаваную да гэтай "апакаліптычнай" падзеі. Яшчэ напрыканцы XIX стагоддзя тэрыторыя Беларусі была спрэс пакрытая сеткай чыгунак, якія інтэнсіўна злучылі яе з усімі краінамі еўрапейскага кантыненту (на тую пару агульная працягласць чыгунак па тэрыторыі Беларусі складала, лічы, 3000 вёрст). Станоўчую ролю тут адыграла і процістаянне Расеі і Еўропы, якія скарыстоўвалі топас Беларусі для прасоўвання (адзін супраць аднаго) сваіх інфармацыйна-камунікатыўных патокаў.

Тое, з якой хуткасцю і з якім плёнам наўсцяж вясковая нацыя засвоіла тэхналогію індустрыяльнай цывілізацыі, не можа не выклікаць здзіўлення і сведчыць пра моцную генетычную памяць народу, які ў лепшыя для сябе часы гэтак актыўна выяўляў здольнасць да самых розных інавацыяў... Але самой вёсцы гэты тэхнакратычны прарыў дорага каштаваў — яна цалкам страціла сваю сацыяльную і культурную актуальнасць.

Беларуская вёска сфармавала этнічны грунт, дала нацыі

мову, эстэтычны канон і этычны кодэкс... Нават некалькі першых пакаленняў палітыкаў, навукоўцаў і дзеячоў культуры ўжо спрэс індустрыялізаванай Беларусі былі адтуль, “з-пад саламяных стрэх”. Аднак тры катастрофы запар, кожная апакаліптычнага памеру, амаль ушчэнт разбурылі вёску. Кажучы пра катастрофы, я маю на ўвазе індустрыялізацыю, калектывізацыю і урбанізацыю. Апошняя давершыла працэс разбурэння — горад, як біблейны кіт Іону, праглынуў знямоглую вёску.

Праўда, мы памятаем, што Іона выйшаў з чэрава кіта адноўленым і духоўна, і фізічна. Бадай, нешта падобнае робіцца і з вёскай. Тут, у горадзе, згуртаваная горадам, яна даводзіць да ладу тое, чаго не магла зрабіць, калі была раскіданая па пясчаных выспах, заслоненых адна ад адной хмызам і туманамі — завяршае працэс кансалідацыі беларусаў і фармалізацыі іх уласнай дзяржавы.

Метафара, хай сабе і біблейная, усяго толькі паэтычны троп. Але ў нашым выпадку паэтычная метафара грунтоўна ўцялесненая ў рэальнасць, за што сведчыць такая, досыць дакладная навука, як сацыялогія. Толькі паміж 1950 і 1970 гадамі колькасць гарадскога насельніцтва ў Беларусі ўзрасла на 57% і пераважна за кошт беларускіх вяскоўцаў, якія ў сярэдзіне сямідзесятых гадоў ужо склалі палову гарадскога насельніцтва, а горад на той час увабраў у сябе больш за палову насельніцтва рэспублікі. І што яшчэ больш істотна, упершыню ад XVII стагоддзя горад зноў робіцца пераважна беларускім. Нагадаем яшчэ раз, што згодна перапісу 1897 году, у гарадах і мястэчках Беларусі жыло толькі 17,1% беларусаў (тут дамінавалі габрэі — 57,5%). А вось дынаміка росту беларусаў сярод гарадчукоў у БССР: 1926 г. — 39,3%, 1959 г. — 67,0%, 1970 г. — 69,3%, 1979 г. — 71,5%. (Бадай кожнаму зразумела, што пакуль беларускае места не сталася пераважна *беларускім*, ні пра якую нацыю, а тым болей пра нацыянальную дзяржаву, не магло быць і гаворкі).

Вышэй ужо не аднойчы казалася, што для паўнавартаснага паўставання нацыі (прынамсі, у яе кананічным разуменні) неабходныя шматлікі сярэдні клас, добра капіталізаванае грамадства і ладна урбанізаваны соцыум.

Дык вось, гэтую "класічную трыяду" ў яе завершаным выглядзе беларусы склалі адно ў сярэдзіне XX стагоддзя. Праўда, "класічнай" і "завершанай" яе можна лічыць толькі ў тым выпадку, калі мы пагодзімся на месца "шматлікага сярэдняга класу" паставіць "шырокія масы савецкай інтэлігенцыі" (кожны чацвёрты працаўнік рэспублікі ў гэтую пару быў звязаны з разумовай працай), а на месца "капіталізаванага грамадства" — "грамадства, індустрыялізаванае на савецкі лад".

Адсюль вынікае, што толькі ў згаданую пару Беларусь рэальна займела ўсе соцыа-эканамічныя падставы, каб фармалізавацца як паўнавартасная нацыя. Аднак гэтага не адбылося. І мы ўжо ведаем чаму. У смяротным двубоі нацыяналізму з камунізмам у Беларусі татальна перамог апошні і амаль да тла згамаваў усё ўласна нацыянальнае: ад гісторыі да культуры і мовы.

Далей мы яшчэ вернемся ў гэтую сітуацыі, бо менавіта на ёй закрываецца перспектыва "моўна-этнічнай" мадэлі для нацыянальнага ўладкавання Беларусі, і... адкрываецца перспектыва Беларусі, як "грамадзянскай супольнасці". А скончыць гаворку пра урбанізацыю будзе лагічна тэмай "сталіцы", на якую ў Беларусі чамусьці амаль не звяртаюць увагі, хаця сталіца зазвычай адыгрывае досыць значную ролю ў фармаванні Нацыі, але яшчэ больш істотную — у паўставанні Дзяржавы.

Выключная роля сталіцы ў нашым кшталце цывілізацыі абумоўленая тым, што да самага апошняга часу прасторавае ўладкаванне соцыуму мела ў сваім подзе выразна цэнтрапалеглую (і, адпаведна, логацэнтрычную) канструкцыю, пры якой сталіца арганізоўвала і структуравала ўвесь топас

бытавання чалавека як дадатак да самой сябе. У такой пабудове велічыня цэнтру вызначала памеры перыферыі. Чым больш магутным быў цэнтр, тым шырэй разгортвалася перыферыя і тым далей адсоўвалася мяжа, як месца страты цэнтрам самога сябе. Ці была б магчымай Вялікая Рымская імперыя з заканадаўчым мястэчкам на ўскраіне ўладнага дыскурсу? І таму, як толькі заняпаў Вялікі Рым, згарнулася амаль у нішто ўся імперыя. У гэткім тыпе цывілізацыі без вялікай сталіцы можна было заваяваць палову свету, як тое зрабіў Аляксандр Македонскі, але на другі дзень пасля сыходу войскаў ад усіх заваёваў заставаўся толькі міф (аналагічны выпадак — гісторыя збройнай экспансіі манголаў).

Геапалітычная трагедыя Беларусі і беларусаў (крэваў, ліцвінаў, русінаў), верагодна, і паходзіць перадусім з таго, што прастора іх бытавання не была ўцэнтраваная і з гэтага канструктыўна структураваная Вялікай сталіцай. Не ў пару занядужаў Полацк, не акрыяў у сапраўдную моц Наваградак, зашылася ў перыферыю (адносна ўсёй поліэтнічнай прасторы) Вільня.

Калі па вялікім рахунку, дык наш край ніколі і не меў сапраўднай сталіцы, як цэнтру ўлады на ўвесь падлеглы ёй абшар. Тыя месцы, што пазначаліся як цэнтр, сутнасна, ды і зместам, амаль не сягалі за меру намінатыўнага, аб чым, апрача іншага, сведчыць надзвычай важкая роля беларускага мястэчка ў кожную гістарычную пару. Феномен беларускага мястэчка, пэўна, і тлумачыцца тым, што ў нас мястэчку трэба было брацца да выканання многія функцыі, якія ў іншых краінах звычайна выконвае “цэнтр”.

Найбольш наглядна аблуду намінатыўнасці люструе Вільня — горад-падман, горад-пастка, фатальны для беларусаў горад.

Вільня стагоддзямі спакушала беларусаў надзеяй, што ў

гэтых мурах і мураванках яны маюць сваю сталіцу, і нашыя лепшыя людзі ва ўсе тыя стагоддзі спрабавалі знайсці саміх сябе на яе вулках — Скарына, Міцкевіч, Купала... (мноства). Але хутка пачыналі разумець усю аблуду гэтага абыякавага да беларусаў места і кідаліся прэчкі. А каму не патрапіла ў пару знікнуць, як Каліноўскаму ці Аляхновічу, ападалі тут мёртвымі на дол.

Няма Менску, апрача Менску. У 1918 годзе Менск у якасці цэнтру этнанацыянальнага дыскурсу мог яшчэ падацца за выпадковасць хаця б таму, што разам з ім у гэтым значэнні спрабавалі здзейсніцца іншыя месты (Смаленск, Слуцак, Горадня, тая ж Вільня), але сёння ўжо можна здагадацца: нідзе, апрача як тут, на берагах цяпер зніклай Нямігі, не магла быць аб'яўленай і спраўджанай БНР, пасля БССР, а цяпер Рэспубліка Беларусь; нідзе яшчэ, як тут, распушчаны па вёсках і мястэчках дух (эйдас, геній) нацыі не змог бы сабрацца ды настала атабарыцца і тым самым перапыніць бясконца-бязмэтнае валацужніцтва сталіцы Беларусі паўз перыметр краіны...

Нарэшце этнанацыянальная прастора намацала і зацвердзіла сярэдзіну самой сябе!.. З чаго адразу паўстала раўнаважнасць раней незбалансаванага змесціва, якое з гэтага моманту даволі хутка пачало набываць уласную форму праз крышталізацыю структуры, абумоўленую ўзаемадачыненнямі цэнтру і перыферыі. Апошняму істотна спрыяў і той факт, што цэнтр (Менск) апынуўся ў сітуацыі роўналежнасці да ўсяго дыскурсу перыферыі. Сёння прасторавая фігура Беларусі, у плане маштабавай сумернасці цэнтру з ягонымі перыферыямі, выглядае адной з самых згарманізаваных у Еўропе.

Беларусь, як цэльнае культурнае, эканамічнае і палітычнае ўтварэнне, немагчымая без фармуючага гэтае ўтварэнне Менску. Але тут адразу ўзнікае пытанне: а ці магчымы Менск (скажам, як Вільня) без Беларусі? Ці верагодны быў Менск у цэнтрапалеглым

значэнні і наканаванні раней, чым з крэваў, русінаў, ліцвінаў, яцвягаў ды іншых не адбыліся тыя, каго мы цяпер называем беларусамі, не адбылося тое, што мы цяпер пазначаем словам Беларусь?

Верагодна — не! Без Беларусі не было б Менску (у ягонай цяперашняй ролі), але без Менску не было б і Беларусі, як суверэннай дзяржавы.

Менск — сталіца Рэспублікі Беларусь!

## 13. РЭВАНШ НАЦЫЯНАЛІЗМУ

Распад кожнай вялікай імперыі надзвычай актуалізуе праблему стаўлення кожнага з яе адпалых фрагментаў да былой “метраполіі”, гэта значыць да таго, што палягала ў цэнтры імперыі, было яе фармастваральным чыннікам. У выпадку з распадам камуністычнай імперыі перадусім паўстала задача ацэнкі камунізму як такога, і ў прыватнасці — камуністычнай ідэі ды адпаведнай ідэалогіі. Няма нічога дзіўнага, што пастскрыптум камуністычная ідэалогія і практыка былі азначаныя ў цалкам негатыўным вымеры, іначай — як “імперыя зла”. Для такой паэтычнай высновы хапала і рэальных фактаў — гісторыя людства не ведала, каб дзе і калі гэтак татальна рэпрэсаваўся і масава зніштажаўся чалавек. Але спадыспаду супольнага рэзюме праглядаўся і даўні канфлікт помстаў: яшчэ нядаўна спрэс пераможаны, але раптам перамогшы нацыяналізм жорстка помсціў камунізму праз гранічна адмоўнае вызначэнне яго месца і ролі ў гісторыі.

У крызе, а затым і татальнай паразе камунізму ёсць яшчэ адзін досыць цікавы момант, дзе варта было б некалі грунтоўна абсведзецца. А менавіта: калі, з чаго і ў які момант камуністыч-

ная ідэя, якую Расея падахвоцілася рэалізоўваць на практыцы, ператварылася ўсяго толькі ў інструмент расейскага нацыяналізму дзеля ягонай экспансіі на ўсю зямную кулю?

Бо насамрэч нацыяналізм перамог імперыю камунізму не пасля распаду апошняга на мноства нацыянальных дзяржаваў, а значна раней, яшчэ ў тую пару, калі сфармаваўся і запанаваў прыярытэт "рускага" над "камуністычным" — спачатку ў самой Расеі, затым у Савецкім Саюзе, а пасля і ва ўсім камуністычным блоку. Словы "рускі" і "камуніст", "рускае" і "камуністычнае" ("савецкае") пакрысе сталіся сінонімамі з тэндэнцыяй да замацавання "расейскага" на ўсім "камуністычным". І ці не тут, ці не ў гэтым дамінаванні латэнтна ўгрунтаванага *рускага нацыяналізму* ў толькі фармальна прэзентаваным камунізме і ёсць сапраўдная прычына сістэмнага крызісу і пазней татальнай паразы камуністычнай ідэі? Зусім верагодна, што менавіта так. (Між іншым, праз вышэй названую глабальную метамарфозу для камунізму адбылося і нешта значна горшае за паразу — яго канцэптуальная дыскрэдытацыя).

З папярэдне сфармуляванага вынікае, што ў кожнага чальца былой камуністычнай імперыі пасля пераацэнкі камуністычных каштоўнасцяў мусіла адбыцца і рэвізія свайго стаўлення да Расеі і ўсяго расейскага як такога. Натуральна, не маглі ўнікнуць падобнай працэдуры і мы. Тым болей, што праблема "Расеі" для нас заўсёды была абцяжараная эсхаталагічнымі канатацыямі. (Ды і зараз на яе асялку ўсё яшчэ вагаецца нашае "быць ці не быць" — этнасу, нацыі, дзяржаве.)

## 14. РАСЕЯ І МЫ

Сказаць, што для Беларусі "праблема Расеі" сягае ў сівую даўніну,— значыць нічога не сказаць. Верагодна, мы з ёю і

нарадзіліся, як бывае нараджаецца чалавек з нейкай генетычна абумоўленай апрычонасцю, якая ў такім выпадку становіцца ягонай нормай. І трэба ясна ўсведамляць, што выдаліць з сябе гэтую праблему ў нас ніколі не атрымаецца, нават калі знадворку Расея перастане адыгрываць хоць-якую ролю ў нашым лёсе. Бо Расея не на ўсход ад земляў Беларусі, Расея — *усход* Беларусі. Гэта значыць, што Расея пэўным сваім контурам (як і Еўропа) *натуральна* знаходзіцца ўнутры нашай уласнай самасці.

Але было б вялікай памылкай лічыць, што з гэтага мы часткова “Расея”, а часткова “Еўропа” (ці хай сабе нават сума папярэдніх складнікаў)… Ні першае, ні другое, ні трэцяе…

Мы — беларусы. Іншымі словамі, у нечым надзвычай істотным мы рашуча адрозныя ад усіх астатніх (як і ўсе астатнія міжсобку). І складнік “Расеі” ў самасці беларусаў ёсць якраз адным з чыннікаў нашай адрознасці. Дарэчы — у першую чаргу ад непасрэдна Расеі.

Апошняе зусім не ёсць парадоксам. Гэтаксама “Азія”, “азійства” ў целе Расеі не набліжае Расею да ўласна Азіі, а перадусім адсланяе — у супраціўным экспансіянізме і непераадольным антаганізме.

Хапала і ў нас гэтага “экспансіянізму і непераадольнага антаганізму”. Ні з кім нашыя продкі столькі не ваявалі, як з тымі, каго сёння мы называем расейцамі. Толькі ў сярэдзіне XVII стагоддзя падчас “крывавага патопу” ў вайне, арганізаванай “маскалямі”, загінуў *кожны другі* жыхар нашага краю — было 4,9 мільёны, засталося 2,5. (Між іншым, цягам вайны з нямецкім фашызмам, якая чамусьці лічыцца самай крывавай у нашай гісторыі, загінуў *кожны чацвёрты* беларус...)

…Тады і пагасла сонца над Вялікай Літвой і ўзышло над Вялікай Расеяй.

Вядома, і да гэтай падзеі ў расейцаў (маскоўцаў) ужо была

ідэя Трэцяга Рыму і Града Божага на зямлі, але канчатковае замацаванне ў расейскай свядомасці сваёй месіянскай ролі адбылося не раней, чым Юры Пераможца на ўздыбленым кані працяў дзідай сэрца Рэчы Паспалітай і двухгаловы арол распасцёр крылы над усёй Усходняй Еўропай.

“Я памятник себе воздвиг нерукотворный...”, і далей самы вялікі паэт тады яшчэ маладой і пасіянарнай імперыі пералічвае пабраныя народы, што прыйдуць схіліцца перад ягоным помнікам за тыя добрыя пачуцці, якія ён лірай абуджаў у сэрцах людзей.

“Я не паэта, о крый мяне Божа...”, і далей пра тое, што паколькі беларусы нікога не маюць, дык хай будзе хаця б Янка Купала.

У гэтых “помніках” двух нацыянальных геніяў куды больш сугестыўна, чым у лічбах, прачытваецца адказ на пытанне: каму якімі здабыткамі ды стратамі (фізічнымі і духоўнымі) адгукнулася эпоха тых апакаліптычных войнаў.

Гэта надзвычай істотны момант, на які ніколі не варта забывацца, бо менавіта на памянёных “здабытках” (расейцы) і “стратах” (беларусы) далей будуць фармавацца (у супрацьлеглых вектарах) ментальнасці рускага і беларускага чалавека.

Верагодна, тут нехта заўважыць, што не зусім слушна (а можа, і зусім не слушна) звязваць выспяванне этнічнага светагляду з канкрэтнымі гістарычнымі падзеямі. Я і сам гэтак мяркую, але ў дадзеным выпадку мне падаецца досыць верагодным, што катастрафічны вынік супрацьстаяння з Расеяй шмат у чым паспрыяў замацаванню ў свядомасці беларусаў філасофіі стыхійнага фаталізму.

Фаталізм глыбока індывідуалістычны светапогляд, ён вымагае не толькі добраахвотнага падпарадкавання фатуму (кону), даверлівай згоды з тым, што ёсць і якім яно ёсць, але і тоеснасці суб’екту з самім сабой. На апошняе трэба звярнуць

асаблівую ўвагу, паколькі сэнсавы цэнтр беларускага варыянту фатальных стасункаў з рэальнасцю менавіта тут. Імкненне да тоеснасці з самім сабой, да не-выхаду за межы гэтай тоеснасці ў вонкавы, духоўна іншы кантэкст, сталася вызначальным у светаглядзе беларусаў.

Але вызнаючы істотную ролю "крывавага патопу" ў рассыпанні беларусаў на адзінкавыя саматоеснасці, пагодзімся, што гэтаму спрыяла і *ўся астатняя гісторыя* краю. Беларусь ужо ў пару фармавання ВКЛ была шматрэлігійным і шматканфесійным краем. Які агульны сабор (і якая саборнасць) можа быць у праваслаўных, уніятаў, каталікоў, пратэстантаў, іудзеяў, мусульманаў, паганцаў?.. І якую "абшчыну" з іх можна скласці, калі яны і працуюць, і святкуюць у розныя дні, да таго ж робяць усё гэта кожны па-свойму.

Істотна паўплываў на дэкалектывізацыю і такі сацыяльны феномен, як беларуская шляхта. Па некаторых ацэнках навукоўцаў, яе колькасць сягала больш за 10% ад агульнага складу насельніцтва. Натуральна, у абсалютнай сваёй большасці шляхта была "дробнай", збяднелай і матэрыяльна часам амаль не рознілася ад сялянаў, аднак пры гэтым радыкальна асобілася і ад простага люду, і паміж сабой. І хаця ў фармаванні ўжо ўласнабеларускага этнасу шляхта, лічы, не ўдзельнічала, але ў фактары сацыяльнай дэкалектывізацыі яе роля была досыць значнай.

Дарэчы, знакамітая беларуская "талака" сведчыць якраз не за калектывізм, а зусім наадварот. Разбэрсаныя рэлігійна і сацыяльна людзі сыходзіліся разам на дзень-другі, каб зладзіць непад'ёмную для кагосьці аднаго справу, і зноў разбрыдаліся кожны ў сваю паасобкавасць. Гэтую сітуацыю не перамяніла і прымусовая калектывізацыя, якая толькі фармальна паяднала натуральна раз'яднаных паміж сабой беларусаў.

Таму Беларусь для беларусаў і па сёння задзіночваецца ў

кансалідаванае цэлае толькі (і выключна) праз інстынкт тэрыторыі, а не праз ідэю калектыўнага “я”.

Усё радыкальна інакш у расейцаў. У анталагічным сэнсе паміж беларусамі і расейцамі — ментальная бездань. Расейцы ніколі не ведалі (і не шукалі) сваіх “этнаграфічных межаў”, ды і ўвогуле не былі прывязаныя да хоць якога пэўнага месца на зямлі (не лічыць жа такім неабсяжную і амаль умоўную прастору “ад Брэста да Камчаткі”). Наўрад ці хоць у які перыяд Расейскай імперыі расейскі шараговец больш менш дакладна і тым больш сістэмна ўяўляў яе геаграфічную фігуру. Праблема ўласнай геаграфічнай прасторы паўставала перад ім толькі ў момант чарговага ваеннага канфлікту, звязанага з абаронай ці пашырэннем межаў імперыі. (“Расея, як вядома, вяла ў XVIII—XIX стагоддзях трыццаць тры вайны, галоўным чынам захопніцкіх”. Генры Мілер.) А ў астатнюю пару яму дастаткова было ведання пра цэнтр улады і яе персаналізаванае імя (месца імперыі знаходзіцца не ў дыскурсе топасу, а ў дыскурсе ўлады). Зрэшты, у іншым выпадку (лакалізаваная канкрэтным топасам), “руская ідэя” ніколі б не набрыняла месіянізмам, і “сабор” не ператварыўся б са звычайнай культавай забудовы на пагорку ў “саборнасць”, як патэнцыйную (віртуальную) тэрыторыю для Града Божага на зямлі.

“Да д’ябла ўсе! Расея апрычоны свет” — гэтая версіфікацыя Пагодзіна на тэму чаадаеўскага азарэння засведчыла, што ў расейскім грамадстве сакральная ідэя месіянства ўжо на пачатку XIX стагоддзя скаланізавала і прастору прафаннага. Таму далей на яе аднолькава будуць абапірацца ў сваім адбыванні быццям што звычайны шараговец, што апрычоны інтэлектуал: “Расея — адметная краіна, не падобная ні на якую краіну свету” (Бярдзяеў).

Расея не Азія, Расея — не Еўропа, Расея — сёмы мацярык, адным словам, “адметны” ад усіх астатніх свет.

Падазраваць місію Расеі, як вызначальную для лёсу ўсяго

чалавецтва, пакрысе сталася натуральна і нават “обыденно” для рускай свядомасці. “Мала таго — за ёю (Расеяй — **В.А.**) прытоена нейкая Боская задума, ад якой мы не маем права адмовіцца і ад якой мы не здолелі б адмовіцца, нават калі б гэтага захацелі...” (І. Ільін).

## 15. ФРАНЦІШАК БАГУШЭВІЧ І АДАМ МІЦКЕВІЧ

Камуністычная ідэя, безумоўна, была Боскім дарункам Расеі ў яе месіянскім рушэнні, якому распад дынастычнай (манархічнай) дзяржавы пагражаў татальным заняпадам. Болей за тое, яна (камуністычная ідэя) надала новай энергіі і паскоранай дынамікі гэтаму рушэнню, у якое апынулася ўцягнутай і Беларусь.

Тое, што ўнёсак Беларусі (і беларусаў) у інтэрвенцыі камунізму як на іх уласную прастору, так і на прастору ўсяго сусвету апынуўся досыць ладным, зусім не азначае, што яны ў гэтай падзеі выконвалі *сваю* ролю. Праз прылучэнне да экспансіі камунізму на ўсю зямную кулю беларусы кампенсавалі для сябе адсутнасць той *высокай* Беларусі (Вялікай Літвы), якой пазбавіў іх неміласэрны лёс (ці мілажальны кон?). Гэты момант мне бачыцца досыць істотным, таму паспрабуем разгарнуць яго ў некалькіх перспектывах.

Паўсталая ў разрыве гістарычных дыскурсаў, на тэрыторыі “татальнага мораку” XVIII—XIX стагоддзяў, этнічная Беларусь ні ў адной са сфераў улады не мела не толькі ўласных элітаў, але нават легітымных (замацаваных непасрэдна за ёй) каналаў, па якіх яе “агенты” маглі патрапіць у хоць якія ўладныя структуры. На тую пару ўся наяўная Беларусь цалкам магла быць апісанай у “нізавой” мадэлі. Гэтую сітуацыю і зафіксаваў Францішак Багушэвіч, стварыўшы сваю Беларусь паводле формы паэтычнага міфу, цалкам закааптаванага ў под сацыяльнага

быцця.

А далей заўважым, што прыдуманая паэтам краіна гнілых хатак і дурных, як варона, мужыкоў займела дзіўны — фантастычны лёс. Усе наступныя генерацыі і пакаленні беларускіх паэтаў, краязнаўцаў, публіцыстаў, якія і сфармавалі ідэалагему нацыі (прымроілі яе ў газетах і кніжках, з чаго я неяк і назваў беларусаў “папяровай нацыяй”), пачыналі і завершвалі афармленне свайго відзежу Беларусі ў фармаце таго паэтычнага міфу, які распавёў напрыканцы XIX стагоддзя адвакат з Вільні. Гэта з ягонай прыдумкі з’явіліся і знямоглыя беларусы, што нясуць на худых плячах сваю гаротную долю (Янка Купала), і “пяць лыжак заціркі” ў прыклад самай вялікай мары тутэйшага чалавека (Змітрок Бядуля), і *лапаць* дзеда Талаша, як адзіная аўтэнтычная зброя гераізаванага беларуса (Якуб Колас), і каўтун на галаве палешука, як нацыянальная адметнасць, і гнілое балота, як конгеніяльны нішчымнай долі пейзаж...

Першым паўстаў супраць татальнай экспансіі “нізавога” міфу Вацлаў Ластоўскі, стварыўшы насупраціў Багушэвічу міфалагему магутнай “крыўскай цывілізацыі”, як папярэдніцы і крыніцы не толькі народа беларусаў, але і антычнага свету (ні больш, ні менш!). Міф Ластоўскага займеў досыць шырокі розгалас і папулярнасць (асабліва ў Заходняй Беларусі і на эміграцыі ў 30-50-я гады XX стагоддзя), але так і не здолеў заняць цэнтрапалеглага месца ў свядомасці беларускага грамадства. Былі і іншыя спробы супраціву, згадаем хаця б знакамітае эсэ Ігната Абдзіраловіча (Канчэўскага) “Адвечным шляхам”, дзе філосаф запрапанаваў сінтэтычна складаны, але інтэлектуальна вельмі адметны вобраз Беларусі.

Аднак усё было марна. Міналі дзесяцігоддзі і дзесяцігоддзі, Беларусь зрабілася індустрыяльнай краінай, прыдбала сабе міжнародны імідж нязломнага змагара з фашызмам, патрапіла ў заснавальнікі ААН, пачала экспартаваць тавары па ўсёй зямной

кулі (да прыкладу, толькі трактары — у восемдзесят краінаў), цалкам мадэрнізавала лад свайго жыцця па максімуму тэхнакратычных магчымасцяў адной з дзвюх супердзяржаваў свету, але да 70-х гадоў XX стагоддзя (да Уладзіміра Караткевіча) гэты міф пра адвечна занядбаную, змарнелую і нішчымную Беларусь, які апанаваў нацыянальную свядомасць, ніхто нават і не спрабаваў пераадолець.

Чаму, з чаго гэткая трывушчасць аднойчы *паныла* вымаўленага слова “Беларусь”? Адказаў на гэтае запытанне ўжо ж, напэўна, можа і павінна быць шмат. Мы тут звернем увагу толькі вось на што: міф Багушэвіча апынуўся ўніверсальна прыдатным для самых розных ідэалагічных і палітычных сітуацыяў ад прыканца XIX і наўсцяж усяго XX стагоддзя (ён і сёння, на пачатку ўжо трэцяга тысячагоддзя, па сутнасці, дамінуе). Спачатку прыдумка Багушэвіча ў самую дакладную меру прыклалася да ідэалагічных інавацыяў дэмакратаў (і стыхійных, і сістэмных) канца XIX — пачатку XX стагоддзя, якія заангажаваліся “маленькім чалавекам” у стане сацыяльнай няроўнасці; затым казка пра згалелы край і прыгнечаны народ як найлепей дапасавалася да аргументацыі бальшавікоў (і ўсіх “левых” увогуле) на карысць рэвалюцыйных пераменаў. Але найбольш цікавае пачалося потым, калі бальшавікі перамаглі і з гэтага ім спатрэбілася дэманстрацыя плёну сваёй перамогі на прыкладзе канцэптуальных пераменаў да лепшага ў Беларусі. Пра тое, як Беларусь за камуністамі адужала, расквітнела, збагацела, спявалася штодня з ранку да вечару, толькі нейкім цудам атрымлівалася, што гэтыя хваласпевы аніяк не кранулі Багушэвічавага міфа. Як лёг, так непарушным і ляжаў на ўсе шыркі свядомасці.

Аб некаторых прычынах гэтага феномену за бальшавікамі мы, па сутнасці, нядаўна казалі. Ужо з трыццатых гадоў (XX стагоддзя) расейскі нацыяналізм пакрысе, як іржа, пачынае

выядаць сэрцавіну камунізму (неўзабаве ад апошняга застанецца толькі маска) і неўпрыкмет вяртаць свае пазіцыі ў “нацыянальных ускраінах”. Зразумела, што новаму расейскаму нацыяналізму (гэтаксама, як і ранейшаму), зусім не патрэбная была Беларусь, выяўленая ў высокіх парываннях, учынках ды мэтах. З гэтага ўсё *высокае і значнае*, што тут было раней і адбывалася цяпер альбо выкрэслівалася да пустога знаку, альбо залічвалася на супольны рахунак камуністычнай імперыі, каб потым быць прыўлашчаным Расеяй, як сваё ўласнае. Таму ў астачы беларусам заставаўся ўсё той жа “нізавы” Багушэвічавы міф з адзіным, хіба, дадаткам — рэвалюцыйнай постаццю Кастуся Каліноўскага. Да таго ж гэты міф, як стратэгічна найлепшы сродак у барацьбе з беларускім нацыяналізмам, увесь час перманентна актуалізоўваўся праз самыя розныя ідэалагічныя маніпуляцыі.

Не думаю, што выкладзеныя тут развагі нават збольшага вычэрпваюць праблему. Толькі з усяго гэтага, прынамсі, для мяне асабіста, становіцца зразумелым, чаму міф пра *высокую* Беларусь, які яшчэ да Францішка Багушэвіча стварыў Адам Міцкевіч, застаўся беларусамі незапатрабаваным. Праўда, Міцкевіч сваю краіну называў не Беларуссю, а Літвой і пісаў па-польску. Але, па сутнасці, ён усё жыццё толькі і рабіў, што перакладаў Беларусь на польскую мову (“Дзяды”, “Пан Тадэвуш” і г.д.)...

І *як* радзіма наваградскага паэта не падобная да той, якую намаляваў нам паэт з Кушлянаў!

Беларусь Міцкевіча — гэта краіна прыгожых жанчын і гераічных мужчын, высакародных шляхцічаў і самаахвярных святароў, вялікіх паэтаў і апантаных містыкаў... Тут пануюць высокі дух і чыстыя парыванні, і таму ідэя новага месіянізму, прапанаваная Еўропе паэтам-містыкам з нашых краёў, зусім не выглядала авантурай на злом галавы, прынамсі, у тым этычным

кантэксце, які ён сам і стварыў. (Гэтаксама як некалі потым не выкліча пярэчанняў і тыпалагічна падобнае цверджэнне Уладзіміра Караткевіча — “На Беларусі Бог жыве”, уся творчасць якога, у пэўным сэнсе, ёсць адмысловым перакладам Міцкевіча ўжо на беларускую мову).

Дарэчы, лёсы Міцкевіча і Багушэвіча на дзіва падобныя. Абодва са збяднелай шляхты і прыкладна з аднолькавай адукацыяй. У кожнага на шляхах жыцця Вільня, Санкт-Пецярбург, паўстанне, эміграцыя, і кожны з іх прыдумаў літаратурную версію Беларусі, толькі Міцкевічаву Беларусь назвалі Польшчай, а Багушэвічава *сталася* Беларуссю.

Дык вось, вяртаючыся да пытання, чаму той гожы міф пра Беларусь, які так паэтычна сфармуляваў Адам Міцкевіч, не быў запатрабаваны на ягонай Бацькаўшчыне *ні адразу, ні потым*, мы знаходзім адказ, які, па сутнасці, ёсць люстраным адбіткам феномену трываласці таго міфу, што стварыў Багушэвіч.

*Адразу* гэткага не атрымалася, бо на тую пару працэсы этнічнай кансалідацыі беларусаў адбываліся ў сацыяльным подзе (вёска, плебейская частка мястэчак і гарадоў), дзе паводле азначэння не было месца хоць якім элітам, а значыць, і *высокай*, шляхетнай, арыстакратычнай духам Беларусі.

*Потым* гэткага не атрымалася, бо беларусы, **ужо як нацыя**, паўсталі ў эпоху, калі і ідэалагічна, і палітычна дамінавалі сілы (дэмакраты, анархісты, сацыял-дэмакраты, бальшавікі і г.д., і да т.п.), сфармаваныя на грунце таго ж самага сацыяльнага поду (плебейства, люмпенства). І тут зноў не было і не магло быць месца Міцкевічу.

Натуральна, праблема не толькі і не столькі ў Міцкевічы, геніяльнай постаццю якога мы скарысталіся адно дзеля больш выразнага адлюстравання той амбівалентнай сітуацыі, у якой нават глыбока мадэрнізаваная Беларусь заставалася (у нацыянальным дыскурсе) замкнёнай на архаіку “нізавога”,

“плебейскага” міфу. Гэтая несумернасць, амбівалентнасць ментальнага і рэальнага светаў і штурхала найбольш энергетычных, амбітных ды адораных беларусаў (а такіх хапала) у авангард расейскага (камуністычнага) месіянізму. Аляксей Касыгін на верхатурах Крамля, Дзмітрый Шастаковіч на музычным алімпе, Кавалёнак на касмічнай арбіце — усё гэта толькі кампенсацыя адсутнай Вялікай Літвы.

## 16. МЫ І РАСЕЯ

Хоць якая кансалідаваная ідэя можа стацца ментальнай рэальнасцю адно тады, калі ў досведзе народу актыўна і сістэмна прысутнічаюць падзеі тыпу “богаабранасці”, “саборнасці”, “абшчыннасці” і да т.п. У беларусаў нічога падобнага (сістэмна) ніколі не было. Таму зусім неверагодна, каб беларусы запрапанавалі (як габрэі), а тым болей спрабавалі рэалізаваць (як расейцы) агульную для ўсяго чалавецтва канструкцыю светабудовы. Яны такое і прысніць не змаглі б — не тое, што ўцялесніць. А вось што ў іх заўсёды добра атрымлівалася, дык гэта здаваць прастору свайго бытавання ў арэнду пад розныя месіянскія і проста глабалісцкія канцэпты ды праекты.

Паганства, хрысціянства (ва ўсіх ягоных версіях), мусульманства, іудаізм, рэнесанс, рэфармацыя і контррэфармацыя, сацыялізм, інтэрнацыяналізм, камунізм, глабалізм... Усё, што мела хэнць і волю займець месца на гэтых абшарах, знаходзіла тут сабе ўтульнае месца. Талерантнасць беларусаў, безумоўна, мацнейшая за інстынкт самазахавання, з чаго так і карціць яе звузіць. Але, здаецца, апошняе якраз і немагчыма. На немагчымасці звузіцца ў талерантнасці тут заўсёды будзе спатыкацца кожная татальная ідэалогія — і нацыяналістычная таксама. Ідэя сябе ў нацыі, а не нацыі ў сабе, ідэя гамагеннай нацыі, адгароджанай ад іншых нацыянальнай дзяржаўнасцю,

наўрад ці калі пераадолее ўстаялую ментальнасць беларусаў, зарыентаваную фатальным светапоглядам на паасобкавыя, але пры гэтым спавітыя талерантнасцю, саматоеснасці…

Мы — Францішак Скарына, а не Сімяон Полацкі, хаця Сімяон Полацкі — гэта таксама мы. Дзве велічныя постаці зямлі беларускай — гэта два нашыя шляхі, аднак не трэба быць асабліва відушчым, каб зразумець, куды вёў нашых продкаў першы шлях і чым абярнуўся для нас другі.

Не заўсёды і зусім неабавязкова чужая культура прыносіцца на штыках і штыкамі ўсталёўваецца. Расейская культура з уласнай волі да панавання знішчыла іншых культураў болей, чым усе войскі Расейскай імперыі знішчылі іншых войскаў.

Мілажальнасць культуры — гэта казка для дарослых. Культуры больш агрэсіўныя, чым іх носьбіты — народы (гэтая тэза аднолькава пасуе і для беларускай культуры). Калі ў войнах паміж народамі хоць зрэдчас здараюцца перапынкі, то ў войнах культураў перапынкаў не бывае.

Дык вось, калі запытацца: чаму сёння значная частка беларусаў не ідэнтыфікуе сябе беларусамі, то адказ будзе наступным: таму што на нашых землях ужо безліч гадоў ні на хвіліну не спыняецца вайна расейскай і беларускай культураў, у выніку якой апошняя апынулася амаль усцяж пераможанай. І, бадай, найтрагічным у гэтай паразе была параза беларускай мовы.

Мова — той азонавы слой, які дазваляе больш-менш устойліва функцыянаваць, развівацца і нарошчваць свой патэнцыял усім астатнім чыннікам культуры нават у неспрыяльных для яе ўмовах. Вядома, у гэтым азонавым слаі кожнай культуры сёння шмат дзірак, але ў нас ён знішчаны амаль цалкам, ад яго засталіся адно лахманы, якія ўжо не засланяюць цела нацыянальнай культуры як ад сцюдзёных вятроў культуры

расейскай, так і ад касмічнага холаду метакультуры камунікатыўна адкрытага грамадства.

Адсюль, з перамогі расейскай культуры (на штыках і без штыкоў), і была зманіпуляваная прыдумка, што беларусы вельмі падобныя да рускіх — ну амаль што блізнюкі...

Падабенстваў з расейцамі, найперш праз агульную прыналежнасць да славянства, у нас, відавочна, даволі. Да таго ж істотную ролю ў прыпадабненні народаў адыграла і праваслаўе — апошнія некалькі стагоддзяў дамінавання "рускай" царквы на нашых землях добра прыклаліся да "русіфікацыі" беларусаў... Але ўсё гэта разам (і шмат чаго іншага) не дае нам права забывацца, што мы два зусім розныя народы з апрычонымі шляхамі і адметнымі гістарычнымі лёсамі — і будзем такімі да таго часу, пакуль будзем. (Чамусьці ніхто не лічыць "братамі" французаў і немцаў толькі таму, што яны належаць да аднаго раманскага свету?!)

У сувязі з навуковымі і не надта навуковымі тэарэтызаваннямі на тэму "аб'яднання двух братніх народаў" (мне гэта нагадвае аб'яднанне ўдава з трусам) успомнім колькі словаў старэйшага з братоў Кірэеўскіх: "Некаторыя думаюць, што пазнейшае засваенне іншаземнай адукацыі можа з часам перастварыць усяго рускага чалавека... Ці патрэбна абвяргаць падобныя меркаванні. Зніштожыць адметнасці разумовага жыцця народа гэтак жа немагчыма, як немагчыма зніштожыць яго гісторыю. Падмяніць літаратурнымі тэрмінамі перакананні народа не працей, чым адцягненай думкай перасунуць косці маладога арганізму".

Тое самае можна сказаць і пра беларусаў у праекцыі на вайну культураў. Толькі тут яшчэ трэба дадаць, што немагчыма і "перасунуць" беларусаў з Еўропы на сёмы мацярык — у Расею. Можна было на нейкі час адлучыць іх ад "гістарычнай

Бацькаўшчыны”, аднак рана ці позна павінен быў настаць час вяртання. І тут не лішне будзе падкрэсліць, што вяртанне да еўрапейскіх сацыяльных, інтэлектуальных ды культурных каштоўнасцяў не ёсць для беларусаў модай, геапалітычным свавольствам ці часовай прыхамаццю. І збочваць у бок Еўропы беларусы будуць не таму, што там вальней і абаранкі задарма даюць, а таму, што там “карэнныя перакананні народу”, нават калі сам народ “у сілу гістарычных абставінаў” забыўся на гэта.

Вяртанне Беларусі ў Еўропу — гэта шлях, ад якога “мы не маем права адмовіцца” і ад якога “мы не здолелі б адмовіцца, нават каб гэтага захацелі”.

Расея — наш фатум, але не наш кон. Пра фатальную ролю Расеі ў лёсе Беларусі ўжо даволі казалася вышэй. Аднак Расеяй мы толькі спутаныя, а зацугляныя Еўропай. Усім сваім целам мы ўпісаныя ў прасторавую фігуру Еўропы, больш за тое, у сваю пару (Вялікае Княства Літоўскае, Рэч Паспалітая) продкі беларусаў былі не апошнім стваральным чыннікам гэтай фігуры і яе цывілізатарскім фарпостам у славянскім свеце. І хаця пазней гэты “фарпост” лязом расейскай экспансіі на Захад быў адсечаны ад свайго вялікага цэлага, яго натуральнае месца заўсёды застаецца за ім. І менавіта згаданым фактарам найперш абумоўлена тое, што нават больш чым два стагоддзі каланізацыі, русіфікацыі і мэтаскіраванай асіміляцыі не далі рады гэтай зачараванай на ўласную ролю прасторы, якая сёння зноў патрабуе сабе статусу суб’екту еўрапейскай гісторыі.

Вось чаму наастачу тэмы я зноў хацеў бы паўтарыць: Расея — наш фатум, але не кон.

## 17. ГІСТОРЫЯ ЭМАЦЫЙНАГА

У сучасным інтэлектуальным дыскурсе апазнана мноства (безліч) *гісторыяў*: ад гісторыі свету (і сусвету) да гісторыі

гісторыі. Усё ідзе да таго, што колькасць напісаных гісторыяў некалі можа стацца роўнай колькасці падзеяў, якія сістэмна разгортваліся хоць у якой сферы дзейнасці чалавека. Але вось дзіва, ніхто, здаецца, нават не спрабаваў стварыць гісторыю эмоцыяў, хаця ўсё, што чалавек дзеіць, і ўсё, што з чалавекам дзеіцца, мае свой эмацыйны эквівалент. Больш за тое, гісторыя чаго заўгодна, як і сама гісторыя ў сваім цэлым, завязаная і наўпрост злучаная з эмацыйным чалавека, пераважна з эмацыйнага паходзіць і ім жа канцуецца. Урэшце, чалавек імкнецца да асалоды, грошай, славы, перамогаў не дзеля іх саміх, а дзеля тых эмоцыяў, што імі спараджаюцца. І нішто ў свеце чалавека не можа быць вызначанае за вартае (вартаснае), калі яго каштоўнасць не канстытуецца эмацыйным. А вось само эмацыйнае за вартасць чамусці не лічыцца, хаця менавіта на ім штодня трымаецца жыццё кожнага чалавека, як і чалавецтва ўвогуле.

Праўда, тут лёгка запярэчыць, заўважыўшы, што адсутнасць гісторыі эмоцыяў супольна кампенсуюць гісторыя літаратуры, мастацтва, рэлігіі... Але гэта не зусім так, бо хаця самі эстэтычныя віды дзейнасці (творчасці) і ўнаяўліваюць эмацыйнае, аднак іхнія гісторыі — гэта ўжо гісторыі менавіта літаратуры, мастацтва, рэлігіі...

Усё гэта я да таго, што неўзабаве мы *эмацыйна* забудземся (калі ўжо не забыліся) на тое Тэктанічнае Узрушэнне, якое цягам амаль дзесяцігоддзя (ад сярэдзіны васьмідзесятых да сярэдзіны дзевяностых) ахапіла і трымала дзень у дзень сотні мільёнаў людзей еўраазійскага кантыненту (а ягонае рэха ўвесь гэты час хадуном хадзіла па ўсёй зямной кулі).

Нарадзіцца варта было адно дзеля таго, каб уласным сэрцам пражыць гэтую эпоху “буры і націску”, калі пад напорам новай веды і новай волі да ўлады бурыліся дзяржаўныя муры і межы, іначыліся ды паўставалі не існуючыя раней краіны, і ў кожнай

асобна ўзятай галаве буяла свая рэвалюцыя...

Нарадзіцца варта было адно дзеля таго, каб перажыць гэтую Вялікую Эмоцыю, пасля якой ты аднойчы прачнуўся ў тым самым сваім жыцці, але ўжо зусім іншым чалавекам і ў зусім іншым свеце…

Згадваючы пра распад камуністычнай імперыі, звычайна дадаюць эпітэт “апошняя”, што, з майго гледзішча, вельмі не дакладна. Загінула якраз *першая* сучасная імперыя, сфармаваная ўжо не на дынастычным ці рэлігійным, а на ідэалагічным канструкце. Гэта значыць, знікла не проста яшчэ адна (апошняя) імперыя, а на нашых вачах дыскрэдытавала сябе цывілізацыя, якая больш за стагоддзе прапаноўвала сябе ў якасці мадэрновага праекту ўсеагульнага светаўладкавання.

Менавіта адсюль і паходзіць той тэктанічны эмацыйны стрэс, які звычайна тлумачыцца ўсяго толькі геапалітычным і сацыяльным ператрусам...

Насамрэч крах камуністычнай цывілізацыі пазбавіў чалавецтва нечага значна большага — логацэнтрычнай ідэі прагрэсу, а значыць, і будучыні ўвогуле, як вектару руху *наперад*.

## 18. ВОЛЯ ДА ЎЛАДЫ

Я нарадзіўся, вырас і асталеў у татальна не-свабоднай краіне сярод спадчынна несвабодных людзей. Тых некалькі гадоў канца васьмідзесятых — пачатку дзевяностых, якія досыць умоўна можна назваць парой свабоды, натуральна, было замала, каб зразумець, чым насамрэч ёсць рэальная свабода. Іх хапіла, бадай, адно на тое, каб усвядоміць увесь папярэдні досвед жыцця, як досвед не-свабоды. Адсюль і хада маіх наступных развагаў...

Як гэта ні дзіўна, але пафаснае меркаванне, сфармулява-

нае ў больш рамантычныя ад нас эпохі, што чалавек нараджаецца свабодным і таму скрозь усё жыццё імкнецца да свабоды як да найвялікшай каштоўнасці, усё яшчэ застаецца ва ўжытку. Хаця сёння кожны добра ведае, што ўсе тыя свабоды, якія ў сярэдзіне XX стагоддзя зафіксавала “Дэкларацыя правоў чалавека”, былі літаральна заваяваныя ў сацыяльных войнах і рэвалюцыях, гэта значыць навязаныя чалавецтву гвалтам, праз крыўду, кроў і прымус.

Але калі свабода — гэта найвялікшая каштоўнасць для ўсіх і кожнага, то чаму яна ўсталёўваецца не праз згоду, зусім натуральную ў такім выпадку, а праз гвалт адных людзей над другімі? Ды, пэўна ж, таму, што *сацыяльна* свабода ніколі не была для чалавека абсалютнай каштоўнасцю, прынамсі, яна ніколі не была каштоўнасцю большай за не-свабоду, і прыкладаў таму лічыць — не пералічыць. Падчас Рымскай імперыі свабодныя плямёны варвараў добраахвотна прасіліся да рымлянаў у рабы (і яшчэ не ўсіх і не заўсёды бралі), бо стан рабства забяспечваў больш высокі ўзровень дабрабыту, чым жыццё ў беспрытульнай волі. Рабы-негры самаахвярна падтрымлівалі рабаўладальнікаў у вайне з федэратамі, якія хацелі іх вызваліць ад рабства... Найбольш незадаволенымі адменай прыгоннага права ў Расейскай імперыі былі не памешчыкі, а прыгонныя. Зрэшты, рэч не ў асобных прыкладах, дзе памкненне да не-свабоды кожны раз можна патлумачыць ці то гістарычнымі, ці то сацыяльна-псіхалагічнымі матывамі. Рэч у тым, што ўся зафіксаваная гісторыя чалавецтва сведчыць аб заўсёднай і таму, пэўна ж, натуральнай патрэбе *сацыяльнага* чалавека ў не-свабодзе. І дэмакратычны лад жыцця мы сёння лічым за найлепшы з пакуль магчымых не толькі таму, што з яго чалавек мае права на свабоду, але яшчэ і таму, што тут чалавек гэтаксама мае права выбраць сабе не-свабоду.

Адабраць у чалавека права на не-свабоду — гэта яшчэ больш жорстка, чым адняць у яго права на свабоду, бо той, каго паклікаў *геній волі*, так ці інакш, але здабудзе яе ў барацьбе, перамозе ці смерці, а няволю можна толькі атрымаць як сваё натуральнае права…

Свабода — занадта цяжкая ноша, каб яе сілком узвальваць на плечы таго, хто не жадае яе несці добраахвотна.

Вось чаму канстытуцыя кожнай дэмакратычнай краіны (як і “Дэкларацыя правоў чалавека”) — гэта кансенсус паміж правам чалавека на свабоду і правам на не—свабоду. І хаця права на апошняе ўсе канстытуцыі, як і “дэкларацыя”, сарамліва ўтойваюць, але насамрэч яно заканстытуяванае ў той жа меры, як і першае. І гэтым правам на не-свабоду людзі раз-пораз карыстаюцца, праўда, з рознымі для сябе, а здараецца, і ўсяго чалавецтва вынікамі. Так ім скарысталіся ў 1933 годзе ў Нямеччыне, падчас апошняга рэферэндуму ў 1991 годзе ў Савецкім Саюзе, вясной таго ж году ў Беларусі, калі калоны рабочых Менскіх заводаў рушылі праз увесь горад на плошчу Незалежнасці.

Некалькі дзён запар усе буйнейшыя тэлекампаніі свету ў аглядах навін паказвалі гледачам гэтае ўнушальнае відовішча. Паказвалі як прыклад абуджэння беларускага народу ад таталітарнага сну, як жаданне і здольнасць рэалізоўваць маладой беларускай дэмакратыяй свае правы і свабоды. Прыкладна ў такім жа ракурсе асвятлялі і аналізавалі гэтую падзею айчынныя і замежныя публіцысты, палітолагі, тэарэтыкі. Тагачасны лідэр беларускай апазіцыі Зянон Пазняк даваў шматлікія інтэрв’ю амерыканскім журналістам (ён тады быў у Амерыцы), дзе казаў, што ганарыцца беларускім народам, які гэтак магутна і цывілізавана прадэманстраваў усяму свету прагу свабоды, незалежнасці і дэмакратыі... Праўда, у беларускіх незалежных мас-медыя праз агульны хор захаплення няўзнак праслізгвала

адчуванне нейкай насцярожанасці, бо было абсалютна незразумела, з чаго гэта беларускаму рабочаму аднойчы ранкам захацелася не піва, а свабоды?

Але ні тады, падчас тых падзеяў, ні да гэтай пары, здаецца, ніхто так і не ўсвядоміў, што ў тыя дні з розных канцоў Менску рухалася ў адным кірунку не свабодная, незалежная і дэмакратычная Беларусь, а ў маўклівых, бясконцых калонах рушыла тады на плошчу Незалежнасці беларуская Вандэя.

Менавіта так — на галоўную плошчу сталіцы мерным крокам рухалася беларуская Вандэя, *сацыяльная* правінцыя нашай краіны, якая ў 60—70-х гадах пераехала з вёсак і мястэчак і цяпер патрабавала ад ужо дэмакратызаванага (у пэўным сэнсе) Вярхоўнага Савету вяртання сабе сітуацыі не-свабоды. І хаця над стотысячным натоўпам сям-там лунаві бел-чырвона-белыя сцягі і ў прамовах выступоўцаў паміж патрабаваннямі падвышэння зарплаты і зніжэння цэн чуліся палітычныя заклікі да адстаўкі ўраду (між іншым, у нейкай меры таксама прызначанага праз дэмакратычныя працэдуры), і хапала словаў пра свабоду і дэмакратыю, але насамрэч гэта быў магутны пратэст супраць перабудовы, рэформ, блізкага развалу Савецкага Саюзу, ліквідацыі сацыялізму і ўсталявання дэмакратыі, пратэст, які беларуская Вандэя тады яшчэ не магла (ці пакуль не адважвалася) адэкватна сфармуляваць. Але міне некалькі гадоў і наша *сацыяльная* правінцыя сфармулюе свае патрабаванні ў адэкватных формулах, калі на выбарах прэзідэнту аддасць свае галасы не Станіславу Шушкевічу, а Аляксандру Лукашэнку, калі на рэферэндумах прагаласуе супраць роднай мовы, нацыянальнай сімволікі, незалежнасці і нават супраць таго, каб самім свабодна выбіраць сабе мясцовую ўладу.

Але я не маю намеру, як магло падацца з папярэдняга, нагружаць метафару Вандэі негатыўнымі значэннямі (менавіта ў негатыўным значэнні аднавіў яе ў Беларусі Алесь Адамовіч у

пару перабудовы). Бо памкненне *сацыяльнай* правінцыі да несвабоды кажа не пра ўласна не-свабоду, а пра тое, што каштоўнасці гэтых людзей палягаюць на нечым іншым.

Шматкроць і недвухсэнсоўна выказаны пратэст беларускай *сацыяльнай* правінцыі супраць шматлікіх спроб навязаць ёй паўз яе волю палітычныя, грамадскія і эканамічныя свабоды пераканаўча сведчаць, што яна выразна ўсведамляе: гэта не яе свабоды, і яны не для яе, а для некага іншага, і таму ёй гэтыя свабоды для іншага не сёння, дык заўтра, але, напэўна, вылезуць бокам.

Не думаю, што наша сацыяльная правінцыя моцна памылялася тады і памыляецца цяпер. Бо няма ў прыродзе ніякай абстрактнай свабоды, нейкай адной свабоды для ўсіх. Кожная свабода — гэта свабода для некага. Свабода, як зубная шчотка, рэч надзвычай канкрэтная і ў кожнага свая. Крот у нары не менш свабодны за ластаўку ў небе. Проста ў іх розныя тыпы і далягляды свабоды. І калі крата ўхапіць за карак і шпурлянуць у неба, то ён, пэўна, будзе мець рацыю, калі палічыць гэта за гвалт, а не за дараваную яму свабоду трохі палётаць.

Свабода слова, свабода друку для мяне як літаратара — гэта не абстракцыя, а такая ж канкрэтная прылада працы, як асадка і аркуш паперы, за якую мне мае сэнс змагацца, бо без магчымасці нязмушана выказваць свае думкі я не здолею паўнавартасна рэалізаваць сябе ў сваёй дзейнасці, а з гэтага як бы не дажыву наканаваны мне век. І таму той, хто адымае ў мяне свабоду слова, адымае ў мяне не нешта абстрактнае, а крадзе ў мяне маё, забірае ў мяне частку мяне самога. З гэтага зусім натуральна будзе, калі я крыкну яму: “Злодзей!..”

Але калі нехта забірае ў мяне мае каштоўнасці ў выглядзе свабоды друку, то адсюль зусім не вынікае, што гэтым ён абірае і ўсіх астатніх. Бо якую каштоўнасць могуць уяўляць свабода

слова, свабода друку, скажам, для маіх бацькоў, якія за ўсё сваё дарослае жыццё, бадай, не прачыталі ніводнай кніжкі, ніколі не гарталі газет (за выключэннем хіба тых выпадкаў, калі там друкаваліся тэксты іх сына з фотаздымкам), а па тэлевізары глядзелі ўсё, што заўгодна, апрача інфармацыйных і палітычных перадач? Дык што ім да таго, ёсць там нейкая свабода слова ці яе няма, забараняюць выдаваць нейкія газеты ці не. Вось калі б па вясне забаранілі бульбу садзіць, а перад Калядамі калоць парсюка — тады іншая рэч. З газет і парламенту сытым не будзеш, а з бульбы ды парсюка сам пражывеш, дзяцей выгадуеш і на ўнукаў яшчэ паспееш пацешыцца...

Адсюль іхні недавер да ўсялякіх свабод, што разумнікі ў сталіцах выдумляюць, бо не бачна з тых свабод ніякай карысці чалавеку, які жыве з мазаля. Пэўна, разумнікам з іх свабод і станецца нейкая выгода, а для паспалітага люду пры любой уладзе адна свабода: жыццё паміж хлявом і полем да рэшты стаптаць (гарадскі варыянт: паміж заводам і аўтобусным прыпынкам).

Зразумела, што стаптаць жыццё паміж хлявом і полем і стаптаць яго на аркушы паперы — гэта два розныя лады жыцця, якія абапіраюцца на канцэптуальна розныя каштоўнасці. У першым выпадку на анталагічныя каштоўнасці быцця, дзе дамінуюць забеспячэнне самога себе існаваннем, а чалавецтва — працягам твайго роду, у другім — на экзістэнцыйныя, дзе вядзе рэй праблема выбару ў рэалізацыі патэнцыялу індывідуальнага “я”.

Быццё не ведае катэгорыі свабоды (свабода ёсць выключна катэгорыяй экзістэнцыі). Таму *сацыяльная* правінцыя ў сваёй арыентацыі на анталагічныя каштоўнасці, якія толькі і забяспечваюць чалавека быццём, выбірае сабе не-свабоду; а свабоду пакідае *сацыяльнай* сталіцы, як месцу, дзе акумулююцца

экзістэнцыйна актыўныя суб’екты.

Менавіта высілкамі экзістэнцыйна заклапочаных, якія імкнуцца да пошуку і выяўлення межаў уласнага “я”, катэгорыя свабоды і набыла тое значэнне, якое яна сёння мае, але прыгожы вобраз якога зусім не падобны да яго сутнасці. Ідэалізуючы катэгорыю свабоды, нагружаючы яе значэннем абсалютнай каштоўнасці, апантаныя праблемамі ўласнай экзістэнцыі, па-расейску кажучы, “лукавят”. Нічога асабліва прыгожага і гуманнага ў свабодзе няма, прынамсі, няма там гэтага больш, чым у не-свабодзе. Шматлікія свабоды — гэта тыя ж “правы” больш моцных, больш актыўных, больш разумных, больш прагавітых выяўляць сваю ўладу над менш моцнымі, менш разумнымі, менш прагав-ітымі,— толькі ўжо не самачынным гвалтам, а пад абаронай Канстытуцыі і Дэкларацыі аб правах чалавека.

Увогуле, трэба досыць выразна ўсведамляць, што свабода — гэта ўсяго толькі адна з форм выяўлення волі да ўлады. Як толькі недзе завялася прага свабоды, дык значыць, там нехта ці нешта добра набрыняла ўладным патэнцыялам. Вялікая Французская рэвалюцыя, якая сфармулявала знакамітую трыяду “Свабода. Роўнасць. Братэрства” сваім крывавым чынам засведчыла не прыйсце эпохі свабоды, а пераход улады ад арыстакратыі да нацыянальнай буржуазіі. І гэта тычыцца не толькі палітычнай, але і кожнай іншай свабоды. Пакуль Гутэнберг не выдумаў друкарскі варштат, нікому нават да галавы не было казаць пра нейкую там свабоду пісьма. Але як толькі гэты варштат даў магчымасць далучыцца да вырабу слоў сотням, тысячам разумных, актыўных, прагных, дык яны адразу запатрабавалі сабе свабоды, каб мець канстытуцыяй гарантаваную магчымасць рэалізаваць сваю волю да ўлады над чытачом... І ўрэшце яны яе атрымалі: у XX стагоддзі прэса рэальна стала чацвёртай уладай, хаця гэтая ўлада пакуль што яшчэ і застаецца юрыдычна не аформленай.

І калі ў Беларусі, пасля распаду СССР, з розных бакоў пачалі гучаць патрабаванні тых ці іншых свабодаў, дык гэта найперш азначыла, што ў нашай *сацыяльнай* сталіцы выспела значная колькасць экзістэнцыйна заклапочаных асобаў, якія ўжо прагнуць рэалізаваць сваю волю да ўлады праз свабоду слова, свабоду друку, свабоду палітычных і грамадзянскіх арганізацый ды ўсялякія іншыя свабоды. Шкада толькі, што гэткіх асобаў апынулася замала, каб яны, злучыўшыся ў цэлыя сацыяльныя страты, змаглі адсунуць *сацыяльную* правінцыю ад *сацыяльнай* сталіцы на належнае ёй месца — у “Вандэю”. Бо Беларусь толькі тады рэальна стане суб’ектам гісторыі, калі сама ператворыцца ў аб’ект рэалізацыі экзістэнцыйных памкненняў тых, хто прагне свабоды Беларусі, як рэалізацыі ўласнай волі да ўлады. Але, імкнучыся наяве здзейсніць гэтыя собскія памкненні, наўрад ці мае сэнс наракаць на *сацыяльную* правінцыю, якая затулілася ў сваю не-свабоду і турбуецца адно пра тое, каб у пару забуяла бульба ды не спазніліся завезці дровы на зіму.

У *сацыяльнай* правінцыі і *сацыяльнай* сталіцы розныя меры адказнасці. Першая адказвае за быццё ў яго анталагічнай цэласнасці, а другая — толькі за ўласную экзістэнцыю, што прагне выразніцца праз розныя свабоды як найбольш эфектыўныя і цывілізаваныя формы выяўлення волі да ўлады. І сярод іх — праз нацыянальна зарыентаваныя формы (да прыкладу, праз ідэю Адраджэння, якая гэтак шырока была заманіфеставаная ў Беларусі ў першай палове дзевяностых гадоў).

## 19. ІДЭЯ АДРАДЖЭННЯ

Незалежнасць Беларусі была аб’яўлена 25 жніўня 1991 году. Тую пару варта згадваць па днях і нават гадзінах, але падрабязны

росціс падзеяў аніяк не стасуецца з абраным тут фарматам. Мусім адно заўважыць, што апошнія два-тры гады, якія папярэднічалі з'яўленню Рэспублікі Беларусь, былі з дня ў дзень роўнавялікімі сьвяту Незалежнасці.

Усё пачалося, як вядома, з "гарбачоўскай перабудовы", дакладней з павальнага і нястомнага чытання "прагрэсіўных" газетаў і часопісаў, што паўсталі на тле задэклараванай Міхаілам Гарбачовым свабоды слова.

Некалькі гадоў татальнага і добраахвотнага лікбезу столькі ўсяго перайначылі ў галовах людзей, што яны пакрысе пачалі перасоўвацца з дыскусійных кухняў на вуліцы ды пляцы і тым распачалі пару "вулічнай (ці мітынговай) дэмакратыі". Ужо ў 1989 годзе даволі часта здаралася, што ў той самы дзень і час, але ў розных месцах Менска адразу роілася некалькі мітынгаў. Неўзабаве мітынговая эпідэмія пашырылася на абласныя цэнтры, а затым і на многія мястэчкі. Адно толькі вёска не ладзіла палітычных сходаў, аднак гэта не азначала, што вёска не мітынгавала на прызбах, лаўках, за чаркай і за сваркай.

Потым, асабліва пасля першага "Чарнобыльскага шляху", буйным мітынгам сталі папярэднічаць шматтысячныя шэсці пад бел-чырвона-белымі сцягамі. І гэта было файна!

Краіна бурапеніла. Дакладней, бурапеніў увесь еўраазійскі свет і мы разам з ім. Антыкамуністычны шал энергетычна быў настолькі магутным, што на сваім шляху амаль вокамгненна (як для гісторыі) трушчыў і ніштожыў самыя трывалыя палітычныя збудаванні ды канструкцыі. Але досыць хутка ўвідавочнілася, што сам антыкамунізм не ёсць альтэрнатывай камунізму, што гэтую альтэрнатыву яшчэ трэба вынайсці і сфармуляваць. Тады ў пераможную апазіцыю і была закааптаваная дэмакратыя, чаго, зрэшты, і не выпадала ўнікнуць, бо ў глабальным сэнсе "краіны дэмакратыі" ўжо досыць даўно выступалі ў супраціў

камуністычнаму блоку і добра прыклалі руку да заняпаду “імперыі зла”.

Таму далей усе палітычныя падзеі будуць разгортвацца амаль выключна ў формах дэмакратычнай атрыбутыкі і рыторыкі. Але — і толькі. Бо сапраўдную палітычную сутву часу выявіць нешта зусім іншае. А менавіта, пад “дымавой завесай” дэмакратычных пераменаў на стратэгічныя пазіцыі высоўваўся нацыяналізм. І хаця ўсе тыя краіны, што наноў аб’яўлялі пра незалежнасць (ад Венгрыі да Манголіі) ці прагалошвалі яе ўпершыню (як Малдова), спяшаліся наперад усяго заявіць пра свой дэмакратычны выбар, аднак насамрэч яны перадусім выбіралі для сябе нацыяналізм і менавіта на ягоным грунце будавалі свае дзяржаўныя ўтварэнні, дзе атрыбуты дэмакратыі выконвалі пераважна адно фармальныя функцыі альбо і ўвогуле былі ўсяго толькі вітрынай.

А цяпер збочым ад праблемаў татальнага рэваншу нацыяналізму ў адзін з ягоных абсягаў, найбольш істотны для нашай гаворкі. Паперад усяго звернем увагу, што тыя дзяржавы, якія сфармаваліся на фрагментах распалага СССР, узялі сабе за аснову моўна-этнічную нацыянальную мадэль. Гэтак сталася нават там, дзе этнічна карэннае насельніцтва не пераважала (ці пераважала нязначна) у агуле насельніцтва краіны. Як і там, дзе ў значнай колькасці прысутнічалі прадстаўнікі самых розных нацыянальнасцяў. У першым выпадку перадусім маецца на ўвазе Латвія і Эстонія, у другім — Казахстан.

Чаму так атрымалася, адказаць зусім няпроста. Верагодна адной з прычынаў (хай сабе і не асноўнай) было тое, што за камуністамі тэорыяй нацыяналізму публічна было забаронена займацца, калі такім заняткам не лічыць бязлітасную прапагандысцкую крытыку нацыяналізму, як такога. Таму для тых лідэраў, якія прыйшлі ў палітыку на “хвалях перабудовы”, бадай нават не да галавы было, што апрача моўна-этнічнага ёсць яшчэ

нейкія іншыя спосабы нацыянальнага ўладкавання. Пэўна, істотную ролю ў гэтым выбары адыграў і той факт, што ў першай чвэрці дваццатага стагоддзя многія з будучых савецкіх рэспублік спрабавалі стварыць незалежныя дзяржавы ў прасторы “этнаграфічных межаў” і цяпер механічна працягвалі раней запачаткаваную традыцыю. А да ўсяго гэтага, безумоўна, дадалося і тое, што на еўрапейскім кантыненце падобная мадэль дасюль застаецца найбольш пашыранай і калі хоць дзе вядзецца гаворка пра нацыянальную дзяржаву, то амаль заўсёды на ўвазе маецца дзяржава, дзе дамінуе тытульная нацыя з усімі сваімі асноўнымі атрыбутамі (мовай, гісторыяй, традыцыяй, культурай...).

Натуральна, можна і далей расшукваць тыя падставы і прычыны, што паўплывалі на “адзінадушны” выбар, але нам тут істотна іншае, а менавіта, што Беларусь таксама прылучылася да агульнай тэндэнцыі, нават не парупіўшыся пра сістэмны аналіз уласнага нацыяналістычнага патэнцыялу. Але асноўную гаворку на гэтую тэму мы распачнем крыху пазней, а пакуль звернем увагу на ідэю Адраджэння, якой і была падрыхтаваная практычная рэалізацыя моўна-этнаграфічнай мадэлі.

Як быццам палягае навідавоку, што ідэя нацыянальнага Адраджэння (гэтаксама і Народнага фронту) запазычаная ў “прыбалтаў”, якія раней за іншых сталі на сепаратны шлях і шмат чаго ўжо паспелі сфармуляваць да таго моманту, калі нацыянальны рух у Беларусі набыў хоць нейкую моц. І гэта сапраўды так было. Разам з тым будзем усведамляць, што як толькі палітычны акцэнт перастварэнняў перасунуўся з антыкамунізму на этнакультурную традыцыю, дык ва ўмовах Беларусі ідэю Адраджэння нельга было абмінуць незалежна ад таго, існавала яна ўжо недзе, ці яе трэба было вынайсці самім беларусам. Рэч у тым, што на тую пару супольнымі намаганнямі камунізму і расейскага нацыяналізму ўсё ўласна нацыянальнае ў Беларусі было вынішчана амаль ушчэнт. І таму ў сітуацыі вышэй

згаданага выбару не прадбачылася іншага выйсця, акрамя як пачаць інтэнсіўнае і адначасна карпатлівае ўзнаўленне, адраджэнне, рэканструяванне наўсцяж зніклага, каб адсланіць ад сябе пустату віртуальнымі абрысамі і пазнакамі былога...

Праўда, апошні мой выраз пра завесу з гістарычных сімулякраў патрабуе ўдакладнення, бо ён з сённяшняга досведу, а тады, здаецца, амаль усе былі поўныя веры, што былое можна наноў уцялесніць, узнавіць у статусе рэальна прысутнага, матэрыялізаваць гэтаксама, як у сучасным матэрыялізуецца будучае. І ўжо пасля таго, як усё гэта здарыцца, адбудзецца — на адноўленым падмурку майстраваць новы Беларускі Дом.

На гэтую справу (справу Адраджэння) разам падхапіліся многія і многія — і з розных бакоў. Тут былі і калектыўныя "ветэраны" нацыянальнага руху ("Майстроўня", "Талака", "Бабілон"...), і толькі паўсталыя аб'яднанні, рухі, партыі ("Тутэйшыя", "Мартыралог Беларусі", Таварыства беларускай мовы, Беларускі народны фронт, Беларуская сацыял-дэмакратычная грамада і мноства ўсяго іншага што ў сталіцы, што на правінцыі і ў замежжы). Да таго ж яшчэ напярэдадні Незалежнасці (а тым болей потым) бальшыня дзяржаўных СМІ (улучна з тэлебачаннем) з ахвотай і сімпатыяй стала ўзнаўляць раней забароненыя для публічнай агалоскі падзеі, справы і постаці з неверагодна багатай гісторыі Беларусі. Што ўжо казаць пра незалежніцкія і дэмакратычныя газеты, часопісы, кнігі, суполкі і супольнасці, якія, здаецца, толькі тым і займаліся, што без стомы гарталі старонкі мінулага, каб увідавочніць наяўнасць сапраўдных нацыянальных каштоўнасцяў і сярод іх як найвелькую — саму беларускую нацыю.

Мы не шмат перабольшым, калі скажам, што ў тую пару заангажаваныя Беларуссю беларусы пераважна *жылі* не ў сучасным, а ў прамінулым. Постаці Вітаўта, Сапегі, Касцюшкі... зрабіліся для "свядомых" больш блізкімі і больш пазнавальнымі

за постаці суседзяў па лесвічнай пляцоўцы, абрэвіятура ВКЛ сталася паролем для ўсіх "сваіх", а вокліч "Жыве Беларусь!" — агульнанацыянальным кодам, які адчыняў усе дзверы ў культуру і палітыку. З гэтай апантанасці гісторыяй мы нават трохі параблыталі эпохі, што мела сур'ёзныя наступствы, бо ў такім кантэксце архаічная напрыканцы XX стагоддзя ідэя нацыянальна-этнаграфічнай дзяржавы ўспрымалася намі за цалкам рэальную для фармалізацыі ў наяўным.

Як ужо казалася, нацыянальнае рушэнне мела безліч персанальных і калектыўных суб'ектаў, але досыць хутка наперад усяго (і лічы безальтэрнатыўна) вылузнуўся Беларускі народны фронт. У палітычным лідэрстве Народнага фронту галоўная заслуга, што бясспрэчна, Зянона Пазняка. Ён, ачолеўшы нацыянальна-дэмакратычны рух, які фармаваўся літаральна на маршы, паспяхова скарыстаўся плёнам расейскай перабудовачнай публіцыстыкі, прыбалтыйскіх народных франтоў, заходняй прапаганды і дыпламатыі, інтэлектуальным наробкам і палітычнай энергіяй уласнай дэмакратычнай і ліберальна настроенай інтэлігенцыі. Зянон Пазняк гэткім адмысловым чынам выкруціў тагачасную палітычную сітуацыю ў Беларусі, што кожны, хто прагнуў пераменаў, іншага ладу жыцця ці хаця б проста быў незадаволены тым, што мае, хоцькі-няхоцькі мусіў станавіцца пад бел-чырвона-белы сцяг. БНФ татальна завалодаў палітычнай ініцыятывай. Справа даходзіла да парадаксальнага. Над стотысячным натоўпам рабочых, якія колькі там дзён запар прыходзілі на плошчу Незалежнасці з трывогі за развал Савецкага Саюзу, разгул дэмакратыі і падвышэнне цэнаў, луналі бел-чырвона-белыя сцягі...

Калі б слова "геній" я быў схільны дастасоўваць хоць да якога палітыка, дык наважыўся б прызнаць, што ў тую пару Зянон Пазняк быў геніяльным палітыкам, бо скарыстаўся з сітуацыі значна больш, чым яна насамрэч мела ў сабе для нацыянал-

дэмакратычнага руху. Але адсюль, з гэтага завышанага сітуацыйнага поспеху, вымкнулі і будучыя праблемы БНФ, бо рэальна соцыа-культурная сітуацыя ў Беларусі не мела таго патэнцыялу, які мог бы падтрымліваць гэты рух у заяўленым на пачатку маштабе.

Фігура Зянона Пазняка настолькі значная для той бурапеннай пары (і ці толькі для той?), што я не магу пазбавіцца ад спакусы невялікага расповяду пра ўласную эвалюцыю разумення гэтай асобы і стаўлення да яе.

У кожнага з нас, нацыянальна заангажаваных, быў свой “раман” з Пазняком. Дарэчы, шмат у каго ён цягнецца і дагэтуль. Таму я тут не выключэнне (хаця мне нават не давялося быць ягоным знаёмцам). І, як у кожным рамане, у маім было ўсё: і першае захапленне, і сляпое каханне, і нянавісць, і здрада.

Упершыню я пабачыў Зянона Пазняка, калі ўскараскаўся на плечы сябра, выдатнага паэта Леаніда Дранько-Майсюка. Было тое ў 1988 годзе на Дзяды каля наўмысна зачыненай брамы на Усходнія могілкі. Шыхты міліцыянтаў і амапаўцаў з усіх бакоў сціскалі натоўп будучых нацыяналістаў, каб людзі падушылі самі сябе. Было па-сапраўднаму страшна і карцела як-небудзь уцячы адсюль. Ад страху ды нянавісці народ выенчваў кагадзе дадзенае Алесем Адамовічам азначэнне Беларусі: “Ван-дэ-я, Ван-дэ-я!” (Зрэдзьчас гучала і больш зразумелае для ўсіх беларусаў: “Фа-шыс-ты, фа-шыс-ты!..) І тут скразняком пранеслася: цішэй, цішэй, Пазняк гаворыць... Тады я і папрасіўся ў сябра залезці яму на плечы, каб пабачыць чалавека, які, толькі што вырваўшыся з міліцэйскага палону, не ўцёк да хаты, а добрахоць вярнуўся ў самую гушчыню скрай небяспечных яму падзеяў...

У нейкі момант народ усё-ткі прарваў шчыльную аблогу раз’ятраных супрацівам праваахоўнікаў парадку. Пакуль мы з

сябрам азіраліся на волі, побач прабег падлетак і паведаміў шэптам: “Ідзем на Курапаты”.

Калона недзе з двух тысячаў чалавек выцягнулася па прасёлку ўзбоч кальцавой дарогі, а на самой дарозе сінхронна і роўнавяліка рухалася калона з машынаў, дзе былі і закратаваныя вязніцы на колах, і “вадамёты”, і аўтобусы, бітма наладаваныя міліцыянтамі, амапаўцамі, вайскоўцамі.

Досыць хутка кіраўніцтва карнай аперацыяй, напэўна, перакаланалася, што людзі ідуць на Курапаты — і тады механізаваная калона набрала хуткасць ды знікла, каб перагарадзіць дарогу “нефармалам” (пакуль яшчэ гэтак называлі будучых “бэнээфаўцаў” і нацыяналістаў) на падыходзе да месца схарону ахвяраў сталінскага тэрору... І тут Пазняк, апрача мужнасці, прадэманстраваў і не абы-якія якасці стратэга. На першай выспе ён запыніў людзей, папрасіў сабрацца гуртам, апусціцца ўпрысядкі (каб было добра відаць выступоўцаў) і спакойна правесці мітынг.

Чырвонае сонца хілілася долу. З чыстага сіняга неба зрэдзьчас зляталі сняжынкі. Стаяла напятая цішыня. Свет знерухомеў, і ў гэтым нерухомым свеце на голай выспе прыселая сціжма людзей слухала Пазняка, які ўзвышаўся над усімі, як помнік самому сабе.

Мы быццам вярнуліся ў біблейную пару,— падумалася мне. — І гэта не Пазняк, а прарок Майсей заклікае народ Ізраіля пабрацца з мужнасцю...

Але хутка мне ўжо было не да містычных аналогій, бо раптам здалёк пачуўся мерны тупат. Я азірнуўся — зверху на нас рухалася чорная сцяна (суцэльны чорны акрас карнікаў быў ад святла нізкага сонца насупраць). І тады мной апанавала відушча — у адначассе я зразумеў, што пакуль мы не раструшчым гэтую

чорную сцяну ў друз і пыл, датуль не мецьмем людскага жыцця.

Сцяна наблізілася ўшчыльную і пачала ссоўваць народ з выспы. Пазняк заклікаў да спакою, аднак шмат хто запанікаваў і кінуўся бегчы ў бок падлеску наўзбоч кальцавой дарогі.

Яшчэ ніхто не дабег туды, як з кустоўя выскачылі вайскоўцы (і калі яны паспелі там схавацца?!) ды пачалі біць і валіць уцекачоў на падмерзлую глебу (і жанчынаў — на маіх вачах)...

Потым, калі супраціў уладам выявіцца сістэмна і ўцякаць ад амапаўскіх дручкоў станецца гэтаксама звыкла, як хавацца ад дажджу, той уласны страх і тое захапленне мужнасцю іншага будуць падавацца трохі наіўнымі... Але тое будзе потым, калі шмат чаго перайначыцца і ў самім часе, і ў кожным з нас.

Перамены ў маім стаўленні да Зянона Пазняка выспелі спакваля. Спачатку не на добры лад уразіла, што падчас публічных прамоваў ён зашмат “акцёрстваваў”, раз-пораз карыстаючыся рытарычнымі прыёмамі, вынайдзенымі схаластамі яшчэ ў антычнай Грэцыі. (З гэтага атрымлівалася, што Пазняк казаў праўду так, быццам хлусіў, а ягоны апанент Лукашэнка, які пра рыторыку нічога не ведаў, хлусіў так, быццам казаў праўду). Пазней пачалі засмучаць сваёй прымітыўнасцю і аднастайнасцю не вартыя палітыка нацыянальнага маштабу антыкамунізм і антырасейскасць. А яшчэ праз нейкі час сфармавалася разуменне, што ўзурпацыя Пазняком (праз БНФ) нацыянальнай ідэі нясе пагрозу самой нацыянальнай ідэі, аб чым сведчыла хаця б тое, што ў ”народзе” ўжо неўзабаве пасля афармлення шырокага нацыянальнага руху бел-чырвона-белы сцяг, Пагоню і нават саму беларускую мову пачалі называць “бэнээфаўскімі”...

У майго ўлюбёнага барда Віктара Шалкевіча ёсць вядомая песня “Таварыш Сапега” — там Лукашэнку ўначы трызніцца

"злавешчая цень Пазняка". Дык вось, аднойчы настаў момант, калі я з усёй вастрынёй адчуў, што "злавешчая цень Пазняка" навісла не столькі над Лукашэнкам, колькі над усёй Беларуссю, і найперш — над Беларуссю нацыянальнай.

Гэтай жорсткай метафарай я не маю намеру ні пакрыўдзіць, ні абразіць, ні, тым болей, прынізіць Зянона Пазняка і яго выключную ролю ў фармаванні сучаснага нацыянальнага дыскурсу. Пэўна, з глыбокай павагі да яго (хаця і не пазбаўленай антаганізму да некаторых з тых метадаў і мэтаў, якіх ён упарта трымаецца па сёння), я не павінен быў карыстацца гэтай метафарай, прынамсі, публічна. І не надта хачу гэтага рабіць. Аднак я змусіў сябе, бо ў гэтым перакуленым паэтычным тропе мне выразна чуецца непадманная характарыстыка сітуацыі...

І апошняе, што да "праблемы Пазняка". Я зусім не містык і трансцэндэнтныя аргументы ды высновы не з майго арсеналу. Але тут я гатовы схібіць перад сабой, каб заўважыць, што ў палітыцы адбываецца часам тое ж самае, што і ў прыродзе, калі раптам нейкая папуляцыя пачынае падвойваць (ці шматкроць павялічваць) сваю колькасць дзеля падвышэння трывучасці віду на выпадак самых розных неспрыяльных абставінаў. Так было і ў нашай сітуацыі. Для эпохі радыкальнага пераломy ў Беларусі гісторыя падрыхтавала двух кангеніяльных палітыкаў: Зянона Пазняка і Аляксандра Лукашэнку. Калі б Беларусь (як Латвія ці Эстонія) у пераважнай сваёй бальшыні выявіла схільнасць да нацыяналізму, дык уладу ў краіне ачоліў бы Зянон Пазняк. Пры іншай хадзе падзеяў (пры шырокім астракізме моўна-этнаграфічнай мадэлі дзяржаўнага ўладкавання) у запасе чакаў (не лішне доўга) Аляксандр Лукашэнка. Але і ў першым, і ў другім выпадку мы, у канцэптуальным плане, мелі б прыкладна адно і тое ж самае. Хіба толькі цяперашнія героі ўлады памяняліся б месцамі з цяперашнімі яе ахвярамі.

Згадаўшы Зянона Пазняка, ніяк не выпадае абмінуць хоць якім слоўкам ягонае alter ego — Аляксандра Лукашэнку, першага прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Нeяк, калі адзін і другі былі яшчэ толькі дэпутатамі Вярхоўнага Савету і не надта варагавалі міжсобку, пры абмеркаванні нейкай канцэптуальнай праграмы, зачытанай Пазняком, Лукашэнка з трыбуны заявіў, што гэта выдатная праграма, але для яе патрэбны зусім іншы народ.

Цалкам слушна казаў будучы прэзідэнт. Усе праграмы нацыянал-дэмакратаў мелі за адрасата хутчэй іншапланецянаў, чым паспалітых беларусаў, якія ў сваёй бальшыні не жадалі ніякіх радыкальных пераменаў, апрача хіба адной — памяняць вэрхал і разрух, якія з “развалам Саюзу” запанавалі ва ўсіх сферах жыцця, на тыя стабільнасць і пэўнасць, што яны зазналі раней.

Кардынальная розніца паміж Пазняком і Лукашэнкам палягала на тым, што Пазняк абяцаў беларусам тое, чаго яны ніколі яшчэ не мелі, а Лукашэнка хваліўся вярнуць тое, што яны ўжо мелі і што ў насталым бязладдзі выдавала на сапраўднае шчасце.

Натуральна, абачлівыя да цацанак-абяцанак беларусы ўхапіліся за сініцу і абралі Аляксандра Лукашэнку на ўладу.*

* Амаль пра тое самае кажа і Васіль Быкаў у кнізе ўспамінаў “Доўгая дарога да дому”: “Беларускі народ у сваёй масе напрыканцы XX стагоддзя меў клопат не так з праблемай адраджэння, як з праблемай выжывання. Хоць як-небудзь, хоць з бальшавіцкім рылам, але каб не ператварыцца ў мерцвяка, што ўвогуле было рэальна. Па сутнасці, ішоў працэс памірання (ва ўсіх сэнсах), і важна было клапаціцца, як затрымацца на краю пагібелі, а не дбаць пра колішнюю веліч часоў Вялікага Княства Літоўскага. Народ тое адчуў інстынктыўна і таму на першых прэзідэнцкіх выбарах у масе сваёй не пайшоў за Пазняком і Беларускім народным фронтам з іх віртуальным нацыянал-дэмакратызмам, архаізацыяй і без таго не надта

палагоджанай мовы, чым сталася, на думку некаторых, вяртанне да граматыкі Тарашкевіча. З часоў Тарашкевіча шмат што змянілася ў свеце, у тым ліку і ў беларускай мове, з чым прагматычнаму палітыку немагчыма было не лічыцца. Народ пайшоў за жорсткім, напірыстым, прагматычным дырэктарам саўгасу, ідэі якога былі простыя, як мычэнне каровы і зразумелыя да рэшты.

Без увагі да нацыянальных прынцыпаў Лукашэнка кінуўся да Расеі, найперш каб выбіць адтуль асабістую падтрымку, а таксама хлеб, бензін, газ, без якіх немагчыма было не толькі "адраджацца", але і перажыць зіму да вясны. Вядома ж, разумнейшыя адчувалі, што ён адбірае у Беларусі суверэнітэт, будучыню і пазбаўляў дэмакратыі. Але што карысці з дэмакратыі, калі плакалі галодныя дзеці? Несумненна, будучы дэмакратамі, лідэры БНФ не зразумелі, што дэмакратыя — гэта не справядлівасць, а арыфметыка, што нацыянальную будучыню цяпер вырашаюць лічбы, а не ідэі, якія б разумныя яны не былі.

Пра высокія нацыянальныя ідэі мусіла дбаць нацыянальная эліта, нацыя ж дбала пра элементарную мэту — выжыць. Дужа сумніўна, што тае мэты мог дасягнуць нацыяналіст Пазняк, затое дамагчыся яе абяцаў прагматык Лукашэнка. Тое, што ягоныя метады па сутнасці дэмагагічныя, тады мала хто ведаў".

## 20. МОВА (ЗНАК БЯДЫ)

Калі ў мяне атрымлівалася завітаць у мястэчка Свіслач, дзе я нарадзіўся і асталеў, дык нябожчык бацька зазвычай сустракаў мяне словамі: "Беларус прыехаў". Ён не казаў: "сын", "пісьменнік", "мянчук", урэшце — "валацуга". Усё астатняе не было для яго вартай увагі адметнасцю, раўнуючы з тым, што я — "беларус".

З гэтага вітання я трохі злаваўся і часам мне карцела запытацца: "А вы што, бацька, з неба зваліліся? Ці ж не такі вы самы беларус, як і я?"

Але не пытаўся, паколькі разумеў — бацька мае рацыю. Бо з даўніх давён так павялося, што азначэнне "беларус" у нас найперш адсылае да экзістэнцыйнага выбару чалавека, яго

ідэалагічнай заангажаванасці, палітычнай залежнасці, свядома абранай экзатычнай мовы і з гэтага — да адметнага спосабу мыслення і ладу жыцця, а толькі потым да нацыянальнай кадыфікацыі, якая сама з сябе ні пра што не кажа.

Быць беларусам у Беларусі — гэта выключыць сябе з нормы і паўз уласную хэнць быць для некага місіянерам новай веры, для кагосці варожым прыблудай, а для ўсіх астатніх — ат такім сабе блазнам. Нават сам зварот да беларускага слова ў Беларусі ёсць ні чым іншым, як грамадзянскім учынкам (і яшчэ — эстэтычным актам).

Ва ўсім свеце чалавек, размаўляючы на роднай мове, проста размаўляе. У нас зусім інакш. Кожны раз, калі на людзях мы прамаўляем па-беларуску, дык не проста сумовімся, а як бы ладзім грамадзянскую акцыю ці мастацкі перформанс, паколькі ўвага ўсіх, хто выпадкова апынуўся побач, адразу засяроджваецца на нечаканым дзіве. Таму зусім не выключана, што ў нейкую, магчыма, і не зусім аддаленую пару, каб размаўляць па-беларуску на людзях, трэба будзе браць дазвол у гарадскіх уладаў з адзнакай месца і часу, як сёння патрабуецца “заяўка” на палітычны пікет ці аматарскі канцэрт на вуліцы.

Уласна, быць беларусам — гэта штодня выконваць ролю беларуса ў бясконцым спектаклі без пачатку і канца... Гэта жыць і памерці на сцэне з родным словам на вуснах. Але і па смерці твая місіянерская доля не мусіць быць перапыненай, і на помніку тваё імя і прозвішча абавязкова напішуць на матчынай мове.

Зыходзячы з гэткай сітуацыі, якая панавала спрэс на пачатку дзевяностых, паўсталы з “перабудовы” нацыянал-дэмакратычны рух наперад усяго высунуў праблему ***мовы***. Зрэшты, гэта выглядала цалкам натуральным яшчэ і таму, што першыя ідэолагі Адраджэння за аснову нацыянальнага ўладкавання абралі “***моўна***-этнаграфічную” канцэпцыю, згодна з якой без вырашэння праблемы мовы не вырашалася нічога ўвогуле...

Даўно ў прамінулым засталася “беларусізацыя” 20—30-х гадоў XX стагоддзя, калі абеларушчванне сацыяльна прывілеяваных слаёў краю было актуальнай дзяржаўнай палітыкай (сацыяльны под тады яшчэ сам па сабе быў стыхійна беларускім).

Тая “беларусізацыя” скончылася жахлівымі рэпрэсіямі над усімі героямі гэтай маштабнай акцыі, але татальна вынішчыць яе плён атрымалася толькі ў 60—70-я гады, калі пад аблудай глабальнай інтэрнацыяналізацыі адбывалася сістэмная і метадычная русіфікацыя нацыянальных рэспублік.

З шалёнай інтэнсіўнасцю (маўляў, бацькі просяць) беларускамоўныя школы настаўляліся на расейскую мову навучання, тое самае рабілася ў вучэльнях, тэхнікумах, ВНУ, справаводстве, тапаніміцы, газетах, масавай культуры — спрэс, за выключэннем літаратуры.

Між іншым, у тую пару рэспублікай кіраваў Пётр Машэраў. Натуральна, за сваё шчыраванне ён атрымаў ухвалу ад маскоўскіх уладаў (і персанальна ад Мікіты Хрушчова). Але не толькі — ад уласнага народу таксама. Першая ўхвала цалкам зразумелая, а вось усенародная любоў беларусаў да таго, хто актыўна прычыніўся да справы сістэмнага вынішчэння беларушчыны, выглядае нейкім недарэчным парадоксам. Аднак насамрэч нічога парадаксальнага тут няма, хаця абыякавае, а падчас нават і варожае стаўленне беларусаў да ўласнай мовы, не перастае здзіўляць каго заўгодна.

Каб адказаць на пытанне, чаму так сталася, чаму беларусы за камуністамі, у адрозненне, скажам, ад грузінаў не рабілі ніякіх захадаў у абарону роднага слова, мы мусім згадаць, дзе і ў які час сфармавалася ўжо ўласна беларуская мова, а менавіта пару “нічыйнага мораку” (XVIII — канец XIX стагоддзяў), калі пазбаўленая каналаў улады і кніжнай (высокай) культуры, беларуская вёска самахоць напрацоўвала сабе лінгвістычны

канон, з якога потым вымкне і літаратурная мова.

Але для нашай аналітыкі істотны не лінгвістычны момант, а сацыяльны. Таму найперш звернем увагу, што беларуская мова (у адрозненне ад старабеларускай) паўстала і доўгі час функцыянавала выключна як плебейская мова сацыяльнага поду. На ёй размаўлялі адно тыя паспалітыя (вяскоўцы, жыхары апошніх ускраінаў мястэчак і гарадоў), што жылі з мазаля і былі цалкам адлучаныя ад хоць якіх выгодаў прывілеяванага жыцця больш заможных групаў і класаў. З чаго кожны асобны выпадак падвышэння сацыяльнага статусу селяніна ці наёмнага працаўніка перадусім патрабаваў замены ўласнай мовы на нейкую іншую. Адсюль і быў сфармаваны сацыяльны стэрэатып беларускай мовы як таго, што ў кожным разе трэба пераадолець (адрачыся), калі ты жадаеш сабе лепшай долі. І гэты стэрэатып не быў ідэалагічным сімулякрам — ён з дня ў дзень фармаваўся зусім канкрэтнымі праявамі штодзённага жыцця...

Пасля восьмага класу бацькі выправілі мяне з мястэчка ў няблізкі свет — паступаць у тэхнічную вучэльню аж пад Маскву. Праз два тыдні я вярнуўся да хаты без студэнцкага білету, але з неблагой расейскай гаворкай (на тую пару я ўжо ад пуза быў наеты расейскай літаратурай і ў расейскамоўным асяродку мая лінгвістычная інверсія адбылася без аніякіх высілкаў з майго боку). На Бацькаўшчыне я хутчэй па інерцыі, хаця і не без пэўнага форсу, нейкі час працягваў размаўляць па-расейску. Ах, з якім захапленнем і зайздрасцю глядзелі на мяне сябрукі, якой глыбокай і шчаслівай радасцю свяціліся вочы бацькоў, калі яны слухалі маё “оканье”. І толькі праз шмат гадоў, ужо ў пару “перабудовы”, неяк згадаўшы тую сітуацыю, я зразумеў: прычынай захаплення і зайздрасці былі зусім не мае лінгвістычныя здольнасці, а здавён сфармаванае ўсведамленне, што ў чалавека, які лёгка развітваецца са сваёй мовай і гэтаксама

лёгка набывае іншую, ужо ж, напэўна, ёсць варыянты лепшай, за беларускую, долі...

Дарэчы, мая маці сталася самай прывілеяванай *партніхай* мястэчка не толькі з сваіх прафесійных здольнасцяў, але і з лінгвістычных. — Паколькі ўсё мясцовае начальства было з прысланых сюды пасля вайны расейцаў (ці добра абруселых беларусаў), дык яна хуценька засвоіла расейскую мову і тым самым прыгарнула да сябе найбольш заможную кліентуру.

Адным словам, для ўжо ўласна беларусаў тутэйшая мова ад самага пачатку была тым ганебным, зневажальным таўром, якое кожны мусіў вытравіць (ці хаця б старанна прыхаваць), калі жадаў падвысіць сацыяльны статус.

Але гэтая сітуацыя для беларускай мовы, як пакажа час, была яшчэ не з самых горшых. Горшае мову чакала наперадзе, калі ў першай палове XX стагоддзя беларуская нацыянальная ідэя пацярпела шэраг глабальных паразаў (апошнюю — у трыццатыя гады), пасля чаго яе актыўных носьбітаў пачалі татальна рэпрэсаваць і вынішчаць. (Прыкладам, да апошняга чалавека быў знішчаны ўвесь даваенны мовазнаўчы атрад рэспублікі, які працаваў над пяцітомным “Тлумачальным слоўнікам беларускай мовы” — у жывых застаўся толькі адзін тэхнічны работнік). Менавіта тады беларуская мова, якая раней была толькі знакам сацыяльнага аўтсайдэрства, сталася для калектыўнай беларускай свядомасці яшчэ і *знакам бяды*. Бяды рэальнай, блізкай, смяротнай для кожнага публічнага адэпта роднай мовы. У самым лепшым выпадку зацятых карыстальнікаў матчынага слова чакалі занядбанасць і нішчымніца, у горшым — эміграцыя, Сібір ці Курапаты.

А цяпер мы можам вярнуцца да “феномену” партызанскага кіраўніка “партызанскай рэспублікі”. Пётр Машэраў стаўся нацыянальным героем з розных падставаў, але яшчэ (а можа, і

перадусім) таму, што лакалізаваўшы нацыянальнае красамоўства вузкім пісьменніцкім асяродкам, ён насамрэч загнаў у рэзервацыю не беларускую мову, а *беларускую бяду*, якая палягала на гэтай мове. І калі Старшыня Вярхоўнага Савету Рэспублікі Беларусь Станіслаў Шушкевіч паспрабаваў вызваліць мову з рэзервацыі, яго хуценька адлучылі ад ганаровай пасады. Паспаліты беларус калі не розумам ведаў, дык нутром прадчуваў, што як толькі кіраўнік беларускай дзяржавы пачне размаўляць на мове бяды, то неўзабаве ўсёй краінай гора не абярэшся.

Праўда, на пачатку 90-х, з прычыны краху рэпрэсіўнай імперыі, страх перад беларускай мовай, як падставай жорсткіх і татальных рэпрэсій, на нейкі момант змінімізаваўся, што і стварыла ўмовы для разгортвання шырокага адраджэнскага руху і нават легалізацыі беларускай мовы ў якасці адзінай дзяржаўнай. Але як неўзабаве высветлілася, гэта быў не сістэмны, а толькі сітуацыйны пералом. Бо вельмі хутка свядомыя носьбіты беларускага слова зноў зазнаюць здавён звыклыя рэпрэсіі, ганьбу, эміграцыю — і сваімі драматычнымі лёсамі адновяць калектыўны страх перад беларускай мовай, як *мовай бяды*.

Будзем карэктнымі, цяпер сітуацыя значна рознілася ад ранейшай, прынамсі, за мову ўжо не катавалі, а тым болей не расстрэльвалі на *жоўтым пясочку*. Аднак за выняткам скрайнасцяў, сутнасна нічога не змянілася. З аднаго боку, насцярожанае стаўленне да мовы паспалітых масаў і ўлады, з другога — самаахвярнае служэнне роднаму слову тых, хто сэрцам адгукнуўся на яго зmoраны покліч. Дарэчы, апошнія зазвычай свята вераць, што як толькі адэпты беларушчыны атрымаюць уладу, дык матчына мова вельмі хутка запануе на абшарах нашага краю. Але калі думаць не сэрцам, а галавой (як яно быццам і належыць), то давядзецца прызнаць, што такога, бадай, ніколі не будзе. І зрэпрэсаваная генетычным страхам калектыўная памяць тут ужо не асноўная з прычынаў.

Дзеля абгрунтавання гэтай маркотнай тэзы давайце звернемся да тыпалагічна блізкай нам па многіх параметрах Ірландыі. Вось ужо болей як дзевяноста гадоў ля ўлады там знаходзяцца радыкальныя нацыяналісты, а ірландская мова за гэты час у краіне не толькі не запанавала, а наадварот — вымарнела ў нішто. І прычына таму навідавоку — функцыянальныя магчымасці нацыянальнай мовы, раўнуючы з ангельскай, былі непараўнальна зніжаныя ўжо ў пару вызвольных перамогаў ірландцаў, і таму ў справе штодзённага жыццяладу яна не вытрымала канкурэнцыі з магутнай суседкай-заваёўніцай...

Калі мова сістэмна зніжае ўзровень дабрабыту масавага шарагоўца — у гэтай мовы няма перспектывы, прынамсі, гарантаванай.

На праблемнае пытанне: мова ці каўбаса, звычайны шараговец цалкам слушна адказвае — каўбаса. Бо мова створаная дзеля жыцця, а не наадварот. І калі нейкая мова не паляпшае жыццё чалавека, дык навошта яму такая мова? І ўсе самыя палымяныя і пераканаўчыя аргументы рамантыкаў ад нацыяналізму будуць заставацца для паспалітага чалавека пустой балбатнёй, калі з мовы нельга жыць — і жыць добра.

Сітуацыю з паўсюдным адраджэннем беларускай мовы ўскладняе той факт, што сёння чалавецтва на злом галавы кінулася ў глабалізацыю, якая канцэптуальна мяняе ролі і значэнні нацыянальных моваў у камунікатыўным алгарытме сучаснага жыцця — натуральна не на іхнюю карысць. Тут даволі праблемаў і для моваў-лідэраў, а што тады казаць пра мовы-аўтсайдэры?..

На гэтым кароткі экскурс у сітуацыю беларускай мовы можна было б і запыніць, каб не муляла яшчэ адна, фармальна нібыта лакальная праблема, але якая даўно перарасла свой натуральны вымер і цяпер як нейкая пачвара знутры выгрызае і без таго здрабнелае данельга цела беларускай мовы... Я маю на ўвазе зацятае супрацьстаянне дзвюх граматык: “тарашкевіцы” і

“наркамаўкі” ці, інакш,— *“класічнай”* і *“нармальнай”*.

У 1918 годзе Браніслаў Тарашкевіч у “Беларускай граматыцы для школ” упершыню сфармуляваў правапісныя нормы літаратурнай беларускай мовы. Натуральна, персанальны граматычны канон, хай сабе змайстраваны, безумоўна, таленавітым філолагам, шмат у каго выклікаў шэраг пытанняў і пярэчанняў, тым болей, што Тарашкевіч у сваіх падыходах пераважна абапіраўся на маўленне віленска-ашмянскага рэгіёну. Таму калі ў 20-я гады пачалася татальная “беларусізацыя” ўсяго беларускага абшару, дык зусім заканамерна паўстала пытанне аб рэформе правапісу. Дарэчы, і сам аўтар “граматыкі” не адмаўляў гэтай патрэбы. У прадмове да пашыранага і перапрацаванага выдання 1929 году ён пісаў, што “сам цяпер бачыць дужа выразна цэлую чараду яшчэ спрэчных пытанняў (у аканні, у правапісе чужаземных слоў і інш.), бачыць патрэбу і магчымасць спрашчэння правапісу, але не бярэцца праводзіць якія-кольвечы паважнейшыя змены такім індывідуальна-партызанскім спосабам, накідаючы свой праект праз падручнік. Гэта павяло б толькі да шкоднага хаосу.

Бо тутака поспех, запраўды, можа быць людзям на смех. Горш за тое: непавязаныя паасобныя змены на лепшае “могуць заграмаздзіць і загарадзіць дарогу да запраўды добрай рэформы”.

У 1926 годзе на міжнароднай канферэнцыі ў Менску (з удзелам *самога* Макса Фасмера) быў зацверджаны новы правапіс.

Дарэчы, падчас папярэдніх абмеркаванняў і падрыхтоўкі канферэнцыі Якуб Колас і Язэп Лёсік сярод іншага прапанавалі скасаваць мяккі знак паміж зычнымі ва ўсіх пазіцыях. Супраць гэтага актыўна выступілі Янка Купала і Вацлаў Ластоўскі.

Прыняты варыянт правапісу мала каго задаволіў і ягоная

дапрацоўка цягнулася да 1930 году, калі быў падрыхтаваны наступны праект, які, па сутнасці, і лёг у аснову "сумна знакамітай" правапіснай рэформы 1933 году. Нядобрая слава гэтай падзеі наўпрост звязаная з палітычным гвалтам над "нацдэмамі", якія ў тую пару ўжо ўвабраўся ў сілу і паўплываў на некаторыя пазіцыі рэформы, заклаўшы ў правапіс тэндэнцыі да русіфікацыі беларускай мовы. З гэтага надалей *палітычная складовая* рэформы сталася дамінуючай у выбары варыянту правапісу як у вольнай ад бальшавікоў Заходняй Беларусі, так і пазней у паваеннай эміграцыі. Тут падыход быў гранічна просты: абы не як у бальшавікоў,— і з гэткім падыходам мусілі змірыцца і тыя, што раней самахоць падтрымлівалі прапанову Коласа ды Лёсіка, і тыя, што да нямецкай акупацыі (якая для многіх скончылася эміграцыяй) паспелі прызвычаіцца да "бальшавіцкай" рэформы і нават зацаніць яе мэтазгоднасць у канцэптуальным плане. Ускосна гэтую "канцэптуальную мэтазгоднасць" падтрымаў і Янка Купала: "Стары правапіс, у якім ня мала было засмечанасці, нацдэмаўскай "самабытнай" архаічнасці, трымаў беларускую мову ў палоне правінцыяналізму, у рамках нацыяналістычнай абмежаванасці". Паперадзе было ўжытае азначэнне "ўскосна", хаця цытаваны тэкст наўпрост адмаўляе старому правапісу ў хоць якіх вартасцях, але не забудземся, што Янка Купала ствараў допіс пад ідэалагічным прымусам, за што выразна сведчыць зневажальная лексіка. Аднак жа ніхто не замінаў Янку Купалу ў ганьбаванні "нацдэмаўшчыны" зрабіць акцэнт на чым заўгодна іншым, а не на *засмечанасці*, *"самабытнай" архаічнасці* ды *правінцыяналізме*.

На мой погляд, правапісная рэформа 1933 году, за выняткам палітычна абумоўленых дурноццяў (часткова скасаваных у 1957 годзе з ініцыятывы Якуба Коласа), і нават нягледзячы на закладзеную ў ёй тэндэнцыю да русіфікацыі, плённа мадэрнізавала беларускую мову, надала ёй дынамізму, так

неабходнага ў пару індустрыялізацыі ды урбанізацыі, і годна падрыхтавала яе да "выбуху камунікацыяў". Зразумела, не абышлося і без не малых стратаў. Асабіста мне найбольш шкада пэўнай метафізічнасці, нейкай цьмянай трансцэндэнтнасці, якія захоўваў у беларускай мове правапіс Тарашкевіча і тым самым абяцаў іх будучае разгортванне ў актуальных рэфлексіях. Але ж галоўная задача літаратурнай мовы — быць прыстасаванай да жыцця, а не да рэфлексавання над жыццём. І такой яна сталася праз рэформу. І ўжо на гэтай мове была створаная вялікая беларуская літаратура... Дарэчы ці не з *засмечанасці*, *"самабытнай" архаічнасці* ды *правінцыяналізму* "тарашкевіцы" паходзіць той, асабіста для мяне вельмі дзіўны факт, што ні ў Заходняй Беларусі за палякамі, ні на пасляваеннай эміграцыі як у літаратуры, так і ў мысленні нічога асабліва вартага, за асобнымі выняткамі, не было здзейснена. І гэта пры тым, што нашыя эмігранты ўжо не мелі над сабой ні рэпрэсіяў, ні цэнзуры і да таго ж многія з іх знаходзіліся ў цэнтрах сусветных эстэтычных ды інтэлектуальных інавацыяў, гэта значыць, наўпрост маглі пераймацца дынамікай мастацкага і мысліўнага рухаў. Аднак нічога падобнага не адбылося — у сваёй абсалютна пераважнай большыні тэксты эмігрантаў так і засталіся ў палоне глыбока перыферыйнай беларускай местачковасці, да таго ж заніжанай архаікай адраджэнскай ідэалогіі, як абавязковага атрыбуту, што літаратурнага, што філасофскага твору.

Ужо ж, напэўна, прычыны ўдзірванелай правінцыйнасці творчага сегменту беларускай эміграцыі палягаюць не толькі ў абсягу праблемы "тарашкевіцы", але мы гэтую надзвычай цікавую тэму пакінем для адмысловага тэксту, а тут вернемся ў дзевяностыя гады XX стагоддзя, калі на хвалі антыкамунізму паўстала ідэя звароту да рэпрэсаванага бальшавікамі (рэформа 1933 году) правапісу.

Як на тую пару, дык нічога нахабнага ў гэткай прапанове не

было, бо то быў час “перабудовы”, калі ўсё зробленае за камуністамі бралася пад радыкальны сумнеў, адмаўлялася і перайначвалася, каб вярнуцца да “сітуацыі каранёў”, яшчэ не скалечаных бальшавіцкай ідэалогіяй. І хаця адэпты “тарашкевіцы” апелявалі да зусім ненадуманых фанетычных стратаў мовы з прычыны скасавання напіснога мяккага знаку паміж зычнымі (і шэрагу іншых стратаў ды скажэнняў), але насамрэч контррэфармацыя ў правапісе спадыспаду рухалася (як у выпадку з Заходняй Беларуссю пад Польшчай ці паваеннай эміграцыяй) палітычным выбарам, гэта значыць — абы не як за бальшавікамі.

Тыпалагічна падобныя моўныя праблемы былі паўсталі і ў шэрагу многіх дзяржаваў, створаных на подзе распушанага СССР, але там яны пазнікалі разам “з пенай на хвалях перабудовы”, а ў Беларусі засталіся. І перараслі з філалагічных у палітычныя.

Гэтак сталася найперш таму, што з “перабудовы” ў айчынную палітыку патрапіла ладная сціжма энергічных філолагаў, падмацаваная літаратарамі, журналістамі і проста гуманітарыямі, для якіх лінгвістычныя праблемы выявіліся таксама не чужымі. Але ў адрозненне ад іншых краінаў, дзе падобнага кшталту палітыкі хутка выпетрыліся з палітычнага жыцця, у нас яны (верагодна, з прычыны задоўжанай папулярнасці “*моўна*-этнаграфічнай” ідэалагемы) затрымаліся на ладны кавалак часу. Адсюль мовазнаўчыя праблемы, як натуральна актуальныя для палітыкаў-філолагаў, праз апазіцыйныя СМІ, суполкі і супольнасці перараслі ў палітычныя. І хаця для большыні шараговых валанцёраў апазіцыі і з унармаванай беларускай мовай хапала праблемаў, яны мусілі засвойваць “тарашкевіцу”, каб забяспечыць сябе радыкальнай апазіцыйнасцю. Больш за тое, у пару пад’ёму нацыянал-дэмакратычнага руху, завабленыя

паноўнай модай на адраджэнне чаго заўгодна, да “тарашкевіцы” пачалі хіліцца і шэраг дзяржаўных выданняў (“Бярозка”, “Мастацтва”, “Культура”...). Здавалася, яшчэ трохі і “тарашкевіца” пераможа “наркамаўку” ды запануе спрэс.

Не запанавала — бо была спароджаная не патрэбамі самой мовы, а пэўнай палітычнай сітуацыяй. І як толькі сітуацыя перамянілася, палітыкі-філолагі, са сваімі філалагічнымі праблемамі апынуліся на самым ускрайку грамадскага жыцця. Праўда, нельга сказаць, што там жа апынулася і “тарашкевіца”. За немалы час актуальнага дамінавання апазіцыйнасці, праз яе на беларушчыну навярнулася некалькі генерацыяў маладых людзей, якія ў горадзе іншай роднай мовы, апрача як арганізаванай правапісам Тарашкевіча, ужо не ведалі (найперш — не чулі). Для іх гэткая беларуская мова — адзіна правільная, тым болей, што ідэолагі адраджэння не ленаваліся раз-пораз падкрэсліваць ейную “ісцінную сапраўднасць”, нагадваючы пра рэпрэсаваную сутву “наркамаўкі”, яе зрусіфікаванасць, засаветазаванасць і да т.п.

Мне няцяжка зразумець пазіцыю заангажаваных “тарашкевіцай” філолагаў як філолагаў (і нават часткова пагадзіцца з ёй у дыскурсе ўласна філалогіі), але я не магу зразумець палітыкаўфілолагаў, якія надзвычай вострую і сапраўды складаную *палітычную* праблему беларускай мовы, як вялікага цэлага, раздрабілі, ускладнілі ды заблыталі сваімі філалагічнымі капрызамі і прыхамацямі.

У сітуацыі, калі мовай апанавала амаль безнадзейная крыза і калі адзіным рацыянальным крокам была апеляцыя да грамадства на той беларускай мове, якую яно хоць трохі ведала з школьных падручнікаў, кнігаў Караткевіча і Быкава, праграмаў радыё і тэлебачання, дадаткова ўскладняць праблему яе канцэптуальнай контррэформай, хоць трохі ўцямнай адно

філалагічна адукаванаму чалавеку — да гэтага трэба было яшчэ дадумацца.

Мая дачка, вучаніца Беларускага гуманітарнага ліцэю імя Якуба Коласа, дзе ад пачатку нелегальна запанавала “тарашкевіца”, летам 2003 году са студэнтамі педуніверсітэту ездзіла ў фальклорную экспедыцыю. А калі вярнулася, дык з сарамлівым посмехам зазначыла:

— Ведаеш, тата, у вёсках нашу беларускую мову ніхто не разумее.

— Натуральна,— буркатнуў я. — Нашыя філолагі сваёй мовай загубілі палітыку, а сваёй палітыкай — мову.

Тэза залішне эмацыйная і таму не надта справядлівая. Сляпое памкненне да прасоўвання “тарашкевіцы” ў “народныя масы” бясспрэчна пагоршыла і ўскладніла агульную сітуацыю з беларускай мовай, хаця прычына самой сітуацыі, зразумела, паходзіць не з канфлікту “нармальнага” і “класічнага” правапісаў. Але пра саму гэтую прычыну ўжо даволі казалася вышэй.

## 21. ГЕРОІ АДСУТНАСЦІ

За палітычнымі мітынгамі, шэсцямі, палемікамі, рэпрэсіямі міналі гады. Беларуская нацыянальная апазіцыя, адна з буйнейшых у тагачаснай Еўропе, якая цягам амаль дзесяцігоддзя магла сістэмна выводзіць на вуліцы Менска дзесяткі тысяч людзей, пакрысе пачала знясільвацца, марнець, чэзнуць і напрыканцы XX стагоддзя ў шырокім публічным плане згарнулася амаль у нішто. Але ніхто з лідэраў некалі ўплывовай нацыянальна-дэмакратычнай апазіцыі так і не схацеў заўважыць ні сваёй паразы, ні таго (куды больш істотнага), што краіна Беларусь ужо спрэс жыве без нас — нацыянальна заангажаваных…

Без нас будуюцца дамы, дарогі і масты, без нас рухаюцца

машыны, цягнікі і лётаюць самалёты, без нас працуюць фабрыкі, заводы, банкі, амбасады і міністэрствы, без нас садзіцца бульба, дзеюцца навуковыя росшукі і бізнесовыя аперацыі. Без нас спартоўцы ладзяць спаборніцтвы, турфірмы — вандроўкі, а філармоніі — канцэрты. Без нас гуляюць вяселлі, спраўляюць хаўтуры, гадуюць і навучаюць дзяцей. Без нас фармуюць замежную палітыку, ствараюць тэлепраграмы, трымаюць эканоміку і выбіраюць прэзідэнта…

Краіна Беларусь жыве без нас. І калі б не колькі палітычных перадачаў на дзяржаўным радыё і тэлебачанні, якія не стамляюцца ганіць “нацыяналістаў”, дык сёння ўжо мала хто б ведаў, што ў Беларусі, апрача проста тутэйшых, ёсць яшчэ нейкія *сапраўдныя* (“шчырыя”, “свядомыя”, “зацятыя” і да т.п.) беларусы, гэта значыць — мы. Тыя некалькі *нашых* радыёстанцый за межамі краіны і тыя некалькі *нашых* газетаў і часопісаў унутры яе працуюць на нас і дзеля нас, а не на Беларусь і дзеля Беларусі. Тое самае можна сказаць і пра ўсе нашыя публічныя акцыі, мітынгі, шэсці, пікеты, перформансы, графіці...

Натуральна, нашай віны ў гэтым аніякай. Мы лепей ад пацераў ведаем, хто адасобіў нас ад беларускага народу — Крэмль, КДБ, Лукашэнка, але найперш сам нацыянальна несвядомы (спаланізаваны, скаланізаваны, зрусіфікаваны, засаветызаваны, манкуртызаваны, халопскі, быдлянскі, задраны і задрыпаны) беларускі народ.

Зразумела, што з *такім народам* мы (як толькі “мы” з’явіліся напрыканцы 80-х гадоў) не жадалі мець нічога супольнага. Але паколькі зусім без народу абыходзіцца не выпадала, дык нам нічога іншага не заставалася, апрача як улегчыся ў *адраджэнне* скампіляванай з размаітых парэшткаў былога вясёлкавай Беларусі, дзе, згодна з нашымі меркаваннямі, мы мелі шанец натрапіць на сапраўдны беларускі народ, якому ў асалоду было б і служыць, і маліцца...

На першы погляд — не ідэя, а цуд, але менавіта з гэтага цуду і распачаўся наш шлях упрочкі ад тутэйшага народу ў ідэальнае нікуды, бо гэтак сфармуляваная ідэя Адраджэння адмовіла рэальнай Беларусі ў хоць якой вартасці. За патрабаваннем вяртання гістарычнай спадчыны, мовы і культурнага досведу мінулага хавалася жорсткая ідэалагічная канструкцыя, у якую не ўпісваліся здабыткі і каштоўнасці тагачаснага беларускага грамадства, бо ўсе ягоныя перамогі, плёны і радасці мелі альбо камуністычнае, альбо каланіяльнае паходжанне. Згодна з выпрацаванай у *падпольных галовах* канцэпцыяй, права "чалавекам звацца" мелі адно героі супраціву расейскай каланізацыі і ахвяры камуністычнага тэрору.

Дзіўна, але глыбока рэпрэсіўную сутнасць ідэі Адраджэння не заўважылі ні яе адэпты, ні яе апаненты — уся ўвага канцэнтравалася на той частцы ідэі, дзе вялося аб "люстрацыі" вынікаў расейскай культурнай і палітычнай экспансіі. Але паколькі асноўным аб'ектам расейскай культурнай і палітычнай экспансіі быў "беларускі народ", дык ён і стаўся першай і галоўнай ахвярай адраджэнскіх рэпрэсіяў, якія, дарэчы, амаль і не кранулі сутвы самога расейскага імперыялізму, супраць якога былі скіраваныя паводле задумы.

Болей за тое, Адраджэнне сталася своеасаблівым інтэлектуальным генацыдам тагачаснага беларускага грамадства, яно адмаўляла ў праве на вартасную ацэнку свайго жыцця не толькі сучаснікам, але і дзесяткам папярэдніх пакаленняў, якія без супраціву жылі пад ярмом усходняга каланізатара. Праўда, у адрозненне ад памерлых, сучаснікі яшчэ мелі шанец рэабілітавацца. Дзеля гэтага трэба было праклясці сваё жыццё за камуністамі, прачытаць кнігу Міколы Ермаловіча "Старажытная Беларусь", перавучыцца з нармальнай беларускай на "клясічную" мову, уступіць у БНФ і падпісацца на газету "Свабода".

На пачатку дзевяностых (XX стагоддзя) шмат хто з паспал-

ітых беларусаў (ці то з сораму за ганебнае мінулае, ці то з гонару за наноў скампіляваную гісторыю, ці то з крыўды за занядбаную Бацькаўшчыну) ступіў на пакаянны шлях да Ідэальнай Беларусі... Але далёка не кожны дайшоў нават да “цвінтару”, а з тых, што дайшлі, мала хто там застаўся.

Рэч у тым, што канцэпцыя Ідэальнай Беларусі, змацаваная на крыжы любові да свайго краю і нянавісці да тых, хто дратаваў яго, добра пасавала для палымяных публічных прамоваў (на мітынгах, у вершах, публіцыстыцы), але выявілася цалкам непрыдатнай для рэальнага жыцця. Бо яна змушала ўсіх іншых тоесніцца ў агульнай любові і нянавісці з тымі, хто яе зладзіў і запрапанаваў. А ў кожнага з “іншых” сэрца яшчэ балела за нешта сваё: за каханую, грошы, уладу, экалогію, Бога, братоў нашых меншых, камунізм, ядравую пагрозу, несмяротнасць, перпетуум мобіле... Таму пакрысе і сыходзілі са шляхоў да Ідэальнай Беларусі тыя, чые сэрцы спачатку адгукнуліся на палымяны покліч, а потым услухаліся ва ўласнае тухканне і зразумелі: нам у іншы бок...

Але ў адзіноце “свядомыя” засталіся не таму, што ад ідэі Адраджэння нехта адступіўся, а таму, што абсалютная бальшыня жыхароў дзяржавы (у якой “нацыяналісты” туліліся па завуголлях), і не збіралася выпраўляцца на адкрытую імі “новую зямлю”. Нават калі б па нечым загадзе іх заштурхалі туды рулямі аўтаматаў, дык яны ўсё адно ўпотайкі паразбягаліся б адтуль па абжытых засценках. Бо тут усё ім было спрэс незнаёмае і нясвойскае. Вакол нейкія Альгерды, Вітаўты, Сапегі, нейкае ВКЛ, БНР, СБМ і безліч няўцямнага іншага. Ну добра, да незнаёмага спакваля можна прызвычаіцца. Але як жыць без таго, што раней напаўняла жыццё сэнсам і значэннем — без майскіх і кастрычніцкіх святаў; без гонару за трактарны і аўтамабільны заводы, якія ты калісь збудаваў і на якіх адпрацаваў ладны кавалак веку; без пашаны за перамогу ў вялікай вайне, якую выйграў асабіста ты; без

успамінаў пра палёты ў космас Гагарына і свайго роднага Кавалёнка... Дый увогуле, што ты забыўся на гэтай голай выспе, адкрытай усім скразнякам свабоды, калі ў цябе была магутная звышдзяржава, якую ты стварыў уласнымі крывёю і потам, і якая праз сваю веліч надавала велічы і табе?..

Дарэчы, тут да пары будзе заўважыць, што наш канцэптуальны разрыў з “беларускім народам” паходзіў не столькі з рознага стаўлення да мовы, гісторыі, ідэалогіі, колькі з вызначэння таго месца, дзе беларусы жылі апошнія дзвесце гадоў. Мы лічылі, што ўсю гэтую пару беларусы заставаліся беларусамі і цяпер займелі свабоду і незалежнасць толькі дзякуючы перманентнаму супраціву расейскай каланізацыі лепшых з нашых продкаў (і трохі — сучаснікаў). А вось “беларускі народ” (і гэта пераважная бальшыня насельніцтва Беларусі), у адрозненне ад нас, меркаваў, што ніякай свабоды ён не займеў, але затое страціў вялікую дзяржаву, з якой лічыўся ўвесь свет. “Беларускаму народу” смешна было нават слухаць пра нейкае там шматгадовае рабства ў расейска-камуністычнай імперыі, бо ладную частку палітычнай, эканамічнай ды інтэлектуальнай эліты Расеі складалі беларусы па паходжанні, а сама Беларусь у канфігурацыі імперыі займала адно з самых паважных месцаў, была індустрыяльна мадэрнізаванай і мела ці не найвышэйшы ўзровень дабрабыту сярод астатніх рэспублік Савецкага Саюзу. Нельга сказаць, што “беларускі народ” быў рашуча настроены супраць незалежнасці, але і адмаўляцца ад сваёй вялікай гісторыі ў супольнасці з Расейскай імперыяй ён не жадаў. Тым болей, што мы яму прапанавалі памяняць ролю вялікага воя і вялікага дойліда (які за гэтыя два стагоддзі ці то пабраў, ці то вызваліў палову свету, засвоіў касмічнае прадонне і збудаваў першую ў свеце камуністычную цывілізацыю) на ганебную ролю скаланізаванага раба, які сам з гэтага рабства нават вызваліцца не здолеў.

Карацей кажучы, мы паклікалі “беларускі народ” у краіну, дзе ніхто не жыве, акрамя гістарычных і літаратурных зданяў ды прывідаў. І зусім натуральна, што ён не адгукнуўся на наш покліч у нікуды. А мы яго за гэта незалюбілі і нават трохі ўзненавідзелі. Якімі толькі словамі мы ні бэсцілі гэты балотны народ, што не хацеў караскацца за намі на голыя выспы свабоды! “Народ” нейкі час абыякава трываў нашую лаянку, а потым узяў ды адсунуўся ад нас падалей. І, здаецца, назаўжды.

Але ці магло быць інакш, ці магла хада падзеяў разгарнуцца ў спрыяльным для нас кірунку? Бадай што — не. І найперш таму, што іншымі не маглі быць мы самі. Падмурак, на які мы абапіраліся ў сваім паўстаўанні над вярэдзівам часу, мацаваўся трыма кутнымі камянямі: антыкамунізмам, антыкаланіялізмам і нацыяналізмам. Без гэтых двух “анты” тады быў немагчымы трэці складнік. Калі фармавалася ідэя Адраджэння (Ідэальнай Беларусі), хіба можна было ўявіць сабе такую канцэпцыю Беларускай Дзяржавы, якая б адначасна спалучала ў сабе плён супольнай беларуска-савецкай і нацыянальна-гістарычнай спадчыны. Хіба што як здзек тады магла быць успрынятая прапанова задзіночыць у межах аднаго дыскурсу ВКЛ і БССР, Слуцкае паўстанне і савецкую партызанку, Астрожскага і Жукава, Рэч Паспалітую і СССР, Скарыну і трактар “Беларусь”, Грунвальд і вясну 45-га... Жорсткае размежаванне з “беларускім народам” з аднаго боку па лініі “антыкамунізму”, а з другога — па лініі “антыкаланіялізму” было наканаванае нам тым часам, у якім мы падымаліся з каленаў. І памяць пра тое, чым мы падымаліся, будзе трымаць нас да скону (прынамсі, ідэалагічнага), нават калі гэты скон прыспешыцца ўчэпістасцю нашай памяці.

# 22. БЕЛАРУСЬ ЯК ПРАСТОРА САКРАЛЬНАГА

Будзем карэктнымі, на той час (самы канец 80-х — пачатак і сярэдзіна 90-х гадоў) каштоўнасці роднай мовы, уласнай гісторыі, аўтахтоннай культуры, незалежнай нацыянальнай Дзяржавы выглядалі відавочнымі не адно для адэптаў Адраджэння, але і для досыць шырокіх "грамадскіх масаў". Таму высілкі адпаведных палітычных згуртаванняў былі скіраваныя нават не столькі на папулярызацыю і прапаганду нацыянальнай ідэі, колькі на супрацiў расейскай каланізацыі і камунізацыі, якія бачыліся галоўнымі перашкодамі для вольнага і натуральнага самавыяўлення раней зрэпрэсаванай нацыянальнай свядомасці.

Зрэшты, сама хада палітычных падзеяў мацавала ўпэўненасць у каштоўнасці нацыянальнага як канцэптуальнай вартасці для ўсяго беларускага грамадства: распад камуністычнага блоку, а затым і Савецкага Саюзу на мноства незалежных нацыянальных дзяржаваў, шматтысячныя шэсці пад бел-чырвона-белым сцягам ды "Пагоняй", стварэнне суверэннай Рэспублікі Беларусь, старшынёй Вярхоўнага Савету якой становіцца дэмакрат і свядомы беларус, дзяржаўнасць беларускай мовы і выразная тэндэнцыя да глабальнай беларусізацыі і г.д., і да т.п.

Карацей кажучы, бальшыня тагачасных фактаў і падзеяў як быццам адназначна сведчыла, што, нягледзячы на адчайны супраціў старой партнаменклатуры і геапалітычныя інтрыгі Масквы, ідзе актыўнае фармаванне грамадскай думкі на грунце нацыянальнай ідэі. І нават змена, на фармальна бязглуздай падставе, залішне нацыянальна свядомага і залішне дэмакратычнага старшыні Вярхоўнага Савету (Станіслава Шушкевіча) на трохі менш свядомага і трохі менш дэмакратычнага (Мечыслава Грыба), а затым выбары (заакцэнтуем — адносна свабодныя выбары) першым прэзідэнтам

чалавека (Аляксандра Лукашэнку), які пабудаваў праграму на радыкальнай мінімізацыі дэмакратыі і незалежнасці, як і наступныя рэферэндумы аб скасаванні нацыянальнай сімволікі ды (фактычна) беларускай мовы праз наданне статусу дзяржаўнай мовы расейскай, падтрыманыя грамадствам, — не схілілі нацыянальную палітычную эліту да ўзважлівай ацэнкі таго, што насамрэч адбываецца? Але і цяпер, калі ад нацыянал-дэмакратычных партый, рухаў ды аб'яднанняў засталіся адно руіны, не відаць, каб нехта ўсур'ёз задаўся пытаннем, а чаму гэта беларускае грамадства ў сваёй пераважнай бальшыні адхіліла нацыянальную ідэю як форматворную дамінанту пабудовы новага ладу жыцця? Іншымі словамі, чаму ідэя, па ўсіх класічных канонах прыдатная легчыся ў аснову фармавання салідарнай грамадскай думкі, у канкрэтнай сітуацыі Беларусі выявілася ў форме навязвання грамадству рэпрэсіўнай ідэалогіі Адраджэння, на што ўжо зважалася трохі раней?

Але даводзячы, што абраны ідэолагамі Адраджэння фармат нацыяналізму апынуўся не прыдатным для беларускай сітуацыі, я зусім не маю намеру сцвярджаць, што ў Беларусі мае шанец запанаваць нейкая іншая выразная ідэалогія: камуністычная, ліберальная, славянафільская... Ні ў якім разе.

Рана ці позна, але ўсім (нацыяналістам, камуністам, лібералам, дэмакратам, анархістам, глабалістам, хрысціяністам, заходнікам, русафілам...) давядзецца змірыцца з тым, што іншай, апрача як ***сацыяльнай***, беларуская дзяржава быць не можа, бо для абсалютнай бальшыні насельнікаў нашай краіны прыярытэтнымі як былі, так і застануцца не нацыянальна-культурныя ці ідэалагічныя, а *сацыяльныя каштоўнасці*. Адсюль лагічна вынікае, што асобам, заангажаваным Беларуссю, як вялікім цэлым, трэба было б паспрабаваць скансалідаваць грамадскую думку на падставе *сакралізацыі* той рэальнасці, якую мы маем, гэта значыць не выдумляць нейкія апрычоныя праекты

новага Беларускага Дому, а памкнуцца ўсім разам *сакралізаваць* тую Беларусь, якая ў нас ёсць, і такой, якая яна ў нас ёсць.

Як нацыянальна заангажаванага беларуса мяне наяўная рэальнасць Беларусі глыбока абражае сваёй здэнацыяналізаванасцю; як апалагета дэмакратычнага ўладкавання соцыуму яна мяне ўсур'ёз трывожыць сваёй антыдэмакратычнасцю; як прыхільніка лібералізацыі эканомікі і ўсяго дыскурсу грамадскага жыцця яна мяне засмучае адсутнасцю рэальнай лібералізацыі. Але ўсё гэта разам (і безліч не згаданага тут іншага) бачыцца мне бядой значна меншай, чым татальная *прафанацыя* Беларусі як у кожным яе лакальным фрагменце, так і ў фармаце ўніверсальнага цэлага.

Традыцыя прафанацыі Беларусі мае даўнюю гісторыю, згадаем хаця б кансервацыю максімальна зніжанага міфу пра Беларусь, у сваю пару створанага Францішкам Багушэвічам. Але мы не станем наноў вяртацца да ўсёй неабсяжнасці гэтай тэмы, а заакцэнтуем увагу толькі на адным яе невялічкім фрагменце, зусім блізкім нам па часе...

Калі Аляксандр Лукашэнка займеў уладу, дык апазіцыя (у мностве сваіх ідэалагічных мадыфікацыяў), каб яго перамагчы, не змагла прыдумаць нічога лепшага, як ва ўсіх зручных для яе формах і тэхналогіях, але найперш у недзяржаўных СМІ, пачаць з дня ў дзень ганіць і ганьбіць не столькі ўладу і непасрэдна Лукашэнку, колькі ўсю краіну і ўсё грамадства, пэўна, спадзеючыся, што чым больш жахлівым будзе выглядаць той свет, у якім мы жывём, і тыя людзі, сярод якіх мы жывём, тым хутчэй народ паўстане супраць таго, хто ўжахлівіў нашае жыццё. Каб падмацаваць гэтую тэзу прыкладамі, няма патрэбы кудысьці заглыбляцца, даволі нагадаць хоць колькі з безлічы тых слоганаў, што ва ўсіх на слыху: “балота”, “быдляндыя”, “хамскі народ”, “жлобская нацыя, “саветыкусы”, “калгаснікі”, “саўкі”, “крэолы” і да т.п.

Беларусь мусіць быць удзячнай сваім грамадзянам, што яны амаль забыліся на апазіцыйныя газеты, перасталі хадзіць на апазіцыйныя мітынгі і галасаваць за апазіцыйных кандыдатаў. Бо з гэтага пазбягання паспалітым людствам хоць якіх ініцыятываў палітычнай апазіцыі вынікае спадзеў, што апазіцыя сваімі вербальнымі вывяржэннямі забрудзіла не ўсю краіну, а толькі ўласныя глузды і душы.

Ужо даўно зразумела, што “Луку на муку” перамелюць не жорнавы апазіцыі, а ветракі часу. І некалі ж гэта здарыцца. Але калі мы разам не вывернем устойлівую стратэгію шальмавання ўсіх і ўсяго на шляхі павагі да суайчыннікаў і гонару за тую рэальную Беларусь, якой яна ёсць цяпер, дык і пасля змены ўлады не выкараскаемся з таго бруду, які плённа прадукавалі ўсе папярэднія гады. Здаецца, няцяжка зразумець, што ў сітуацыі татальнай спрафанаванасці ўсёй сацыяльнай прасторы такія сакральныя рэчы, як Дзяржава, не паўстаюць.

Звяртаючы ўвагу на татальную прафанацыю Беларусі як на рэальную пагрозу яе дзяржаўнасці не толькі сёння, але і заўтра, я не хацеў бы, каб мае словы палічылі чымсьці накшталт закліку да перайменавання чорнага на белае, а белага на ружовае (гэтым дастаткова актыўна займаецца кожная паноўная ўлада). Праблема палягае не ў перамене знакаў, а ва ўсведамленні, што інтэнсіўная прафанацыя беларускай рэальнасці адбываецца зусім не таму, што яна насамрэч ёсць такой, а таму, што пэўным суб’ектам глабальнага палітычнага поля як знадворку (з Усходу ці Захаду), так і знутры (нацыянал-дэмакратам, сацыял-дэмакратам, лібералам, камуністам...) неабходна нагружаць Беларусь прафанным зместам, бо толькі ў прасторы прафаннага яны могуць спадзявацца некалі аб’явіць свой апрычоны праект Беларускага Дому як адзіна магчымы варыянт яе сакралізацыі.

На жаль, ні досвед паразы ідэі Адраджэння, ні досвед іншых ідэалагемных паразаў, як і гістарычны досвед увогуле, не

спыняюць марных спадзяванняў нашых палітыкаў на ідэалагемную манапалізацыю гэтага краю, хоць шмат хто з іх добра ведае, што цягам усёй сваёй гісторыі прастора Беларусі, лічы, ніколі не была монаэтнічнай, монарэлігійнай, монасацыяльнай, монамоўнай і г.д.

Таму нам нічога не застаецца, як меркаваць, што і ў перспектыве:

— Беларусь ніколі не будзе толькі беларускай, але і ніколі яна не будзе толькі расейскай ці польскай...

— Беларусь ніколі не будзе толькі праваслаўнай, але і ніколі яна не будзе толькі каталіцкай ці пратэстанцкай...

— Беларусь ніколі не будзе толькі празаходняй, але і ніколі яна не будзе толькі праўсходняй ці якой там яшчэ...

Гэтую гульню ў адмаўленне хоць якіх татальнасцяў у Беларусі можна доўжыць і доўжыць, аднак мы тут прыпынімся, каб сказаць наступнае...

Асноўны цяжар праблемаў сучаснай Беларусі паходзіць з таго, што бальшыня нашых палітыкаў, інтэлектуалаў і проста актыўных грамадзянаў лічыць, быццам тая Беларусь, якую мы маем, гэта толькі руіны каланізацыі, калектывізацыі, камунізацыі і г.д., на якіх адно некалі ў будучым магчыма зладзіць спраўны Беларускі Дом. Іншымі словамі, амаль усю папярэднюю хаду падзеяў на Беларусі яны ўспрымаюць як суму скажэнняў яе нейкай віртуальна сапраўднай гісторыі...

Я ж са свайго боку не даю веры такому падыходу, бо схільны лічыць усе ранейшыя паразы, акупацыі, генацыды ды ўсялякае падобнае іншае не скажэннямі беларускай гісторыі, а самой гісторыяй, аднолькава сапраўднай, аднолькава нашай, як і нашыя перамогі, здзяйсненні, здабыткі. Таму для мяне тая Беларусь, якую мы цяпер маем, выяўляецца не руінамі лакальных дэфармацый апошніх некалькіх соцен гадоў, а сакральным вынікам усёй тысячагадовай (як мінімум) гісторыі гэтай прасторы.

А ўсё сакральнае варта шанаваць такім, якое яно ёсць. Бо той, хто не шануе сакральнае, абірае сабе радзімай прафаннае.

## 23. ВЯЛІКАЯ ЗДРАДА

Колькі (не падлічыць) беларусаў за апошнія паўтара стагоддзі ахвяравалі сваімі жыццямі дзеля аплікацыі нацыянальнай ідэі ў штодзённае жыццё краю!?. Зазвычай яны цяжка жылі і нядобра паміралі, закатаваныя (калі не фізічна, дык маральна) чарговай паноўнай уладай. Але як бы ні складваліся лёсы, усе тыя героі (добра вядомыя ўсім нам і нікому зусім невядомыя), свята верылі, што рана ці позна іх мара ўцялесніцца ў існую рэальнасць і беларуская мова, культура, гісторыя будуць дамінаваць на кожным лапіку роднай зямлі, атуленай ад злыбяды гісторыі сваёй нацыянальнай Дзяржавай.

Гэтай надзеяй яны і трымаліся — і ў самім жыцці, і на самым апошнім яго скраені. І сваёй трываласцю ўздымалі да веры ўсё новых ахвяравальнікаў уласных лёсаў... Аднак, падобна, надыходзіць пара **вялікай здрады*** ўсім тым высокім мроям і спадзяванням, дзеля ўвасаблення якіх праз стагоддзі не ашчаджалі сваіх жыццяў лепшыя з беларусаў (а значыць, і здрада кожнаму з іх персанальна)...

Формула гэтай здрады кранальна простая — *Беларусь ніколі не будзе* **толькі** *беларускай*!

Што і казаць, у гэтай роспачнай казані няма нічога арыгінальнага — "ворагі беларушчыны" вунь калі ўжо сцвярджалі гэтаксама і нават куды больш радыкальна, бо заўжды праміналі ўвагай слова "толькі".

І ўсё ж такі навіна тут ёсць — і не абы якая. Бачыце, у маўленні істотна не *што* гавораць (усе людзі ад веку кажуць прыблізна адно і тое самае), а *хто* гаворыць і ад імя каго? Дык вось, за ўжо досыць доўгую гісторыю айчыннага нацыяналізму

разуменне, што “Беларусь ніколі не будзе *толькі* беларускай”, адно ў наш час пачало фармавацца ўнутры яго самога і публічна абнаяўлівацца не супраціўнікамі ці “калабарантамі”, а зацятымі апалагетамі нацыянальнай ідэі. З рознай мерай абачлівасці і ў кожным разе з адметнай інтэрпрэтацыяй уласнага здумлення, але ўсе яны (пакуль не шматлікія) сведчаць за *сістэмны перакрут* ў ацэнцы магчымасцяў разгорткі нацыянальнага ў Беларусі. І хаця футурыстычныя прыкіды наступных шляхоў і перспектываў беларускага нацыяналізму пакуль адбываюцца ў россып, аднак сам гэты, увогуле гранічна сумны факт радыкальнага злому, абнадзейвае, бо кажа пра развітанне з вялікай рамантычнай ілюзіяй, якая ўжо даўно набрыняла згубай для ўсёй беларушчыны.

Натуральна, што калі з досведу трагічнага прамінулага пачало выспяваць досыць прыкрае ўсведамленне — *відаць, збеларусіць усю Беларусь ніяк не атрымаецца*, дык перад кожным, хто гэтак думаў, рубам паўстала пытанне: а тады як?

(Між іншым, апошняе ўжо само па сабе сталася надзвычай істотным, бо ва ўсе ранейшыя часы праблема выглядала безальтэрнатыўнай: альбо ўсё — альбо нічога. І тады капец Беларусі, паколькі ніякія іншыя, сінтэтычна-кампрамісныя варыянты нацыянальнага ўладкавання нават не браліся пад ўвагу. А адсюль і адчай, і расчараванні, і сыход упрочкі былых вернікаў нацыянальнай ідэі, як толькі сітуацыя ў сваёй безальтэрнатыўнасці апынулася тупіковай...)

Гэты фрагмент (зрэшты, як і ўся кніга), уласна, і прысвечаны маёй візіі праблемы, сфармаванай рашучым запытам: “калі не ўсё, то тады як?”. Але перад тым, як ужо наўпрост адказаць на радыкальны запыт, канспектыўна падсумуем усё раней сказанае, толькі ўжо ў праекцыі паразы *татальнасці* традыцыйнай нацыянальнай ідэі.

Гістарычна і геапалітычна Беларусь належыць да еўрапей-

скага логатопу. Менавіта там (тут) быў дэтэрмінаваны інтэграл яе кону. Але пазней наш Край будзе забраны Расейскай імперыяй і тым самым надоўга апынецца адлучаным ад свайго натуральнага месца. Далей усё заладзіцца яшчэ больш пакручаста... Пакуль Расея, праз русіфікацыю краю, занурыцца ў вызваленне ліцвінаў ад плёну польскага каланіялізму, ва ўлонні беларускай вёскі неўпрыкмет дафармуецца ўжо ўласна беларускі этнас. Дзякуючы яму, неўзабаве ў суплёт нацыяў Расейскай імперыі дадасца і беларуская. Аднак расейскі нацыяналізм (у нейкі перыяд пад гаслам камунізму), у змаганні за ўласную манаполію, пакрысе вынішчыць беларушчыну амаль дарэшты. Толькі і ў яго не атрымаецца вынішчыць пакліканне гэтай прасторы да ўласнай суб'ектнасці, якая была дэтэрмінаваная ёй конам...

Вось з усяго гэтага разам у 1991 годзе мы атрымаем уласную Дзяржаву ў сярэдзіне Еўропы, але без хоць якіх выразных прыкметаў нацыі ў яе аснове.

Калі добра ўдумацца, дык па-свойму гэта была жахлівая сітуацыя. Яе, бадай, можна параўнаць з сітуацыяй чалавека, які раптам заўважыў, што ён не мае ценю. Нібыта ўсё ў яго, як у людзей, але ценю няма, і таму чалавек не дае веры свайму жытву.

Таму паўсталай незалежнай Беларускай Дзяржаве, каб займець хоць якую матывацыю ўласнай канстытуяванасці, трэба было тэрмінова запоўніць пустату ўнутры самой сябе чымсьці нацыянальным (як вядома, у XX стагоддзі толькі наяўнасць нацыянальнага легітымізавала дзяржаву). Аднак Рэспубліка Беларусь здарылася залішне хутка, каб у каго быў час падумаць, а ***што*** ва ўмовах нашай сітуацыі можа быць вылучанае ў якасці інтэгральнай формулы нацыянальнага?

Зрэшты, каб час на гэта нават і быў, дык пра нешта падобнае ўсё адно б ніхто не думаў, бо тады нацыянальнае ў нас як

бы a priori таясамілася з мовай, гісторыяй, культурай... А паколькі ўсяго гэтага на тую пару мы не мелі, то і не ўяўлялася іншага выйсця, як тэрмінова ўлегчыся ў *адраджэнне* зніклага ды вынішчанага.

Хваля нацыянальнага Адраджэння была магутнай, але "верхавой" — яна не скаланула глыбіняў шараговага побыту. Здаецца, Аляксандр Лукашэнка адным з першых палітыкаў зразумеў (нутром адчуў?), што як толькі "вецер аціхне", хваля акуратненька ўкладзецца ў звычаёвую роўнядзь тутэйшасці і ад "нацыянальнай пены" не застанецца ані знаку. А з гэтага вынікала, што Дзяржава зноў будзе нічым не легітымізаванай, апрача як фармальнай атрыбутыкай самой дзяржаўнасці... І тады ён пачаў шукаць апірышча Дзяржаве не ўнутры яе "пустаты", а вонкі, гандлюючы з Расеяй адзіным, што ў яго было — голай атрыбутыкай дзяржаўнасці.

Цікава, што два самыя знаныя беларускія палітыкі 90-х гадоў аднолькава спатыкнуліся на тым самым — на паразе ідэі нацыянальнага Адраджэння (і нават аднолькавым чынам!). Уся розніца хіба ў тым, што як толькі дынаміка нацыянальнага руху пайшла на спад, Зянон Пазняк эміграваў за мяжу сам-насам, а Аляксандр Лукашэнка паспрабаваў зрабіць гэта разам з усёй краінай. Але і ў тым, і ў другім выпадку латэнтнай матывацыяй быў фактар "нацыянальнай пустаты", якую яны не ведалі, чым яшчэ можна запоўніць, апрача як *нацыянальным Адраджэннем*.

Не станем зноў вяртацца да пытання, чаму так сталася, што ў нас ніхто нават не дапускаў магчымасці хоць якой яшчэ формы нацыянальнага ўладкавання, апрача "моўна-этнаграфічнай". (Хаця гэты феномен, бясспрэчна, і патрабуе асобнага даследу...) Бо далей я маю намер без усялякіх перадумоваў адразу і катэгарычна заўважыць, што гэтая форма нацыянальнага ўладкавання ў Беларусі ўжо не жыццядайная і, значыць, не прыдатная да фармавання паўнавартаснай Нацыі.

Як засведчыў досвед паразы апошняга Адраджэння, у дыскурсе БССР усе базавыя чыннікі ўласна беларушчыны былі вылегчаныя да той меры, за якой яны страцілі здольнасць самагенерацыі нават у спрыяльных для іх умовах. Гэта значыць, што цяпер канцэптуальна яны могуць існаваць адно ў сітуацыі штучнай падтрымкі, а самі з сябе — толькі ў фармаце лакальных падзеяў. Адсюль заканамерна вынікае, што “моўна-этнаграфічны” канцэпт ужо не можа быць пакладзеным у інтэгральную формулу беларускай Нацыі. А калі мы станем далей трымацца ранейшай практыкі і акумуляваць усе свае сілы на перамогу этнаграфізму, дык сваёй упартасцю самі данішчым беларушчыну дарэшты.

Даволі! “Трэба шукаць на іншых шляхох” (Ігнат Абдзіраловіч).

Як ужо казалася, формаў і спосабаў нацыянальнага ўладкавання мноства. І пра гэта напісана мноства артыкулаў і кнігаў (ахвочых да іх і адсылаю). Я ж тут у прыклад згадаю толькі досвед Лацінскай Амерыкі, дзе нацыі (і, адпаведна, дзяржаўныя ўтварэнні) фармаваліся і не на сваёй мове, і не на аўтэхтоннай культуры, і не на “этнаграфічных межах”, а, з нашага гледзішча, увогуле на чорт ведае чым. Імя таму дзіву — “крэольскі нацыяналізм” (Бенедыкт Андэрсан). Гэта значыць, што не карэнныя індзейцы, і нават не мецісы (плён “сяброўства” беласкурых мужчын з цёмнаскурымі гаспадынямі кантыненту), а крэолы, нашчадкі іспанцаў, пазбаўленыя “гістарычнай радзімы”, панастваралі ў Лацінскай Амерыцы розных дзяржаваў (Аргенціна, Бразілія, Калумбія, Мексіка, Перу, Чылі...), якіх сёння ў свеце ведаюць куды лепш за Беларусь.

Тут нехта можа заўважыць, маўляў, ты яшчэ згадай афрыканскія племянныя нацыяналізмы ці ісламскі транснацыяналізм... Насамрэч, “экзатычны” досвед Лацінскай Амерыкі, нягледзячы на папулярнасць праблематыкі “крэольства” ў беларускіх інтэлектуалаў, наўрад ці дапаможа нам у вырашэнні ўласных

справаў. Але мне згадка пра “крэольскі феномен” спатрэбілася не дзеля пераймання, а каб праз “экзотыку” больш выразна патлумачыць, што ёсць (і магчымыя) іншыя шляхі ад таго адзінага, які для нас ператварыўся ў “ідэю фікс”. І за прыкладамі няма патрэбы далёка хадзіць. Я ўжо не аднойчы згадваў побач з “моўна-этнаграфічнай” (гэтак званай нямецкай) мадэллю нацыянальнага ўладкавання — “французскую” (мадэль “грамадзянскай супольнасці”).

На староннi беларускі погляд, у нацыянальным аспекце паміж немцамі і французамі няма аніякай, прынамсі, прынцыповай, розніцы: і там, і там дамінуюць уласная мова, культура, гісторыя, атрыбутыка... Але насамрэч розніца ёсць — і розніца прынцыповая.

“Французская” мадэль найперш трымаецца двух базавых пастулатаў: *роўнае для ўсіх чальцоў супольнасці грамадзянства і агульнае для ўсіх права*. Усе астатнія чыннікі (этнічнае паходжанне, мова, культурны код, etc.) — другога плану, недамінантныя. Яны могуць быць, прысутнічаць, а могуць і не вытыркацца. Нязменным і абавязковым застаюцца толькі роўнасць у грамадзянстве і аднолькавае падпарадкаванне ўсіх аднаму і таму ж Закону. Адсюль і не этнічны (расавы), а *грамадзянскі* (паспаліты) *нацыяналізм*, які перадусім фармуецца супольнай прыналежнасцю да агульнага цэлага.

Натуральна, і “французская”, і “нямецкая” мадэлі — гэта толькі схемы, якія рэальнае нацыянальнае жыццё ўжо так пазаблытвала, што ў кожным канкрэтным выпадку бывае цяжка разрозніць: дзе тут што? Але ж у нашай сітуацыі якраз пакуль і йдзецца не пра канкрэтыку, а пра асноватвалеглую базавую схему, на якой будзе магчыма аформіць нацыю ўжо ў нешта завершанае цэлае.

Дык вось, улічваючы, што беларушчына як такая ў асноў-

ных сваіх атрыбутах (найперш мовы і нацыянальнай культуры) вынішчаная настолькі, што яе паўнавартаснае ўзнаўленне не ўяўляецца (прынамсі, асабіста мне) магчымым, я б хацеў прапанаваць тэарэтыкам нацыянальнага будаўніцтва (і найперш — *нацыянальна* заангажаваным) перанесці сваю ўвагу з “нацыянальна-этнаграфічнай” мадэлі на мадэль “грамадзянскай супольнасці”.

Так, у гэтым выпадку мы здрадзім нашым папярэднікам, але злагодзім беларусаў (і сябе саміх) з той рэальнасцю, у якой беларускае грамадства ўжо знаходзіцца цяпер. Парадокс нашай сітуацыі палягае ў тым, што нацыянальнае ўладкаванне Беларусі самахоць (інакш — праз прымус гістарычных падзеяў) адбылося па схеме “грамадзянскай супольнасці”. А падваліны яе заклалі... бальшавікі: і тым што згамавалі да звання *этнічную* складовую беларускага нацыяналізму, і тым, што аформілі прастору бытавання беларусаў у трывалую і зграбную адміністрацыйную адзінку — БССР.

Напярэдадні перабудовы беларусы (у асноўнай сваёй масе), ментальна ўжо амаль не вызнавалі сябе за беларусаў, аднак сваёй радзімай лічылі не Савецкі Саюз, не Расею, а менавіта Беларусь. (Я — той, хто жыве ў Беларусі). Гэта значыць, што ў дыскурсе БССР адбылася яшчэ адна істотная метамарфоза: тут беларусы перасталі быць не толькі беларусамі (у “моўна-этнаграфічным” аспекце), але і “тутэйшымі”. І калі пра першае толькі і гаворкі, дык на другое, здаецца, ніхто і ўвогуле не звяртаў увагі. А дарэмна, бо, верагодна, у будучым гэты момант апынецца куды больш істотным за ўсе астатнія.

Пры ўсёй размаітасці нацыяналізмаў, для кожнага з іх (бадай, апрача габрэйскага і трансісламскага) на першы план выходзіць праблема “ўласных межаў”. “Тутэйшы” мог лічыць сябе нават беларусам, аднак паколькі “тутэйшасць” не ведае мяжы, дык яна і не ведае нацыянальнасці ў яе ідэнтыфікацыйным

значэнні. А вось “тутэйшы”, які гэтую мяжу ведае, перастае ім быць і, значыць, становіцца патэнцыйным нацыяналістам (чаго і каго — гэта ўжо іншая рэч).

Сітуацыя БССР сістэмна падрыхтавала Беларусь да ўласнай дзяржаўнасці, а *тутэйшых* беларусаў да нацыяналізму, толькі не этнічнага, а паспалітага тыпу. Вось гэтага і не схацелі (ці не змаглі) угледзець тэарэтыкі і практыкі нацыянальнага будаўніцтва, калі ў 1991 годзе Беларусь атрымала дзяржаўную незалежнасць.

Уласна, кароткая эпоха Адраджэння — гэта латэнтны двубой *этнічнага* нацыяналізму з *паспалітым.* Цікава, што першы яшчэ напярэдадні распаду СССР прыдбаў сабе тэарэтыкаў, ідэолагаў і прыхільнікаў (у мностве), але пазней так і не выявіў адпаведнага патэнцыялу, каб татальна заканстытуяваць сваю візію нацыянальнага ў якасці паноўнай ідэалогіі і практыкі грамадскага жыцця. А другі — цалкам наадварот. Паспаліты нацыяналізм ужо на тую першапачатковую пару меў дастатковы патэнцыял, каб неўзабаве аформіцца ў дамінуючую форму нацыянальнага ўладкавання, аднак тады ніхто не звярнуў нават увагі на ягоныя магчымасці.

Раней я пісаў: “...іншай, апрача як ***сацыяльнай***, беларуская дзяржава быць не можа, бо для абсалютнай бальшыні насельнікаў нашай краіны прыярытэтнымі як былі, так і застануцца не нацыянальна-культурныя ці ідэалагічныя, а *сацыяльныя* каштоўнасці”. Калі ў гэтак радыкальна сфармуляванай выснове ёсць рацыя, дык, напэўна, я маю рацыю і ў тым, што звязваю нацыянальнае будучае Беларусі не з “этнаграфізмам”, а з “грамадзянскай супольнасцю” і, адпаведна, з паспалітым нацыяналізмам. Гэта значыць, што рана ці позна, але нам давядзецца нацыяналізаваць ні што іншае, як нашу сацыяльнасць і, адначасна, самім нацыяналізавацца праз сацыяльнае, якое для

беларусаў уяўляецца галоўнай каштоўнасцю.

Дзеля таго, злагоджанага з наяўнай рэальнасцю будучага, нам перадусім трэба перапыніць нябачную вайну двух беларускіх нацыяналізмаў — “моўна-этнаграфічнага” і “супольна грамадзянскага”. І першым запрасіць міру мусіць *этна*нацыяналізм: і таму, што ён пераможаны, і таму, што гэта ён распачаў вайну, і таму, што яму давядзецца шукаць у пераможцы літасці і паразумення, каб знайсці сабе месца і застацца ў той канфігурацыі беларускага грамадства, якая пакрысе сфармуецца на кацэпце *паспалітага нацыяналізму*.

* Мне не аднойчы даводзілася кранаць праблему “беларускай здрады” як такой. Але тут я хацеў бы дадатна звярнуць увагу на думкі Пятро Васючэнкі, выказаныя ім у эсэ “Беларус вачыма беларуса”: “Уладзімір, князь кіеўскі, здрадзіў бацьку і братоў Рагнеды на сваім крывавым вяселлі. Рагнеда здрадзіла свайго бацьку і братоў тым, што пайшла за іх забойцу. Потым яна і на мужа ўзняла меч. Сын яе, Ізяслаў, таксама замахнуўся мечам на бацьку. Але пасля ён з бацькавых рук прыняў спадчыну — Полацак. Уладзімір безліч разоў здраджваў Рагнедзе з палюбоўніцамі, якіх у яго было не менш, чымся ў цара Саламона, аж пакуль па хрысціянскім звычаі не павянчаўся з візантыйскай царэўнай, а верную жонку аддаў у манашкі.

Кароль нашае здрады — Ягайла. Ён здрадзіў свайго дзядзьку Кейстута ў бруднай крэўскай справе, а заадно здаў і Беларусь дзеля польскае кароны. Гісторыкі скажуць, што гэтым ён Беларусь адначасова і адратаваў. Падчас Грунвальдскае бойкі невядома хто каго здраджваў — Ягайла Вітаўта або Вітаўт Ягайлу. Польскія храністы цвердзілі, што з беларусамі атрымаўся канфуз, і яны на чале з Вітаўтам уцякалі ажно да Вільні.

Нехта невядомы здрадзіў Вітаўтаву карону.

Апанас Філіповіч здрадзіў уласнага вучня Яна Лубу. Вучыў, выхоўваў чарговага Ілжэдзімітрыя, каб пасля здаць маскоўскаму пасольству. Яшчэ Апанас Філіповіч клікаў Міхаіла Раманава, каб ішоў з вайною на родную Апанасу Літву, дзяліўся з маскоўскім царом дзяржаўнымі таямніцамі, павучаў караля Ўладзіслава IV, канцлера Льва Сапегу. Кароль ды канцлер глядзелі на гэтыя штукі паблажліва. Апантаны Апанас вырабляў у гэтай дзяржаве што хацеў — і ўрэшце даскакаўся. Царква зрабіла са здрадніка

святога.

Аднойчы ў беларускай Акадэміі навук збіраліся ўшанаваць памяць самых знакамітых дзеячаў старажытнасці — паставіць Стэлы. Абмеркаванне кандыдатураў было, па дэмакратычным часе, адкрытае. Павесілі на дошцы даўгі спіс кандыдатаў на стэлу, і кожны з навукоўцаў вольны быў паставіць “плюс” альбо “мінус”.

Насупраць прозвішча Сімяона Полацкага якісь максімаліст напісаў: “Здраднік. Перакінуўся на бок цара маскоўскага”.

Небарака Сімяон Полацкі заблукаў на мяжы канфесіі ды Радзімы, не ведаў, што галоўнае, але і ў сваёй “здрадзе” імкнуўся захаваць сумленнасць. Спрабаваў перарабіць маскоўскага Навухаданосара на цывілізаванага еўрапейскага манарха, але не ўдалося. Сімяон Полацкі стаўся для Масковіі культуртрэгэрам, навучыў маскоўцаў складаць вершы, падараваў ім першы літаратурны стыль (барока), але ягоных высілкаў не ацанілі як след ані тутэйшыя, ані тамтэйшыя. Добра, што яшчэ на палю не пасадзілі.

Падчас кампаніі Напалеона Банапарта ў Беларусі пачалася суцэльная здрада — мяшчане віталі супастата хлебам ды соллю, а шляхта запісвалася ў напалеонаўскія харугвы, каб разам ваяваць Маскву. Як быццам вярнуліся часы Альгерда.
Кастусь Каліноўскі вызваляў “дзецюкоў”, “братоў сваіх, мужыкоў родных” ад няволі, а тыя браты адлоўлівалі ды здавалі каліноўцаў царскім жандарам за тое, што “хаваюць ад народу царскую волю”.

XX стагоддзе было росквітам здрады, тут і кветачкі цвілі, “зялёны ліст, чырвоны цвет”, і ягадкі крывавыя спелі. На нашым матэрыяле можна складаць анталогію здрадніцтва”.

## 24. ІДЭАЛОГІЯ І ТЭХНАЛОГІЯ

Жыць нацыянальнай ідэяй — гэта ідэалогія.

Жыць з нацыянальнай ідэі — гэта тэхналогія.

У эпоху краху ўсіх ідэалогіяў, калі быццё цалкам згарнулася да памераў тэхналагічнага бытавання,нацыяналізм марна аналізаваць, шанаваць і берагчы з гледзішча ягонай

ідэалагічнасці...

Уласна, у звязку з праблемай нацыяналізму ў тэхнакратычным грамадстве, ёсць, бадай, толькі адно сапраўды істотнае запытанне: наколькі нацыяналізм тэхналагічны? Гэта значыць, наколькі ён вартасны не як ідэалогія адбывання быцця, а як тэхналогія адбывання быцця?..

Хаця, па вялікім рахунку, на гэтае запытанне адказала само жыццё. Бо, насамрэч, нацыяналізм у сваім цэлым ужо даўно зусім *не ідэалогія*, а *толькі тэхналогія* арганізацыі соцыуму. Да таго ж пакуль гэта самая ўніверсальная і найбольш эфектыўная тэхналогія, за што сведчыць ягоная прысутнасць паўсюль на зямной кулі. (Іншая справа, што феномен глабалізацыі ўжо падрыхтаваў нам канцэптуальна новую мадэль уладкавання чалавецтва...)

Ці тэхналагічны ў акрэсленым значэнні беларускі этнанацыяналізм? Гэта лёсавызначальнае пытанне. Бо калі — не, не тэхналагічны, дык колькі б мы не ўлягаліся ў адраджэнне мовы, гісторыі, культуры, колькі б не ладзілі мітынгаў, пікетаў, шэсцяў, колькі б не ганілі кожную новую ўладу за яе абыякавасць да ўласна беларускай візіі нацыянальнага праекту — усё будзе марна. Сучасная цывілізацыя не бярэ пад увагу не тэхналагічныя ідэі, а тым болей не прымае іх да рэалізацыі.

Відавочна, што сёння ў Беларусі ёсць сферы, дзе этнанацыянальная ідэя — дастаткова тэхналагічная ідэя. Тут найперш згадваюцца літаратура, часткова — адукацыя, фрагментарна — культура, у асобных праявах — палітыка, гісторыя, беларускамоўная журналістыкаі да т.п. І хаця гэткіх сфераў вельмі мала, яны лакальна разасобленыя, пераважна не прэзентатыўныя, аднак іх наяўнасць сведчыць, што пакуль этнанацыянальнай ідэяй можна *не толькі жыць* (эмацыйна, духоўна), але што з яе таксама *можна і жыць* (матэрыяльна, прагматычна).

Разам з тым, у беларускага этнанацыяналізму, як сістэмнай і самастойнай падзеі, падобна, няма будучыні. Засталося трохі пачакаць, каб убачыць, як яго прыгарне да сябе і ўжо ніколі не адпусціць з абдымкаў ***паспаліты нацыяналізм.*** З гэтага можна моцна нурыцца, а можна і хоць трохі ўсцешыцца. Ужо хаця б таму, што паспаліты нацыяналізм ніяк не абыдзецца без складовай этнаграфізму, асабліва тых яго фрагментаў, што забяспечаныя тэхналагічнасцю. А значыць, беларушчына і надалей застанецца ў Беларусі, прынамсі, у тым яе патэнцыяле, які яна рэальна зможа сама з сябе выявіць…

Міне яшчэ колькі часу і пад *беларускім нацыяналізмам* пачнуць разумець зусім не тое, што разумеюць сёння. У ім мала застанецца ўласна беларушчыны, але затое будзе **ўся** Беларусь. І ў той Беларусі аб’явіцца процьма *беларускіх нацыяналістаў*, якім не да галавы будзе ні беларуская мова, ні нацыянальная культура…

Так яно станецца. Ужо ж напэўна.

Адно не пытайцеся мяне, ці добра гэта?

Не бывае правільных адказаў, правільнымі бываюць толькі пытанні.

## 25. НААСТАЧУ

Кожны з нас належыць да грамадзянаў нейкай краіны, мае ў гэтай краіне ўласны падворак з домам або кватэру ў гарадскім гмаху, але насамрэч чалавек камунікатыўна адкрытай цывілізацыі жыве Нідзе. Блытаніна ў арыентацыі паходзіць з таго, што мы ўсё яшчэ карыстаемся моўнымі фігурамі, якія склаліся ў класічныя эпохі, калі быццё чалавека пераважна фармавалася месцам ягонага існавання і таму ў значнай меры было тоесным пэўнаму ландшафту, адпаведным формам працы, апрычоным культурным і культавым рытуалам. І нават кніжная (і шырэй — мэтафізічная)

культура, якая ў асноўным сваім масіве складвалася з інтэлектуальных ініцыятываў, што паходзілі з розных прастораў і эпохаў, не вымыкала тады чалавека з ягонага “тут” у нейкае “нікуды”, а толькі ўдакладняла каардынаты быцця як універсальнага цэлага і ў дадатак маркіравала трансцэндэнтную перспектыву.

Але так было раней, у класічныя эпохі. Цяпер ужо быційна ніхто не жыве на роднай зямлі, у роднай краіне. Што сёння азначаюць словы “роднае”, “чужое”, “далёкае”, “блізкае”, калі англійскую прынцэсу Дзіяну (пакуль яна была жывая) я бачыў часцей, чым сваю адзінакроўную сястру, калі пра інтымныя стасункі Клінтана з Левінскі я ведаю куды болей, чым пра гэткія ж стасункі лепшага сябра, калі розныя дабрачынныя фундацыі, якія пра мяне нават ніколі не чулі, уклалі ў мяне грошай болей, чым мае нішчымныя бацькі. Зрэшты, рэч не ў асобных прыкладах, якія можна доўжыць бясконца. Рэч у тым, што не пакідаючы родных сялібаў, кожны з нас незаўважна апынуўся раскіданым па ўсім свеце.

У бязгучнага выбуху, які гэтак далёка параскідаў чалавека па розных прасторах зямной кулі, што яму бадай ніколі не сабрацца ў адно цэлае дома, дзе ён толькі працуе і начуе,— шмат назоваў. Мы скарыстаемся толькі адным з іх, вынесеным на вокладку кнігі французскіх даследнікаў Філіпа Брэтона і Сержа Пру, а менавіта — “Выбух камунікацыяў”...

Прастора — гэта адлегласць, якая аддзяляе чалавека ад чалавека, народ ад народу. У першую чаргу дзякуючы гэтай прасторавай адлегласці і магчымыя былі розныя тыпы культураў, як апрычоныя формы засваення таго ці іншага фрагменту прасторы.

Але прастора — гэта не толькі тое, што адсланяе чалавека ад чалавека, народ ад народу, але і тое, што праз сродкі камунікацыі лучыць іх між сабой, набліжае адно да аднаго. Чым

больш развітыя сродкі камунікацыі, тым менш становіцца прасторы — і тады чалавек пачынае насоўвацца на чалавека, народ на народ, культура на культуру... Усё гэтае вялікае мноства грувасціцца адно на адно, шчыміцца, сціскаецца...

У другой палове XX стагоддзя сродкаў камунікацыі назапасілася ў такой колькасці, што яны стварылі крытычную масу, якая спарадзіла неверагоднай магутнасці выбух. Гэтым выбухам камунікацый прастора, як падставовы феномен быцця, была амаль цалкам зніштожаная, з чаго адразу згубілі сэнс такія паняткі, як “цэнтр”, “перыферыя”, “адлегласць” і да іх падобныя. Цэнтр свету сёння ўсюды, дзе стаіць тэлевізар са спадарожнікавай антэнай і кампутар, падключаны да Інтэрнэту.

Знікненне прасторы (яе згортванне яшчэ ў XIX стагоддзі распачалі чыгунка і тэлеграф) уласна і спарадзіла праблему, якая атрымала назву ***татальны крызіс культуры***.

Культура — гэта падзеі часу, трывала зафіксаваныя ў прасторы. Калі прастора адсутнічае, дык знакам і падзеям культуры няма дзе статычна зафіксавацца, бо ўсялякая праява культуры жыццядайна выяўляецца толькі ў значэнні пэўнай сумы статыкі, пазасталай ад дынамічных перарухаў часу. З чаго вынікае, што жыццядайнасць культурнага знаку палягае найперш на яго трывалай зафіксаванасці ў прасторы нацыянальнай ці сусветнай культуры. А ў сітуацыі адсутнасці прасторы знакі і атрыбуты ўсіх культураў страчваюць укарэненую прыналежнасць да пэўнага месца і скочваюцца ў яміну аднаго кантынуюму, дзе ў калейдаскапічным рушэнні няспынна засланяюць сябе іншымі. Да таго ж (і гэта, бадай, галоўнае), у сітуацыі адсутнасці прасторы знакі і атрыбуты ўсіх іншых культураў апынаюцца ля чалавека гэтаксама блізка, як знакі і атрыбуты — уласнай. На экране тэлевізару Вавельскі замак, Кітайская сцяна і праспект Францішка Скарыны ў Менску знаходзяцца на адной дыстанцыі ад гледача, нават калі ён глядзіць тэлевізар у доме, які стаіць на праспекце

Францішка Скарыны. З чаго атрымліваецца, што знікае ці становіцца амаль незаўважнай, розніца паміж роднай і іншымі культурамі. А што яшчэ, як не адлегласць рабіла блізкую культуру роднай, а далёкую — чужой? І калі на працягу ўсяго жыцця на адной далечыні ад чалавека пачнуць прысутнічаць знакі і атрыбуты розных культураў, да таго ж яшчэ ў няспынным калейдаскапічным рушэнні, дзе знакі роднай культуры будуць толькі асобнымі фрагментамі стракатага мноства, дык з якой культурай зможа тады з'ідэнтыфікаваць сябе чалавек? Натуральна — ні з якой. Зрэшты, у адсутнасці прасторы ўсе размовы пра культурную ідэнтыфікацыю становяцца ўвогуле гранічна праблематычнымі.

Марцін Гайдэгер, вялікі знаўца праблемаў быцця, прасторы і часу, некалі пісаў: "Цяпер пад пагрозай знаходзіцца сама**ўкарэненасць** (*у глебу* — **В.А.**) сучаснага чалавека". Але бяда прыйшла не адтуль, скуль яе чакаў Гайдэгер, і была яна больш татальнай, чым прагноз. Не**ўкарэненасць** аслабла — аслабла і неўпрыкмет знікла тое, ува што можна ўкарэньвацца — раптам невядома куды падзелася сама прастора...

І што мы з гэтага маем? Як з майго гледзішча, дык у сітуацыі адсутнасці прасторы месца знакам і падзеям культуры засталося адно ў часе. Але культура, якая існуе адно ў часе, ёсць ужо нішто іншае, як спрэс інфармацыя, бо інфармацыя не патрабуе трывалай фіксацыі ў рэальнасці, падмацаванай апрычоным кантэкстам. Усё, што існуе выключна ў часе, можа існаваць адно ў форме інфармацыйнага паведамлення, нават калі гэтае паведамленне разгорнутае да памераў філасофскай сістэмы. З чаго вынікае, што цяпер, у пару татальнага разгортвання прасторы, інфармацыя заняла тое месца, якое раней займала культура. Хаця тут неабходна адразу заўважыць, што знакі і падзеі культуры не зніклі разам са знікненнем прасторы — яны засталіся, але засталіся ў якасці сыравіны, падручнага матэрыялу, з якога мас-медыя бясконца прадукуюць інфармацыйныя паведамленні.

Таму ўжо не зусім зразумела: раман, музычны твор, карціна цяпер ствараюцца дзеля канкрэтнага чытача, слухача, гледача ці дзеля таго, каб запаўняць інфармацыйны дыскурс. І ці не ёсць нешматлікі рэальны чытач, глядач, слухач, што бярэ ў рукі раман, прыходзіць на канцэрт альбо мастацкую выставу па сутнасці той самай “масоўкай”, якую збіраюць на сваю перадачу вядучыя папулярных тэлешоў, каб было каму задаваць пытанні, пляскаць у ладкі і тым ствараць значнасць інфармацыйнай падзеі?

Наўрад ці я моцна памылюся, калі скажу, што пераважная большасць з таго, што цяпер робіцца ў літаратуры і мастацтве, не проста становіцца вядомым толькі праз журналісцкія паведамленні, рэцэнзіі, агляды ды інтэрв’ю, але і існуе для шырокай публікі адно ў тым аб’ёме і ў тых формах, якія гэтаму творчаму наробку прадстаўляюць сродкі масавай інфармацыі.

Напісаць раман у тысячу старонак адно дзеля таго, каб пра яго ў некалькі радкоў распавялі праз газэту — вось ён лёс літаратуры ў грамадстве татальнай інфармацыі. І гэта рэальнасць.

Але з гэтай рэальнасцю ніяк не жадае пагадзіцца той, хто выхаваны ў досведзе, што культура — пасля жыцця — ёсць найвялікшая каштоўнасць. Наша нязгода з рэальным станам рэчаў цалкам зразумелая. У грамадстве татальнай інфармацыі суб’ект перастае ідэнтыфікаваць сябе хоць з якім культурным кодам і з гэтага быційна апынаецца не толькі ў сітуацыі Нідзе, але і ў сітуацыі Ніхто, гэта значыць, у сітуацыі анталагічнага вакууму, які наўрад ці можна кампенсаваць адным фактам экзістэнцыйнай прысутнасці.

Зрэшты, зусім верагодна, што мы адно з апошніх пакаленняў, якому яшчэ патрэбна нагружаць сваё экзістэнцыйнае “Я” анталагічнай семантыкай, што толькі і магчыма праз імператыў культуры. І хаця большасць з нас, калі не разумее, дык ужо прадчувае, што культура, як падставовае цэлае ўсіх ранейшых

цывілізацыяў, на вачах маргіналізуецца, распадаецца на фрагменты, лакальныя падзеі, прыватныя ініцыятывы, але нават усведамляючы ўсё гэта, мы не жадаем, і не можам адбываць быццё інакш, чым адбывалі да гэтага ўсведамлення. Што і натуральна. Чалавеку толькі здаецца, што ён шукае ісціну, насамрэч ён прагне адно ўтульнасці. А якая там утульнасць у голай экзістэнцыі, высунутай на скразнякі часу?

Бадай, вось гэтай прагай утульнасці найперш і абумоўлены наш супраціў сітуацыі татальнага Нідзе і Ніхто, якую стварыў выбух камунікацый. Прадчуваючы, што культура, як цэлае, ужо не можа быць нашым гарантам у захаванні за намі месца ў прасторы быцця, мы, кожны на свой капыл, спрабуем уладкавацца на яе ацалелых фрагментах. Адзін са спосабаў такога ўладкавання яшчэ напярэдадні інфармацыйнага нашэсця сфармуляваў Герман Гесэ, калі ў рамане “Гульня шкляных перлаў” высунуў ідэю Касталіі, замкнёнай на самой сабе Правінцыі, дзе духоўныя эліты хаваюцца ад “эпохі фельетонаў”.

Неяк польскі культуролаг Кшыштаф Чыжэўскі на канферэнцыі ў Менску перафармуляваў ідэю Гесэ, прапанаваўшы замест утапічнай Правінцыі ствараць у кожнай краіне скіты для духоўных элітаў, а пасля злучыць іх між сабой у нейкую інтэлектуальную гіперсістэму. Магчыма, гэта і слушная думка, хаця ці не з’яўляюцца ўжо сёння такімі скітамі універсітэцкія асяродкі, музеі, літаратурна/культуралагічныя выданні і суполкі, містычныя секты, як і безліч іншых аб’яднанняў на грунце традыцыйных культурных каштоўнасцяў.

Ня цяжка зразумець, што ў адсутнасці культуры як цэлага, усе нашыя спробы выгарадзіць сабе ў інфармацыйным дыскурсе лапік аўтэнтыкі, традыцыі, класікі, становяцца эфектыўнымі адно праз нашыя ўласныя высілкі. Гэта значыць, што кожная наша лучнасць з традыцыйнымі культурнымі каштоўнасцямі ёсць

штучнай у тым сэнсе, што яна арганізаваная праз супраціў пануючай, спрэс інфармацыйнай рэальнасці.

Адным з найбольш цікавых выпадкаў штучнага супраціву (зноў жа ў сэнсе не-натуральнага адносна цывілізацыйнага чыну) мне падаецца тое, што раней мы называлі нацыянальным Адраджэннем.

Згодна з традыцыйнай схемай развіцця гістарычных падзеяў, наша жаданне адрадзіць нацыянальную культуру ва ўсіх яе значэннях, каб на гэтым подзе стварыць нацыянальную дзяржаву, было і лагічным, і натуральным, і ясным у стратэгіі рэалізацыі... Вызваліўшыся ад расейскага каланіяльнага іга, трэба ачысціць свядомасць паспалітых ад рэшткаў каланіяльнай спадчыны і на калектыўным “tabula rasa” вытлумачыць беларускімі словамі сэнс беларускай ідэі. Якім жа было нашае здзіўленне, калі амаль нічога з пазначанага ў мэтах не атрымалася здзейсніць. Цяпер беларускія палітолагі, аналітыкі, культуролагі шукаюць прычыны паразы беларускай ідэі ў кволай нацыянальнай свядомасці народу, у скрытай інтэрвенцыйнай палітыцы Расеі, у стратэгічных праліках палітыкаў і да т.п.

Усё гэта так, і ўсе нашыя тэарэтыкі сапраўды маюць рацыю, але як мне здаецца, сутнасная прычына паразы нацыянальнага руху палягае ў іншым, а менавіта ў тым, аб чым тут казалася вышэй.

Момант рэалізацыі праекту нацыянальнага адраджэння прыпаў на пару выбуху камунікацый, пасля якога вядзе рэй ужо не падзея культуры, а інфармацыйная падзея. Пераканаць сёння беларускае грамадства — якое ўжо амаль цалкам знаходзіць сябе ў інфармацыйным дыскурсе,— забыцца на рэальную пару існавання і ўлегчыся ў адбудову бастыёнаў нацыянальнай культуры, гэта тое самае, што пераканаць грамадства ў неабходнасці будаўніцтва старажытных замкаў дзеля паспяховай

абароны ад нашэсця чужынцаў.

Менавіта з таго, што нацыянальную культуру сёння трэба адваёўваць не ў расейскіх ці якіх там іншых заваёўнікаў, а яе трэба адваёўваць у самога часу, які ўжо не прадугледжвае існавання культуры ўвогуле, ідэя нацыянальнага адраджэння не спарадзіла шырокі народны рух і пасля кароткага перыяду адноснай актыўнасці, згарнулася да памераў таго, што можна назваць беларускай версіяй Гесэўскай Правінцыі Касталія.

Сёння беларускасць, беларуская мова, гісторыя, культура ў цэлым — гэта не прастора жыццядзейнасці грамадства, а прытулак для інтэлектуалаў, духоўнай эліты, для ўсіх тых, каму няўтульна без апранахі культуры. У звязку з апошнім цікава адзначыць, што сярод тых, хто сёння актыўна і апантана працуе ў нацыянальнай культуры на карысць беларушчыны, зусім ня шмат этнічна чыстых беларусаў. Гэты факт можна трактаваць па-рознаму, але як з майго меркавання, дык ён найперш сведчыць аб тым, што да беларускай ідэі далучаюцца не столькі з-за этнічнай ідэнтычнасці, колькі дзеля таго, каб быць улучаным у рэальныя справы рэальнай культуры. А калі выславіцца менш далікатна, дык давядзецца прызнаць, што ў беларускую культурную Правінцыю ўцякаюць адусюль не столькі дзеля яе самой, колькі дзеля таго, каб тут схавацца ад сітуацыі татальнага Нідзе і Ніхто, бо раскіданы выбухам камунікацый па ўсім свеце чалавек сёння анталагічна можа сабрацца ў адно цэлае толькі ў дыскурсе ідэнтыфікацыі сябе з тым ці іншым культурным кодам... І нікога з гэтых уцекачоў асабліва не турбуе, што як да эпохі камунікатыўна адкрытай прасторы, замкнёная сама ў сабе Беларуская Касталія, ёсць утварэннем штучным, існуючым насуперак рэальнаму часу і таму з нябачнай, прынамсі, пакуль, уцямнай перспектывай...

Зрэшты, у сэнсе перспектывы мы мала чым адрозніваемся

ад іншых. Беларусь сёння — гэта Францыя заўтра. Калі культура, як цэлае, перастае быць падставовым апірышчам быцця, дык усіх нас чакае аднолькавы лёс. І, магчыма, адзінае, што нас неўзабаве будзе адрозніваць адзін ад аднаго,— гэта колькасць волі да супраціву сітуацыі Нідзе і Ніхто.

# ДАДАТАК

# ГУЛЬНЯ Ў ВІРТУАЛЬНУЮ ДЗЯРЖАВУ

**Прэамбула**

1995 год. Травеньскі рэферэндум...

Нават беручы пад увагу некарэктнасць (з розных гледзішчаў) прапанаваных на рэферэндум пытанняў і спрэчнасць выніковых лічбаў, немагчыма ўсё ж было пярэчыць відавочнаму: для пераважнай большасці беларусаў (тут дакладней будзе казаць: насельнікаў Беларусі) Беларусь не ёсць каштоўнасцю ні ў выяве мовы, ні ў выяве гісторыі і культуры, ні ў выяве незалежнасці.

Нарэшце “заглянула сонца і ў наша аконца”, і мы ўбачылі тое, пра што, будзем шчырымі, даўно ведалі, але чаму раней, асабліва ў сутонні адраджэнскага ранку, неяк атрымлівалася не даваць веры.

Першыя дні і тыдні пасля рэферэндуму і цяпер ніякавата згадваць. “Нацыянальна свядомыя”, што тыя совы, якіх дзень заспеў на голай выспе, адно разгублена лыпалі вачыма і паныла сноўдаліся з месца на месца, не ведаючы, куды падзецца ад невыноснага святла... Не ратавалі ні гарэлка, ні распуста. З адчаю хаваліся ў сябе — там была ноч…

Асабіста мне тады марылася толькі пра адно — каб як мага хутчэй праміналі гэтыя першыя дні, тыдні, месяцы, і “светлая ява” сталася штодзённай звыкласцю, бо трэба ж было неяк жыць далей, прызвычайвацца да новых стандартаў, спакваля асвойтваць іншую рэальнасць і неўпрыкмет стасаваць да яе рэшткі былых ілюзіяў.

Хаця ілюзіяў, здаецца, амаль не засталося, паколькі мяне не гаіла (як, бадай, многіх) адчайная нянавісць да тых, хто зыніцыяваў і зладзіў рэферэндум; я і ў адчаі выразна ўсведамляў, што не яны стварылі тую сітуацыю, якую мы мелі, — яны толькі скарысталі яе ў сваіх мэтах (ці — што больш

верагодна — яны самі, з усімі сваімі ініцыятывамі, былі “плёнам” гэтай сітуацыі). Але тут рэч не пра тых, хто скарыстаў сітуацыю, а пра тых, каго скарысталі, а найперш пра тых, для каго рэферэндум жорстка і бязлітасна выявіў ды прадэманстраваў, што ў нас ёсць і чаго ў нас няма.

Беларусаў трохі ёсць, а Беларусі няма — у сэнсе цэласнага жыццядайнага нацыянальнага арганізму, які запатрабаваў бы дзеля свайго развою і бяспекі нацыянальнай дзяржавы.

Няма такой Беларусі цяпер, але і ў будучым яе не бачна, хаця якраз на “будучыню” шмат хто тады спадзяваўся (спадзяецца і зараз): неўзабаве ўсё неяк пераменіцца, да ўлады дапнуць “нашыя”, і мы здабудзем памысную Беларусь... (Калі б “нашыя” маглі неўзабаве ці хаця б у бліжэйшай перспектыве займець уладу, дык Аляксандр Лукашэнка, з яго не абы-якой палітычнай інтуіцыяй, ужо даўно быў бы “нашым”.)

Але калі б нават нейкім цудам нешта ўзяло ды кардынальна перамянілася і “нашыя” прыйшлі да ўлады (як прыйшлі б, так і пайшлі б), дык што з гэтага не фармальна, а сутнасна зрушылася б у сітуацыі?

Безумоўна, фармальна, вонкава, намінатыўна сёе-тое выдавала б на лепшае ў нашым разуменні лепшага (трохі прыпынілася б русіфікацыя школ, вярнулася б гістарычная сімволіка, што-кольвек яшчэ...), аднак і тая дэкларатыўна нацыянальная дзяржава рэальна была б сацыяльнай дзяржавай (дзе нелегітымна панавала б ідэалогія сацыяльных дабротаў, гэта значыць ідэалогія “каўбасы” і курсу долару, а не нацыянальнай культуры, мовы, незалежнасці), і ў той, “нашай”, дзяржаве “свядомаму беларусу” было б, пэўна, гэтак жа няўтульна, як і сёння — а можа, і яшчэ няўтульней,— і на вуліцы, і на службе, і сам-насам, бо і тады ён быў бы ва ўнутранай эміграцыі адносна чужароднага яму соцыуму.

Прыкладна гэтак (слушна ці не — іншая рэч) я разважаў у

тыя першыя тыдні і месяцы пасля рэферэндуму...

Няўжо нам, “свядомым”,— думаў я ў падсумаванне,— нічога іншага не застаецца, як пражыць жыццё і памерці чужынцамі на сваёй зямлі, ды яшчэ той самы бяздольны лёс пакінуць сваім дзецям, якія з нашай волі ці нават паўз яе панабіраліся ад нас гэтай заразы — беларусаманіі?

## ЙОХАН ХЕЙЗІНГА І МРОІ ПРА ВІРТУАЛЬНУЮ ДЗЯРЖАВУ

Цяпер ужо не памятаю, скуль непасрэдна ўзнікла думка, з якой я потым, як дурань з пісанай торбай, цягаўся некалькі дзён запар. Хаця, напэўна, яна пачаткавалася недзе ля відавочнай тэзы: большасць насельнікаў Беларусі (блізу шасці мільёнаў) прагаласавала за сацыяльную дзяржаву. Добра, іх болей, яны перамаглі, дык хай сабе і ладзяць жытво, як ім падабаецца. Але чаму з іх перамогі мусяць пераможаныя пачувацца ў скрусе, да таго ж не прыхадні, а таксама тубыльцы гэтага краю? Як-ніяк, не за “барбарскімі” часамі жывём, дэмакратыя наўкола, а дэмакратыя, як вядома, гэта найперш павага і забеспячэнне правоў меншасці. Тым болей, што не такая яна ўжо і малая гэтая меншыня, якая аддала перавагу нацыянальнай дзяржаве (блізу двух мільёнаў; а хай сабе і мільён).

Дык чаму гэтыя два мільёны (а хай сабе і мільён) не могуць жыць як цывілізаваныя людзі, мець свайго прэзідэнта, свой парламент і ўсе астатнія палітычныя і грамадскія інстытуты?— запытаўся я сам у сябе.

Узважыўшы пытанне, таксама сам сабе адказаў (здаецца, слушна):

— Дык таму!

Безумоўна, можна было б прапанаваць усім “свядомым”

з’ехацца на жытло ў нейкую адну мясцовасць і зладзіць там нешта падобнае да нацыянальнай аўтаноміі, толькі беларусы не габрэі, за белы свет без прынукі не пацягнуцца, ды і дзіўна было б чакаць ад беларуса, што ён кіне бацькоўскае котлішча ці абжытую “хрушчоўку” ў Серабранцы дзеля таго, каб у нейкім іншым месцы лаяцца з суседам па-беларуску і на 1 мая над ганкам вывешваць не чырвона-зялёны, а бел-чырвона-белы сцяг.

Адным словам, як я ні трудзіў глузды, заўсёды атрымлівалася тое самае: у прасторы аднаго топасу няма разам месца сацыяльнай і нацыянальнай дзяржавам... А з гэтага, бясспрэчна, вынікала, што “свядомым” нічога іншага не застаецца, як гібець кожнаму паасобку ў сваім катуху, пакуль не павыміраюць усе да апошняга, што тыя яцвягі.

І вось недзе тут, у момант гранічнай скрухі, я нечакана ўспомніў Йохана Хейзінга, дакладней ягоную прыдумку, якая даводзіць, што ўся культура жыцця — гэта нішто іншае, як гульня ў безлічных праявах гульні (“Homo Ludens”). Калі “вся жизнь игра” — падумалася мне,— дык чаму б нам, “свядомым”, не згуляць у Беларускую Нацыянальную Дзяржаву? Чаму б нам не правесці сярод сваіх, “свядомых”, выбары свайго парламенту і Прэзідэнту, якія б потым сфармавалі наш урад, прынялі канстытуцыю і згодна гэтай канстытуцыі залічылі б нас у грамадзян Беларускай Нацыянальнай Рэспублікі (БНР).

Зачапіўшыся хоць за нешта, мая фантазія ўжо не хацела зважаць ні на законы логікі, ні на магчымасці рэальнасці, яна ліхаманкава разбягалася ў розныя бакі ўсё далей і далей (куды там Манілаву): я ўяўляў уласныя прадстаўніцтвы ў розных краінах свету (дзе толькі беларусаў няма, а згуртаванні беларусаў у ЗША, Канадзе, Аўстраліі, Польшчы, Латвіі ды некаторых іншых краінах і сёння выконваюць ролю амбасадаў ці не ў большай меры за афіцыйныя амбасады); уласныя грошы (дынар? талер?), якімі б

мы карысталіся ў дробных гандлёвых стасунках паміж сабой (з цягам часу яны, магчыма, сталі б канверсавацца з беларускім рублём); уласнае "войска" (ну калі не "войска", дык нейкую арганізацыю тыпу самаахoвы, якая хаця б абараняла "свядомых" ад агрэсіі "несвядомых"); свае партыі (лібералы, сацыял-дэмакраты, камуністы, зялёныя...); рэлігійныя інстытуты (сярод іх аўтакефальная царква); уласныя СМІ, выдавецтвы, фонды, культурніцкія праграмы і ініцыятывы (што да ўсяго апошняга, дык незалежныя беларускамоўныя выданні і культурніцкія праграмы, як у Беларусі, гэтак і ў замежжы, заўсёды працавалі і працуюць пераважна на карысць і патрэбу грамадзян менавіта гэтай, віртуальнай Беларускай Нацыянальнай Рэспублікі)...

У тыя некалькі дзён вясёлага шаленства, калі мая галава была апанаваная віхурай уласных фантасмагорый, я, здаецца, перамацаў усе магчымыя дзяржаўныя, грамадскія, палітычныя і сацыяльныя інстытуцыі, прыглядаючыся, што з усяго гэтага мноства магло б прыдацца да рэальнасці віртуальнай Беларускай Нацыянальнай Рэспублікі. Натуральна, усе тыя думкі (прыдумкі, задумкі, выдумкі) я тут прыгадваць не маю намеру, ды шмат чаго ўжо і забылася, але выразна памятаю, што і падчас найвялікшага ачмурэння я не забываўся:

а) на рэальную Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь, якая не прадугледжвае ўнутры сваіх межаў ніякай іншай дзяржавы, апрача той, што ўжо існуе;

б) на адсутнасць механізму, праз які можна было б выявіць і злучыць усіх "свядомых" паміж сабой (калі яшчэ кампутар, падключаны да "сусветнага павуціння", станецца такой жа шараговай з'явай, як тэлевізар);

в) на адсутнасць адпаведных фінансавых сродкаў (а маштабныя гульні патрабуюць шмат грошай);

г) на анталагічную няздольнасць беларусаў гуляць у сваю

гульню, ды і ўвогуле гуляць хоць у якія абстрактныя гульні.

Як гэта ні дзіўна, але менавіта апошняя антытэза найбольш выразна высветліла ўсю меру фантазійнасці маіх фантазіяў... Праблему канстытуцыі выраiшыла Гульня; гуляць наша канстытуцыя не забараняе, а калі можна гуляць у футбол ці “КВЗ”, дык чаму нельга гуляць у віртуальную Дзяржаву?.. Адсутнасць кампутараў пакуль можна было б кампенсаваць поштай, тэлефонам, незалежнымі СМІ.… Грошы? Грошай заўсёды будзе не хапаць. А вось заахвоціць беларусаў, хай сабе і “свядомых”, да інтэлектуальнай забаўкі, у якой гульня была б сур’ёзнай справай, а сур’ёзная справа — гульнёй, немагчыма. І гэта, напэўна, што я беларусаў не ведаю?

Беларус альбо працуе, альбо п’е гарэлку. Калі вып’е, можа і пазабаўляцца. Але каб цвярозы беларус не працаваў, а забаўляўся — такога, лічы, не бывае.

На гэтай цвярозай выснове і скончылася мая сам-насам гульня ў віртуальную Беларусь. Але паколькі я трохі літаратар, гэта значыць, чалавек, для якога выдуманае мае аднолькавую каштоўнасць з рэальным, дык мне тады вельмі карцела падзяліцца гэтай выдумкай з іншымі — напісаць артыкул ці эсэ, ды за рознымі сур’ёзнымі справамі рукі да фантазіяў не дайшлі…

## ЭТЫЧНЫ ІМПЕРАТЫЎ НА СКРАЗНЯКАХ ПРАГМАТЫКІ

Нельга сказаць, што потым я на тыя летуценні зусім забыўся. Зрэдчас згадваў, але ўсё неяк мімаходзь, паміж іншым, і, пэўна, з цягам часу яны неўпрыкмет пабляклі б да нявідалі. Але аднойчы пайшла пагалоска, што сярод “свядомых” узнікла ініцыятыва, якая заклікае беларусаў прымаць грамадзянства Беларускай Народнай Рэспублікі. Пагалоска змянілася публікацыямі ў прэсе, а

неўзабаве я і сам меў гонар быць запрошаным на ўрачыстую прэзентацыю гэтай ініцыятывы.

Дык вось, як толькі я пачуў пра “грамадзянства БНР”, дык мне адразу ўзгадаліся мае ранейшыя летуценні пра Беларускую Нацыянальную Рэспубліку, і зусім не з абрэвіятурнай тоеснасці (БНР — БНР), а з прычыны куды больш істотнай: тут ужо дэкларавалася імкненне практычна рэалізаваць як мінімум адзін, але надзвычай важны пункт, які супадаў з “праграмай” маіх трызненняў, а менавіта — прапаноўвалася адметнае грамадзянства для “свядомых”, гэта значыць, збольшага акрэслівалася поле іх супольнай прысутнасці ў тапаграфіі быцця.

Калі ёсць “мінімум”,— спехам падумалася мне,— дык, магчыма, прадугледжваецца і нейкі “максімум”. Не, нават “спехам” я не спадзяваўся, што сур’ёзныя людзі, паважныя палітыкі стануць разгортваць ініцыятыву, прыпадабняючыся да фантазіяў адвязанага ад рэальнасці літаратара. Але ж, але ж...

Што і казаць, ніякіх “але” з гэтага “мінімуму” я не дачакаўся. Ужо на прэзентацыі ініцыятывы мае кволыя спадзяванні на “нешта большае” зусім зніякавелі. Розныя выступоўцы казалі адно і тое ж: “грамадзянства БНР” — гэта маральны і палітычны выбар, прысяга на вернасць незалежнасці, беларускай мове, бел-чырвона-беламу сцягу і гербу “Пагоня”, дзяржаўнасці Беларусі. Таму, пэўна, мяне наўрад ці хто зразумеў, калі я ў сваім слове сказаў, што ідэя грамадзянства БНР мае самадастатковы патэнцыял, які пры ўмове яго разгорнутасці можа стварыць больш утульную сітуацыю для “нацыянальна свядомых”. А інакш, калі гэтая ініцыятыва будзе толькі дапаможнай акцыяй у палітычнай барацьбе за ўладу “нашых” у Рэспубліцы Беларусь, дык яна згорнецца ў звычайны сацыялагічны перапіс, чарговую каталаг-ізацыю “свядомых” беларусаў для архіву найноўшай гісторыі і актуальнага архіву КДБ.

Мы ўвесь час спадзяемся на нейкі цуд, спадзяемся, што

тая рэальнасць, якую назіраем штохвілі на свае вочы,— гэта аблуда, і дастаткова вынайсці нейкі іншы ракурс бачання гэтай рэальнасці, як яна карэнным чынам пераменіцца на нашу карысць. На жаль, ідэя "грамадзянства БНР" апынулася ўсяго толькі чарговай спробай змяніць ракурс бачання той самай сітуацыі ў спадзеве, што гэтым разам яна высветліць тое, аб чым нам летуценіцца: з намі сотні тысяч, мільён! а раптам і не адзін...

Але асабіста я ад вынікаў гэтай ініцыятывы чакаў зусім іншага "цуду": можа, урэшце з яе сфармуецца разуменне, што нас ёсць столькі, колькі нас ёсць. І з гэтага разумення нашыя палітычныя і грамадскія ініцыятывы далей будуць скіраваныя не на нейкі міфічны беларускі народ, у спадзеве раскатурхаць яго да нацыянальнага жыцця, а на нас саміх, якія ёсць сёння, колькі б там нас ні было, з нашым разуменнем цывілізаванага палітычнага і грамадскага ўладкавання. Гэта значыць, што мы, "нацыянальна заангажаваныя", перастанем быць адно нейкай механічнай сілай для татальнай экспансіі нацыянальнай ідэі на прастору ўсёй Беларусі і вызначым сябе ў якасці самадастатковага суб'екту ўнутры гэтай прасторы, зразумеем сябе як актуальную праблему, якую мы самі для сябе мусім і здольныя вырашыць... Вырашыць менавіта праз сябе, а не праз прылучэнне да нас (да нацыянальнай ідэі) астатняга насельніцтва Беларусі.

Прынамсі, перадусім гэтая праблема мусіць выступіць як наша ўласная праблема, і ўжо толькі пабочна — як экспансія нацыянальнай ідэі вонкі...

# ЖЫЦЦЁ І СМЕРЦЬ У ДЫСКЕЦЕ З АЙЧЫНАЙ

Усялякая дзяржава ёсць нішто іншае, як суплёт правоў і абавязкаў дзяржавы перад яе грамадзянамі — і наадварот. Адсутнасць узаемных правоў і абавязкаў ці немагчымасць іх рэальна атрымліваць і выконваць з аднаго альбо з другога боку ператварае дзяржаву ў фікцыю, пакідае за ёй толькі ідэю дзяржавы, а за яе грамадзянамі — адно права маральнага выбару: наследаваць гэтай ідэі ці адсланіцца ад яе. Вось чаму ў сітуацыі з БНР (у сітуацыі адсутнасці ўзаемных правоў і абавязкаў) паперадзе ўсяго апынуўся “маральны выбар”.

Маральны выбар — рэч, безумоўна, сур'ёзная, але паколькі ён ужо зроблены, дык лагічна паўстае пытанне: а што з гэтым маральным выбарам рабіць далей, калі з дзяржавы, як кажуць, ні даць ні ўзяць?..

Пэўна, каб унікнуць гэтага пытання, я ў пару трызненняў над віртуальнай Беларуссю, бадай, нават інтуітыўна (бо тады, здаецца, не думаў над гэтым) зачапіўся за “гульню”, паколькі гульня аўтаматычна здымала праблему правоў і абавязкаў.

Так, гульня не надзяляе цябе ніякімі правамі, але яна і не патрабуе ад цябе ніякіх абавязкаў, апрача абавязку прытрымлівацца правілаў гульні. Яна нічога табе не абяцае, акрамя магчымасці гуляць у тую гульню, якая табе падабаецца, бо праз яе ты можаш кампенсаваць тое, чаго пазбаўлены ў рэальным жыцці.

Я выдумляў Беларускую Нацыянальную Рэспубліку як гульню для тых, хто яе (у значэнні нацыянальнай ідэі) ужо даўно выбраў як тоесную ягонай экзістэнцыі форму духоўнага і інтэлектуальнага існавання, але не мае магчымасці рэалізаваць гэты выбар з прычыны неадпаведнага соцыуму. Якраз з гэтага

гульня ў БНР уяўлялася мне адным з (хай сабе і фантастычных у сэнсе рэалізацыі) спосабаў хоць частковай гуманізацыі той пачварнай дысгармоніі, якая заўсёды ўзнікае, калі твая фізічная прысутнасць у сацыяльна-дзяржаўным дыскурсе цалкам розніцца з інтэлектуальнымі і эмацыянальнымі запатрабаваннямі твайго “я”.

Змушаны жыць у антаганістым мне соцыуме, я вымройваў нейкую эфірную айкумену, якая б аб’яднала мяне з падобнымі ў нейкім маштабным, увесь час інтрыгуючым праекце, альтэрнатыўным маёй прысутнасці сярод рэаліяў светаглядна староннягa мне свету...

Дарэчы, пра “маштабнасць праекту”. У тых маіх ліхаманкавых трызненнях гульня ў віртуальную Беларусь ахоплівала кожнага, хто пажадаў бы ў ёй удзельнічаць, незалежна ад таго, куды яго закінуў лёс — у Рэспубліку Беларусь, Аўстралію ці на Камчатку. Дзяржава без хоць якога лапіку сваёй зямлі магла б дазволіць сабе быць бязмежнай.

Нацыянальная Дзяржава, якая заўсёды з табой, незалежна ад геаграфічных каардынатаў і формаў таго соцыуму, у які ты патрапіў,— магчыма, гэта было б выйсцем для таго, хто бачыць у страце нацыянальнай ідэнтычнасці страту самога сябе... Магчыма, каб гэта было хоць як магчыма... Хоць як?..

Пазбаўленыя сваёй дзяржавы, гнаныя са сваёй зямлі і раскіданыя па ўсім свеце габрэі змаглі застацца самімі сабой і праз дзве тысячы гадоў вярнуцца на сваю “гістарычную радзіму” таму, што дзве тысячы гадоў гулялі ў сваю гульню паводле правілаў, выкладзеных у Бібліі (хай даруюць мне вернікі гэтае і наступнае рызыкоўныя параўнанні), і пад наглядам суддзі, які ў габрэяў называўся Бог.

Але, як вядома, беларусы — не габрэі. Беларусы залішне сур’ёзна ставяцца да жыцця, каб гуляць у жыццё. І гэта, пэўна,

таксама няблага. Толькі, як сведчыць гістарычны досвед, калі ты не ўмееш сам забаўляцца, дык табой забаўляюцца іншыя.

## ДОЎГАЯ, ВЕЛЬМІ ДОЎГАЯ ПАЎЗА

Не асмейваць чалавечых учынкаў,
не пераймацца імі і не клясці іх, а разумець.
Бенедыкт (Барух) Спіноза.

У панядзелак (пасля рэферэндуму 1995 году), дачка запытала, як людзі прагаласавалі “пра бел-чырвона-белы сцяг і мову”?

Яна толькі ўвайшла ў хату, стаяла з ранцам за плячыма (тады вучылася ў другім класе) і напята чакала майго адказу.

Праз радыё я ўжо ведаў жалобныя вынікі рэферэндуму і сказаў праўду… — З вачэй дзяўчаня пырснулі слёзкі.

Добра, што я быў апрануты на працу і меў усе падставы хуценька схавацца за дзвярыма, бо што б я ёй сказаў, чым суцешыў?!

Але яшчэ не паспеўшы схавацца за дзвярыма, я ўжо быў поўны, як звон, нянавісці, якая сама сабой загула словамі: *гэтага* ***яму*** *я ніколі не дарую…*

Натуральна, той даўні эпізод узгадаўся не так сабе. Сваім эмацыйным успамінам я хацеў нагадаць, што бадай у хоць-каго з дэмакратычна (а тым болей яшчэ і нацыянальна) заангажаваных грамадзянаў нашай краіны здараўся момант, калі ён зацінаў у сабе нешта падобнае да *“гэтага* ***яму*** *я ніколі не дарую”.* Інакш і быць не можа, бо за дзесяцігоддзе сваёй улады Аляксандр Лукашэнка стварыў столькі сітуацыяў, у якіх абражалася і рэпрэсавалася годнасць чалавека, што іх поўны пералік можна было б уціснуць хіба ў бясконцасць стужкі Мёбіуса. Тут і бязлітаснае ўдушэнне страйку працаўнікоў метрапалітэну

(скуль і набрала хаду рэпрэсіўная машына), і гвалт над дэпутатамі ў будынку парламенту, і “дзікае паляванне” на ўдзельнікаў мітынгаў ды шэсцяў, і хамавітае шальмаванне палітычных апанентаў (ва ўсіх магчымых спосабах), і вандалізм да нацыянальных святыняў (найперш сцягу ды гербу), і маўклівы пераслед беларускай мовы (і яе носьбітаў), і публічнае абсцёбванне функцыянераў markup рознага гатунку, і запалохванне “дырэктарскага корпусу”, і знікненне апазіцыйных палітыкаў…

Хопіць. Бо я зусім не маю на мэце ў чарговы раз даводзіць, які Аляксандр Лукашэнка нехарошы палітык. Хаця б таму, што харошых палітыкаў не бывае. Палітыкі бываюць вялікімі і нязначнымі, папулістамі і прагматыкамі, рэфарматарамі і кансерватарамі, агрэсарамі і міратворцамі… Але харошымі палітыкі a priori не бываюць. І калі мы вымяраем Аляксандра Лукашэнку мерай той крыўды, што ён нам учыніў, дык блытаем палітыка з начальнікам камунгасу, які не паруліўся завезці людзям торф на зіму.

***

У кожнай сферы дзейнасці ёсць свае параметры, якімі ацэньваюцца дасягненні таго ці іншага чалавека. У даяркі — гэта колькасць літраў малака ад адной каровы, у бізнесоўца — прыбытак за год, у альпініста — вышыня гары…

А вось дасягненні палітыка выяўляюць колькасць (у сэнсе працягласці) і якасць (у сэнсе паўнаты) улады. І тут не істотна, якімі сродкамі палітык атрымаў і ўтрымлівае ўладу: самачынным гвалтам, рэпрэсіямі, папулізмам ці наспелымі рэформамі ды разумнымі законамі. (У маштабах *палітыкі* Сталін і Брэжнеў — велічыні несумерныя, хаця апошні, прынамсі да перыяду “старэчага маразму”, па чалавечых мерках быў куды як больш

людскім раўнуючы да Сталіна.)

Зыходзячы з гэткага падыходу, мы мусім канстатаваць, што Аляксандр Лукашэнка, які амаль адразу пасля свайго абрання на пасаду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь займеў, лічы, абсалютную ўладу над усёй краінай і трымае яе ўжо дзесяць гадоў — не абы што сабе палітык.

Між іншым, заўважым, Аляксандр Лукашэнка адзіны, хто на еўрапейскай частцы былога посткамуністычнага блоку (а не толькі СССР) утрымаўся на прэзідэнцтве столькі часу. За гэтую пару Літва змяніла ўжо трох прэзідэнтаў, а "наш", відавочна, збіраецца і далей доўжыць свой марафон і ніхто яму не можа даць рады: ні апазіцыя, ні Захад, ні Масква. Таму калі нехта ўсё яшчэ думае, што Лукашэнка ўсяго толькі прыкрая недарэчнасць аднаго з эпізодаў беларускай гісторыі, а ягонае палітычнае "доўгажыхарства" неяк само сабой атрымліваецца, дык ён радыкальна памыляецца. На палітычнай верхатуры выпадковыя людзі доўга не трымаюцца. Там заўсёды ёсць каму падштурхнуць у спіну, калі ў цябе дрыжаць каленкі.

Упершыню рэальна ўвесь свой палітычны патэнцыял Аляксандр Лукашэнка выявіў тады, калі негалосна абʼявіў рушэнне на Крэмль…

Як пайшла пра тое пагалоска, дык спачатку ад рогату ўсе (што тут, што ў Маскве) ледзьве не панадрываліся (маўляў, калгаснік, палітрук, "піліп з канапель" — і на імперскі трон). Але вельмі хутка смехачам сталася не да смеху. Рэйтынгі Аляксандра Лукашэнкі ў Расеі "зашкалівалі", самыя буйныя расейскія бізнесоўцы вешалі яго партрэты на сценах сваіх кабінетаў, а расейскія губернатары прымалі Аляксандра Рыгоравіча ў сваіх "вотчинах", як быццам на ім ужо была шапка Манамаха.

Крэмль не на жартачкі ўстурбаваўся, аднак нічога лепшага не змог прыдумаць, як забараніць Аляксандру Лукашэнку самастойна гойсаць па расейскай частцы ім жа створанай

Саюзнай дзяржавы…

Толькі яшчэ невядома, чым бы ўся гэтая гісторыя скончылася, калі б Барыс Ельцын не прыняў рашэнне, сапраўды вартае вялікага палітыка. Сярод тысячаў расейскіх чыноўнікаў ён відушча ўчуяў Уладзіміра Пуціна і перадаў яму ўладу над зняможанай Расеяй.

Аляксандр Лукашэнка калі не адразу, дык досыць хутка зразумеў, што ягоная гульня на расейскім полі скончаная і паспяшаўся перакінуцца з "вялікага інтэгратара" ў "нацыяналіста".

Аднак гэта ўжо іншы сюжэт.

***

Палітык (прынамсі, маштабны) не столькі чалавек, колькі звер. У тым сэнсе, што ў яго, як у звера, мусяць быць гіпертрафавана выяўленыя (адносна чалавека) інтуіцыя ды розныя інстынкты (найперш інстынкт улады). Уласна чалавечыя якасці (сумленне, адукацыя, інтэлект) толькі замінаюць палітыку. Вось чаму сярод знаных палітыкаў мы амаль не знойдзем выбітных навукоўцаў, слынных філосафаў, вялікіх маралістаў…

Ёсць толькі адзіная чалавечая якасць, якой палітык мусіць валодаць лепей за чалавека. Гэта — умельства гаварыць (не абавязкова шмат).

Па ўсіх пералічаных параметрах (інтуіцыя, уладныя інстынкты, красамоўства) Аляксандр Лукашэнка мала якому іншаму прэзідэнту саступіць. Але асабіста мяне найбольш захапляе дэмагагічны складнік ягоных казаняў.

Аляксандр Лукашэнка — дэмагог ад Бога (калі пагадзіцца з хрысціянскім дагматам, які сцвярджае, што ўся ўлада ад Бога). *Проста* дэмагог — хай сабе і таленавіты,— прамаўляючы ведае, дзе ён праўдзівы, а дзе "займаецца дэмагогіяй". А вось дэмагог

ад Бога (як Лукашэнка), што б ні казаў, свята верыць у тое, аб чым у кожны пэўны момант галосіць. І з гэтага шмат хто яму дае веры…

Вышэй, пералічваючы “звярыны” набор якасцяў палітыка, я неабачліва прамінуў “інстынкт тэрыторыі”. Для звера, акрэслены ўласнымі пахамі параметр падуладнай тэрыторыі — базавая велічыня яго існавання. Тое самае і ў палітыка, толькі ў апошняга “інстынкт тэрыторыі” трансфармуецца ў “інстынкт пазіцыі”, рухомага модусу прысутнасці, які ўвесь час мадыфікуе прастору ягонай улады, адпаведна зменам геапалітычнай рэальнасці.

Аляксандр Лукашэнка найлепей выявіў “інстынкт пазіцыі” тады, калі развітаўся з нацыянал-дэмакратамі (і сацыял-дэмакратамі, і лібераламі…) і пачаў апазіцыянаваць сябе як пераемніка каштоўнасцяў “вялікай імперыі” і савецкага ладу жыцця.

На тую пару (пачатак дзевяностых) гэтае рашэнне Аляксандра Лукашэнкі шмат каму магло падацца бязглуздым. Бо ўсё абуджанае перабудовай да жыцця імкнулася як надалей адсланіцца ад ушчэнт дыскрэдытаванай “імперыі зла”. Палітычная перспектыва бачылася толькі за дэмакратыяй, незалежнасцю, рынкам, лібералізацыяй…

Усё як быццам слушна — за адзіным выключэннем. Згаданыя інавацыі (верагодна, тэарэтычна бездакорныя) не мелі тады ў Беларусі патэнцыялу рэальнай улады. І Аляксандр Лукашэнка пакінуў гэтыя пазіцыі (як бесперспектыўныя) іншым, з больш слабой палітычнай інтуіцыяй і з менш развітым інстынктам улады. І да гэтай пары ён спіхвае на тую *тэрыторыю няўдобіцы* ўсіх новых супраціўнікаў, добра разумеючы, што нічога палітычна вартага ўскаласіцца там пакуль не можа.

Для палітыка, пакліканага ў гэты свет рэалізоўваць волю ўлады, як волю да ўлады, зусім не істотна, у якім палітычным

дыскурсе (ліберальным, нацыянальным, сацыялістычным, камуністычным…) выяўляць сваё пакліканне. Засвоіў некалькі ліберальных ці нацыяналістычных лозунгаў і маніпулюй імі, пакуль не наспее час мяняць пазіцыю. Але найбольш аптымальны варыянт атрымліваецца тады, калі сацыяльная канстанта палітыка хаця б збольшага тоесніцца з ягонай праграмай. І ў гэтым сэнсе Аляксандру Лукашэнку ў свой час моцна пашэнціла. Ён, наскрозь і завершана савецкі ды імперскі, ідэальна супаў з большай часткай такога ж самага беларускага электарату. Таму яны (Лукашэнка і электарат) вельмі хутка паразумеліся паміж сабой. Крэда гэтага паразумення беларускі прэзідэнт выказаў наступным чынам: *За цывілізаваным светам я сваю краіну не павяду*.

Хто толькі не кпіў з гэтага шэдэўру красамоўства?! А дарма. Бадай нідзе і ніколі Аляксандр Лукашэнка не фармуляваў феномен сваёй улады гэтак лапідарна, ёміста і кантрастна.

“Цывілізаваны свет” (дэмакратыя, рынак, розныя свабоды і г.д.) і пасля распаду СССР заставаўся глыбока варожым савецкаму чалавеку, якім пераважна і быў беларускі грамадзянін.

Савецкі чалавек марыў мець капіталістычныя даброты, не супраць быў з’ехаць жыць “на захад” ці хаця б выправіць туды дзяцей на вучобу, але *тут і цяпер* на сваіх палетках і гонях, у сваім мікараёне і на сваёй фабрыцы ён ні пра які “цывілізаваны свет” нават слухаць не хацеў. І, між іншым, меў рацыю ў сваіх засцярогах, бо, па сутнасці, раптоўнае і татальнае нашэсце капіталізму на Беларусь было б для яго нічым іншым, як чарговай акупацыяй. Натуральна, новы акупант змусіў бы тутэйшага савецкага чалавека жыць паводле чужых яму законаў ды правілаў і бязлітасна караў бы галечай, калі б той умомант не перавучыўся завіхацца на “цывілізаваны” капыл.

Дык вось, сваім знакамітым выслоўем Аляксандр Лукашэнка рашуча запэўніў пераляканых беларусаў: не пераймайцеся,

пакуль мая ўлада, мы не аддамо нашу Бацькаўшчыну пад *акупацыю* “цывілізаванаму свету”.

На здаровы клёк прамова як бы бязглуздая, але акрэсленая ёю палітычная пазіцыя — пераможная. І хто з каго тут мае болей падставаў смяяцца?

***

Неяк Вальтэр сказаў, што калі б Бога не было, дык яго варта было б прыдумаць. Бадай тое самае можна сказаць і пра Аляксандра Лукашэнку стасоўна Беларусі…

Распад СССР не стаўся для нас катастрофай. Прынамсі, у адміністрацыйна-гаспадарчым плане краіна цалкам была падрыхтаваная да самастойнага ладу жыцця. І хаця “разрыў эканамічных сувязяў” стварыў шэраг сур’ёзных сацыяльна-эканамічных нязручнасцяў, асноўная праблема незалежнага існавання палягала зусім не ў эканоміцы, а ў адсутнасці досведу палітычнай улады. Праўда, раней гэтага досведу трохі мелі беларускія камуністы, але ўсе іх уладныя інстытуцыі і структуры ляснулі яшчэ напярэдадні развалу СССР.

Лёгка было на мітынгах палымяна дэклараваць, што мы самі хочам і можам быць гаспадарамі на сваёй зямлі. Хацець як быццам сапраўды многія хацелі, а вось “магчы” — дык не надта каб у каго атрымлівалася. Што і паказаў пачатак незалежнасці, калі ўся ўлада ў краіне была згорнутая да памераў будынку Вярхоўнага Савету (добра, што пад “гарачую руку” хоць Вярхоўны Савет не згамавалі, як інстытуцыю, створаную камуністамі).

Пазней Аляксандр Лукашэнка будзе казаць (і не аднойчы), што тады ўлада валялася пад нагамі, але ніхто не схацеў нават нахіліцца, каб яе падняць. Фармальна гэта як быццам і слушна, хаця, па сутнасці, усё выглядала інакш. Калі зірнуць на пачатак

дзевяностых агулам, дык мы ўбачым наступнае: гістарычнага і практычнага досведу ўлады няма, ні дэмакратычных, ні камуністычных структураў ды інстытуцыяў улады няма, грамадзянскай супольнасці няма, канвенцыйнай нацыянальнай ідэі няма… З усяго гэтага татальнага "няма" і вынікала асноўная праблема: на чым (у адсутнасці грунту) паўставаць уладзе, дзе ёй сталець і множыцца?

Магчыма, гэта залішне радыкальна, але, з майго ўзгляду, на зачын дзяржаўнай улады тады заставалася толькі адно месца — прастора персанальнага "я". У нас не было выбару яшчэ якой формы ўлады ў тым сэнсе, што альбо знойдзецца такіх амбіцыяў і здольнасцяў чалавек, які наважыцца рэалізаваць Беларусь, як свой уласны праект, альбо Беларусь неўзабаве зноў апынецца ў сітуацыі нічыйнай зямлі, якую ў кожны момант можа прырэзаць да свайго надзелу не той, дык іншы сусед.

Карацей кажучы, як на сённяшні свой розум, дык я не бачу для Беларусі дзевяностых гадоў іншай формы ўлады, апрача дыктатуры альбо, як мінімум, жорсткага аўтарытарнага рэжыму. Ні для чаго іншага рэальных падставаў на тую пару тут не было. Таму нам нічога не заставалася, адно як *прыдумаць* (паводле Вальтэра) таго, хто стане "Аляксандрам Лукашэнкам", бо інакш будзе ўжо зусім нядобра.

Зрэшты, трудзіць глузды беларусам не спатрэбілася, паколькі гісторыя нарэшце злітасцівілася над намі і падрыхтавала на "дэмакратычны" выбар дзве роўнавялікія фігуры: Зянона Пазняка і ўласна Аляксандра Лукашэнку.

Калі б беларусы, як прыбалты, выявіліся апантанымі "нацыяналістамі", яны мелі б прэзідэнцкую дыктатуру Зянона Пазняка. На іншы выпадак у дублёрах чакаў Аляксандр Лукашэнка.

Як усе мы добра памятаем, чакаў ён не вельмі доўга.

***

Шчыра кажучы, у феномене Аляксандра Лукашэнкі мяне мала цікавіць і ён сам, і ягоны феномен. Аляксандр Лукашэнка ўсяго толькі адзін з агентаў волі ўлады (гісторыя чалавецтва падобных ведае мноства), якому было наканавана выявіцца і рэалізавацца ў Беларусі ў пару яе чарговага паўставання над роўняддзю быцця.

Мая абыякавасць да Аляксандра Лукашэнкі абумоўленая яшчэ і тым, што Беларусь сама па сабе (без персанальнай улады над Беларуссю) яго, здаецца, цалкам абыходзіць. Калі б яму ўволю хапіла той самай волі да ўлады, дык ён ужо даўно сядзеў бы ў Крамлі і пра занядбаную “малую радзіму” публічна нават не згадваў бы — каб не псаваць зіхату свайго іміджу.

Вось чаму ў феномене Аляксандра Лукашэнкі мяне ніколькі не цікавіць ён сам, а толькі мы — кожны паасобку і ўсё беларускае паспаліцтва агулам.

Неяк мне прыдумаўся немудрагелісты афарызмік: *паглядзі на сябе ў люстэрка і там убачыш Лукашэнку.* Але той афарызмік мне адразу не спадабаўся (і зусім не таму, што яго недарэчы заканцавала рыфма). Я адчуваў, што недзе ўспратах прыпадабнення ўсяго беларускага народу да першага Прэзідэнта крыецца вялікая хіба. І толькі нядаўна нарэшце зразумеў, чаму беларускі прэзідэнт ніякае не люстэрка, бо ён — наша вялікая паўза.

Аляксандр Лукашэнка — наша вялікая паўза ў тым сэнсе, што каб асягнуць вышэйшую ўладу і трымаць яе цягам стольkіх гадоў, яму спатрэбілася прыпыніць плынь часу, затрымаць яго ў формах і канфігурацыях, якія засталіся ў Беларусі ад савецкай пары. За гэтую затрымку хто толькі яго не ганіў. А я вось дык і зусім наадварот — удзячны яму за тое (магчыма, усяго за тое і

ўдзячны).

Вышэй ужо казалася, што тая адміністрацыйна-гаспадарчая сістэма, якая нам дасталася пасля распаду СССР, была цалкам прыдатная для незалежнага існавання. Не ставала толькі рэальнага досведу самастойнай улады. Але калі па вялікім рахунку, дык нам найперш не хапала іншага, а менавіта разумення беларускім грамадствам сваёй анталагічнай самасці, цэласнага ўяўлення пра тое, хто мы такія ёсць (і ці ёсць мы ўвогуле), скуль тут апынуліся і куды нам праставаць далей? Праўда, гэткае "разуменне" было з'явілася ў нацыянал-дэмакратычнага руху. Аднак досыць хутка высветлілася, што яно было такім толькі для саміх чальцоў гэтага руху (з чаго ён пакрысе і заняпаў).

Адным словам, беларусам яшчэ трэба было зразумець сябе іншымі і ад тых, якімі іх выдумалі камуністы, і ад тых, якімі іх вымудрылі нацыянал-дэмакраты. А для таго, каб наноў зразумець, чым (кім) ёсць гэтая дзесяцімільённая сукупнасць людзей (на пачатку незалежнасці паяднаная між сабой адно дзяржаўнымі межамі Рэспублікі Беларусь), неабходны быў час. І Аляксандр Лукашэнка нам яго адшкадаваў — запыніўшы.

З ягонай ласкі (хай сабе і не дзеля нас матываванай) беларусы змаглі спакойна агледзецца навокал, без спеху пакорпацца ў саміх сабе, прачуць сваю затуленасць уласнай дзяржавай (і скразнякі ў яе агароджы). Але самае галоўнае, што за гэты час яны патроху пачалі намацваць саміх сябе, са здзіўленнем адзначаючы, што нехта апрычоны тут, здаецца, сапраўды ёсць.

Праўда, у гэтай вялікай паўзе беларусы і шмат чаго страцілі, найперш у рэфармацыйным, дэмакратычным ды нацыянальным дыскурсах. Толькі скуль каму вядома, колькі б чаго яны па дарозе растрэслі, каб адразу на злом галавы пабеглі ў тую ці іншую рэфармацыю (не надта ўяўляючы, хто і чаго туды бяжыць)?

Альбо вось дэмакратыя. Некаторыя чакаюць яе не раўнуючы Царства Божага на зямлі… Не, я ніколькі не супраць і нават зусім наадварот. Дэмакратыя, натуральна, лепей за дыктатуру ўжо хаця б таму, што пры дыктатуры ў цябе на карку сядзіць паганяты з бізуном, а як надарыцца дэмакратыя — дык усяго толькі з пугай.

Наастачу не прамінем згадкай і ніштажэнне ўсяго нацыянальнага. Тут можна суцешыць сябе хіба адно тым, што сваімі рэпрэсіямі Аляксандр Лукашэнка дапамог “свядомым” беларусам праверыць іх ідэалы на трывушчасць, а іх саміх — на меру ўпартасці ды мужнасці… Хаця, шчыра кажучы, усё гэта не лішне суцяшае.

***

Сёння цяжка сказаць, наколькі плённа беларусы скарысталіся дараванай ім *паўзай*. Напэўна, не вельмі плённа…

Прынамсі, мы дасюль застаемся нацыяй, якую яшчэ трэба прыдумаць, дакладней, якую мы самі яшчэ мусім прыдумаць, як універсалію, прыдатную для супольнага ўжытку кожнаму асобнаму чалавеку.

А пакуль не прыдумалі (і не паверылі ў сваю прыдумку!), нам, на вялікі жаль, ніяк не абысціся без “Лукашэнкі”, пад якім бы прозвішчам ён ні быў запісаны ў пашпарце.

## АСОБА І ГІСТОРЫЯ

Дваццатае стагоддзе апынулася большым за ўсю папярэднюю гісторыю чалавецтва. За гэты век людзі нарабілі столькі ўсялякага, што сярод гэтага наробку для саміх сябе месца амаль не засталося. Ужо нават неба хутка не будзе ставаць, каб змясціць усё, што пазакідалі над галовы.

Затое ніколі раней не было і гэткіх стратаў. Памёр Бог, ляснуліся гісторыя з геаграфіяй, ушчэнт выпетрыліся адлегласць і час, знік недзе чалавек (засталіся адно людзі), а ўсіх ацалелых звяроў і птушак можна па заапарках рассяліць, ды яшчэ пустыя клеткі застануцца...

А колькі за гэты век было падзеяў, ад якіх ходырам хадзіла зямная куля! Сусветныя войны і сусветныя рэвалюцыі, развалы імперый і атамныя землятрусы, генацыды народаў і тэхнагенныя катастрофы (усяго да ночы не пералічыць). І сярод усёй гэтай апакаліптыкі адной з самых значных падзей, безумоўна, быў крах Вялікай камуністычнай імперыі. Пасля яго ўвесь свет адразу радыкальна перамяніўся... Як вядома, зачынальніка той глабальнай перамены звалі Міхаіл Гарбачоў.

Гэта быў добры жарт гісторыі. У эпіцэнтр падзеі сусветнага маштабу падставіць чалавека, крэатыўнага патэнцыялу якога (у іншых варунках) было б хіба даволі адно для шараговага губернатару.

Тут адразу згадваецца ці не самы праблемны з дыскурсаў дыялектычнага матэрыялізму. А менавіта, роля асобы ў гісторыі.

З тэорыі класікаў марксізму-ленінізму як быццам адназначна вынікала, што роля асобы ў гісторыі, лічы, аніякая. Бо змены сацыяльна-грамадскіх фармацый (і камунізм у перспектыве) адбываюцца не з ініцыятывы тых альбо іншых герояў, а толькі праз назапашванне сродкаў вытворчасці (і ўсялякага да таго падобнага). Хаду гісторыі не толькі не спыніць, але нават і не скрывіць нікому паасобку.

Разам з тым, на практыцы ідэалогія марксізму-ленінізму не змагла абысціся без перманентнага прадукавання “культу асобы” ў самых розных маштабных вымярэннях, ад усепланетнага (Маркс, Энгельс, Ленін, Сталін, Мао) да мястачковага (герой-партызан, падпольшчык, камбайнёр...).

Калі ў маёй, спрэс заштампаванай савецкай адукацыяй галаве, пачало сёе-тое прасвятляцца, я нейкі час цікаваў, як праз штукаванне розных амбівалентных канструкцый тадышнія філосафы ад марксізму-ленінізму спрабавалі палагодзіць міжсобку ідэалогію з тэорыяй стасоўна ролі асобы ў гісторыі. Няцяжка здагадацца, што з тых інтэлектуальных мітрэнгаў партыйнага мыслярства нічога пэўнага і пераканаўчага не атрымлівалася...

Але нічога пэўнага не атрымліваецца і ў мяне, калі я сёння, праз дваццаць гадоў пасля прыходу Міхаіла Гарбачова ў "генсекі", спрабую зразумець, ці была хоць якой роля ягонай асобы ў той гісторыі з крахам камунізму?

Міхаіл Гарбачоў быў звычайным "генсекам" (іншага ніхто б тады і не пусціў на верхатуру камуністычнай імперыі). Незвычайным у ім было, бадай, адно — маладосць (і гэтага не пралічылі патрыярхі палітбюро, калі ім устыла штогод хаваць лідэраў усяго прагрэсіўнага чалавецтва і яны навярнуліся на перспектыўнага, у сэнсе пажыць, Гарбачова). Канцэптуальная памылка. Бо Міхаіл Гарбачоў усё ж такі трохі недабраў партыйнага часу, каб з яго паспела дарэшты выпетрыцца ўсё жывое, прыстойнае, чалавечае і з гэтага атрымаўся цалкам унармаваны "вождь". Хаця б яшчэ гадоў дзесяць пагаблявалі ў запасе — тады, можа б, мы і сёння за камуністамі жылі...

Малады ён і ў палітбюро малады. Яму яшчэ на людзі хочацца, перад дзеўкамі павыстаўляцца, славай ужывую падыхаць, а не праз папяровыя хваласпевы ў глухіх прыцемках крамлёўскіх пакояў.

Сёння ўжо нават цяжка сабе ўявіць той радасны шок, які скалануў усю краіну, калі людзі пабачылі на вуліцы, ну зусім побач з сабой, генеральнага сакратара ЦК КПСС. Чытачам іншага веку патлумачу, з чаго атрымаўся шок. Апрача як на трыбунах

з’ездаў ці на маўзалеі амаль ніхто з паспалітых не бачыў жывым Сталіна, Брэжнева, Андропава, Чарненку. (Праўда, быў выламаўся з партыйнай традыцыі Хрушчоў, але ягоны паход у народ успрынялі ўсяго толькі як кур’ёз.) Гэта значыць, што больш за паўстагоддзе, недзе з 1930-х гадоў, кіраўнікі СССР (і лідэры ўсяго прагрэсіўнага чалавецтва) для “шырокіх народных масаў” існавалі адно ў сімвалічнай ролі. Бо трыбуна партыйнага з’езду ці маўзалей ні каліва не дадавалі ім рэальнасці, паколькі на трыбуне і звычайны шараговец ужо трохі помнік...

Болей за тое, неўзабаве Міхаіл Гарбачоў пачаў з’яўляцца на людзях не проста чалавекам, а мужам з жонкай. Раней ніхто нават і падумаць не мог, што ў генеральных сакратароў бываюць жонкі. І так думаць было цалкам слушна, паколькі жанаты сімвал — гэта нейкі вычварэнскі аксюмаран.

Зразумела, гэта толькі паэтычная гіпотэза, але, як мне ўяўляецца, сусветны крах камунізму пачаўся менавіта з усенароднага захаплення новым кіраўніком СССР. Натуральна, не наўпрост з эйфарыі пачаўся, а, так бы мовіць, апасродкавана. Спачатку гэтае захапленне апанавала самога Міхаіла Сяргеевіча. Было цудоўна пачувацца не толькі выбраным (палітбюро), але і абраным (народам). Сёння мы назвалі б гэта “электаральнай падтрымкай”. Аднак тады яшчэ ні пра што такое не ведалі, бо ніколі раней лідэраў партыі не цікавіла, падтрымлівае іх народ ці не. Яны рабілі тое, што лічылі мэтазгодным, а затым адпаведныя ідэалагічныя структуры арганізоўвалі ўсенародную ўхвалу чаго заўгодна: ад саюзу з фашыстоўскай Германіяй да ганьбавання камуністычнага Кітаю.

“Любоў народная” зрабіла Міхаіла Гарбачова кіраўніком краіны як бы ў квадраце. Яна сталася для яго нечым накшталт

“другога палітбюро”, і з гэтага ён мог пры нагодзе ўпэўнена канфрантаваць з тым першым, якое яго толькі выбрала.

Аднак любоў народу недвухсэнсоўна патрабавала адпаведных захадаў з боку абранніка і нават падказвала, якімі яны мусяць быць. Паколькі генсека ўпадабалі за прастату і людскасць, дык думка пра “сацыялізм з чалавечым тварам” з’явілася бадай сама сабой і прыйшлася цалкам да месца.

Упершыню “сацыялізм з чалавечым тварам” паспрабавалі пабудаваць у Чэхаславаччыне ў другой палове 1960-х гадоў. Толькі там гэты твар вокамгненна ўпляжылі ў пражскі брук тракамі савецкіх танкаў.

Але нават каб танкаў не было, дык нічога з той чэхаславацкай задумы не атрымалася б, паколькі сацыялізм (прынамсі, камуністычнага фармату) таму і сацыялізм, што ён не мае і не можа мець твару. Ні чалавечага, ні якога там яшчэ.

Калі вада залішне падпірае запруду, крый Божа рабіць у ёй адтуліну, каб паслабіць напругу...

Нават у тым маразматычным палітбюро разумелі, што за семдзесят гадоў улады саветаў сацыяльнай напругі назбіралася аж занадта і таму палітбюро заўсёды хапала старэчай абачлівасці не кранаць шматлікія запруды, якія трымалі сацыялізм. Але Міхаіл Гарбачоў быў малады, і яму яшчэ хацелася авантураў.

Ён іх і прыдбаў — з гакам.

Паўторым да месца: Міхаіл Гарбачоў быў звычайным “генсекам”. І яму, як кажуць, нават у жахлівым сне не магло прысніцца, што якраз з ягоных ініцыятываў ляснецца не толькі сусветная сістэма камунізму, але разам з ёй гэпнецца і ейнае трывалішча — Савецкі Саюз. Верагодна, каб ён ведаў наперад, як яно далей будзе, дык уласнымі рукамі сам сябе засіліў (хаця

на гэткае і не выглядаў здатным). Аднак пра апакаліптычнае ён ужо ж напэўна тады і не думаў, бо шчыра хацеў усяго толькі дабра ды росквіту і савецкім людзям, і вялікай краіне, і светлай будучыні. А калі стала ясна, што адбываецца нешта зусім іншае, раўнуючы з тым, аб чым яму мроілася, ён ужо не мог даць рады сваволі падзей.

У адрозненне ад камуністычных лідэраў першай рэвалюцыйнай пары, якія ўмелі ўтаймоўваць народную стыхію і менавіта праз гэтае ўмельства станавіліся лідэрамі, пазнейшыя (пасля Сталіна) у ім не мелі патрэбы. Усё і ўсюды даўно было ўпарадкавана ды злагоджана, на месцы дробнабуржуазных стыхій віраваў энтузіязм працоўных масаў і ніякіх праблем тут нават у перспектыве не прадбачылася. На верхатуру Крамля цяпер узбіваліся не тыя, што маглі “з усім народам гутарку весці” (ці заліваць яго па горла крывёю), а здольныя гаспадарнікі, пры гэтым не пазбаўленыя таленту кулуарнай барацьбы за ўладу.

Таму калі не толькі “народныя масы”, але і сама гісторыя з геаграфіяй раптам усчынілі бунт, Міхаіл Гарбачоў разгубіўся, ды так моцна, што надалей ад яго адно разгубленасць і засталася. Ён ужо нічога не разумеў, што адбываецца ў свеце. Але і што побач з ім адбываецца, ён таксама не разумеў. Апошняе было яшчэ і балюча, бо яго як бы без дай прычыны разам узнелюбілі і палітбюро, і той самы народ; а жонку Раісу народ дык аж узненавідзеў. І нават яго электарат, які ён сам упершыню і сфармаваў як уласна электарат (былыя дысідэнты, дзеячы культуры і навукі, проста інтэлігенты, слухачы замежных радыёстанцый, чытачы тоўстых часопісаў, “нефармалы” і да т.п.) пачаў спехам пакідаць яго на карысць ужо зусім рэвалюцыйнага Барыса Ельцына.

Як добра падумаць, дык ГКЧП і Барыс Ельцын супольна выратавалі Міхаіла Гарбачова ад яшчэ больш ганебнага фіналу

(і бадай што ўратавалі чалавеку жыццё). Бо без староннях волі ён самахоць не збочыў бы з “генсекаў”. Разгублена і бязвольна ішоў бы паўз бурапенны век і далей — невядома куды, але да першай бездані.

За той час, што прамінуў пасля “перабудовы”, якіх толькі (і колькі!) аналітыкаў не панапісана, дзе “поздним умом” пераканаўча тлумачыцца, чаму камуністычная імперыя мусіла разваліцца. Але найлепшая з аналітык — гэта сам час, які прамінуў з той пары. Калі б яны (і камунізм, і СССР) разваліцца не мусілі, дык за столькі гадоў ужо павінны былі б не тым, дык іншым спосабам засведчыць свой жыццядайны патэнцыял. Толькі нічога падобнага да рэваншу і звадў няма.

Зрэшты, сёння ўжо добра бачныя і падставовыя прычыны гэтай “мусовасці”. Тэорыя камунізму ў сваіх канцэптах сусветнай рэвалюцыі ды інтэрнацыяналізму першай сфармулявала ідэю глабальнага свету, збудаванага на агульным для ўсіх зямлянаў ідэалагічным алгарытме. У XX стагоддзі практыкі камунізму паспрабавалі рэалізаваць гэтую тэарэтычную задачу — і не без пэўнага поспеху. Няблага атрымалася на пачатку стагоддзя, але асабліва ўдала пасля Другой сусветнай вайны, калі колькасць дзяржаў, якія на ўсіх кантынентах задэклеравалі сваю прыхільнасць да камуністычнай ідэі, вырасла неймаверна, і перспектыва сусветнага панавання камунізму ўжо зусім не выдавала на ўтопію.

Дэмакратычны Захад перапалохаўся. Ён тэрмінова заклікаў сваіх хаўруснікаў да кансалідацыі і дзеля большай пэўнасці аб'явіў таталітарнаму Усходу халодную вайну.

Лічыцца амаль аксіяматычным, што ўрэшце Захад гэтую вайну і выйграў. Але насамрэч нашэсце камунізму на сусвет

перапыніў не ўласна Захад, а выбух камунікацыяў, які спарадзіў іншы кшталт глабалізму — інфармацыйна-камунікатыўны. Апошні паводле ўсіх цывілізацыйных параметраў відавочна пераўзыходзіў (і, бадай, не на адзін парадак) ідэалагічны глабалізм. Тым і перамог — лёгка. Хаця калі быць больш дакладньм, дык інфармацыйна-камунікацыйны глабалізм непасрэдна з ідэалагічным і не змагаўся, ён проста адмовіў у легітымацыі ўсім ідэалогіям разам, і сярод іх — камуністычнай. Прыйсце постмадэрну якраз-такі і засведчыла гэты факт. У эпоху краху ўсіх ідэалогій у камунізму не было аніякіх шанцаў на перамогу.

Паколькі інфармацыйна-камунікатыўны глабалізм (паводле логікі развою тэхнакратычнай цывілізацыі) рана ці позна абавязаны быў згамаваць глабалізм ідэалагічны, дык атрымліваецца, што Міхаіл Гарбачоў мог сябе лішне і не дакараць за крах камунізму.

У канцэптуальным плане — мабыць, так, а вось у тэмпаральна-сітуацыйным?..

Андропаў і Гарбачоў атрымалі тую самую ўладу, лічы, у той самы час, а якія розныя вынікі?! Адзін нацягнуў лейцы так, што ўсялякі рух увогуле запыніўся, а другі цалкам наадварот — узяў ды закінуў цуглі ў бадыллё... І табуны падзей шалёным намётам панесліся ў розныя бакі свету.

Вось тут і думай што хочаш пра ролю асобы ў гісторыі. Ці то яна ёсць, тая роля, ці яе няма?

Дарэчы, у выпадку з Міхаілам Гарбачовым сітуацыю заблытвае яшчэ той факт, што тут і асобы не было. Быў здольны савецкі функцыянер, які з-за сваёй партыйнай няспеласці “наламаў дроваў” не раўнуючы сто бураломаў, а пасля сеў і заплакаў, як той бабёр.

Усё ніяк не знікае з памяці адзін увогуле звычайны газетны фотаздымак. Шырокафарматны. Па самым яго нізе ідуць насустрач адзін аднаму, з працягнутымі для вітання рукамі, два маленькія чалавечкі. Аднаго, вышэйшага, завуць Рональд Рэйган, другога — Міхаіл Гарбачоў.

Наўрад ці фатограф, здымаючы здаля лідэраў дзвюх супердзяржаваў на вялізнай пустой сцэне (відаць, з галёркі нейкага “форуму”), меў на мэце зганіць іх адмысловым ракурсам. Але атрымалася так, што фотаапарат зафіксаваў прэзідэнтаў дробненькімі, калі яны абодва паднялі па адной назе — і з гэтага як бы трохі страцілі раўнавагу,— неяк смешнавата матлянулі вольнымі ад вітання рукамі і па-дурнаватаму ашчэрыліся, хаця фармальна іх усмешкі былі надзвычай прыязныя.

Дык вось, калі гэты фотаздымак патрапіў на вочы, мяне чамусьці аж скаланула (іншыя на яго, магчыма, і ўвогуле не звярнулі ўвагі).

— Курдупелі! — выбухнула ўва мне. І ад гэтых двух курдупеляў залежыць лёс ці не ўсяго чалавецтва?!

— Які здзек, — ліхаманіла далей. Пасрэдны кінаакцёр і не менш пасрэдны савецкі функцыянер цяпер будуць апавядаць усяму свету, што яны на гэты раз збіраюцца з ім рабіць. І ўсе мы, сотні мільёнаў, мільярды працавітых, разумных, таленавітых будзем слухаць гэтыя дзве пасрэднасці і хоцькі-няхоцькі патураць іхнім словам.

Божа, цяпер я ведаю, якой была Твая апошняя кара нябесная. Сыходзячы, Ты аддаў нас у рукі палітыкаў.

Наўрад ці калі раней існавалі сферы жыцця, дзе хай сабе і здольны ў сваёй прафесіі, але пасрэдны, як асоба, чалавек, мог заняць у ёй вяршыннае месца. І толькі калі з’явіліся і запанавалі палітычныя дыскурсы (у сучасным разуменні палітыкі), такое

сталася магчымае і магчымае спрэс. Сёння чалавецтва (у яго шматлікіх фрагментах) ачольваюць калі не нікчэмныя, дык досыць ардынарныя персоны. Так, зазвычай яны цалкам функцыянальныя як палітыкі, але ці шмат пра каго з іх можна сказаць — Асоба. Вось чаму на абсалютную бальшыню палітычных курдупеляў адразу і забываюцца, як толькі яны сыходзяць з публічнай сцэны.

Феномен сучаснай палітыкі, як месца дзейнасці чалавека (і дамінуючае над усім месца) якраз тым і адметны, што ўласна чалавека ён і не патрабуе. Неабходны толькі набор пэўных якасцяў, а ў што гэтыя якасці ўгрунтаваныя (ці ўвогуле ні ў што не ўгрунтаваныя) — зусім неістотна. Больш затое, і палітычная структура, і сацыяльная сістэма даўно вызначыліся ў тым сэнсе, што яны могуць трывала і эфектыўна функцыянаваць адно тады, калі ў гэтым топасе для асобы паводле азначэння месца не будзе (хіба адно дзе на маргінэзе трохі вытыркнецца).

Дзіўная і трывожная сітуацыя! Чым больш магутны патэнцыял (ва ўсіх сферах дзейнасці) назапашвае людства, тым больш ардынарных персон яно патрабуе для сістэматызацыі і легітымацыі сваіх дзеянняў. А паколькі гэтыя а рrіогі банальныя персанажы “паводле законаў жанру” мусяць быць у цэнтры грамадскай увагі, дык яны яшчэ выступаюць і як бы мерай чалавека ўвогуле. З чаго (перадусім) мы маем татальную ды імклівую баналізацыю не толькі чалавецтва, але і ўсяго дыскурсу жыцця.

Сумна, да нуды сумна. Курдупелі авалодалі светам. Але тут, здаецца, ужо нічога не паробіш, бо сучасны свет сам абраў сабе за форму існавання палітыку. І ўсё сталася палітыкай, а што не палітыка, таго быццам бы і няма.

Вось і Беларусь аб’явілася сярод суб’ектаў еўрапейскай прасторы адно дзякуючы палітыцы ды палітыкам. І Міхаілу

Гарбачову найперш, хаця і паўз ягоную волю...

Дарэчы, перачытваючы сваю пісаніну, я быў непрыемна здзіўлены, што мой герой атрымаўся ну нейкім ужо зусім адмоўным. Але ж гэта няпраўда! Прынамсі, я сам пра яго асабліва дрэнна ніколі не думаў. Міхаіл Гарбачоў быў далёка не горшы сярод паліткурдупеляў. А можа,— і адзіны мне напраўду сімпатычны. Бо і на вяршынях улады, і сапхнуты адтуль, ён быў (і застаецца) досыць прыстойным суб'ектам.

Прыстойны палітык — які смешны збег словаў. Толькі я пэўны, што якраз гэтая прыстойнасць не дазволіла Міхаілу Гарбачову нават у пару самых драматычных забурэнняў пагнаць танкавыя калоны па ўсіх мацерыках і пазаліваць чалавечай крывёю пажары рэвалюцый.

Будзе няпраўдай сказаць, што на ім ані плямкі... На бруднай рабоце адно лайдакі застаюцца чыстымі. Але ў якую б краіну ён сёння не прыехаў, з ім шчыра вітаюцца і тыя, хто хутчэй адсячэ сваю руку, чым пацісне заплямленую чалавечай крывёю.

На гэтым і спынімся...

## УЛАДА І МОВА

Палітыка, як форма ўлады — гэта перадусім мова. Пакуль не было паўнавартаснай мовы, улада чалавека ў першабытным хаўрусе мала чым рознілася ад улады важака ў звярыным статку. І толькі са станаўленнем мовы дыскурсы тых ці іншых інтэнцыяў улады пачалі разгортвацца ў недасяжную раней далечыню — пазней сягаючы аж на іншыя кантыненты.

Я часам нават схіляюся да думкі, што дзякуючы менавіта *ўладнаму* патэнцыялу мовы (а не камунікатыўнаму, інтэлектуальнаму, эстэтычнаму і г.д., і да т.п.), яна займела тое значэнне і той

статус, якія займела. Іншымі словамі, маўленне сталася **мовай** найперш таму, што мова апынулася самым зручным інструментам для пашырэння і замацавання прасторы ўлады.

Натуральна, я ніякім чынам не маю намеру абараняць гэтую зусім не навуковую тэзу. Разам з тым, да месца не магу абмінуць згадкай слыннага Клода Леві-Строса, які кажа, лічы, пра тое самае (што праўда, не адносна ўсёй мовы, а толькі яе пісьмовай версіі). “Трэба прызнаць, што *першасная* (курсіў мой — **В.А.**) функцыя пісьмовай камунікацыі — паскарэнне працэсу зняволення людзей. Бескарыслівае ўжыванне пісьма дзеля інтэлектуальнага і эстэтычнага задавальнення ёсць ускосным вынікам, але і ён найчасцей ператвараецца ў сродак узмацнення, апраўдання ці прыхавання таго ж прыгнёту (“Сумныя тропікі”).

У прыклад да сваёй гіпотэзы Леві-Строс згадвае вялікія да-пісьмовыя імперыі Афрыкі і Паўднёвай Амерыкі, якія нейкі час валадарылі над мільёнамі людзей, але, не маючы пісьма, хутка рассыпаліся і знікалі. Звяртаючыся бліжэй да сучаснасці, Леві-Строс піша: “Сістэматычная дзейнасць еўрапейскіх дзяржаваў у XIX стагоддзі на карысць усеагульнай адукацыі была непарыўна звязаная з пралетарызацыяй насельніцтва і пашырэннем службы ў войску. Барацьба з непісьменнасцю, такім чынам, супадае з узмацненнем кантролю над грамадзянамі з боку Улады. Калі ўсе будуць умець чытаць, Улада зможа ўпэўнена казаць: няма каму адгаворвацца няведаннем закону”.

(У звязку з апошнімі развагамі Леві-Строса беларускі культуролаг Юрась Барысевіч слушна заўважыў, што барацьба бальшавікоў з непісьменнасцю мела на мэце тое самае — татальна ахапіць насельніцтва СССР сваім панаваннем.)

Гэта даўняя аблуда, якая спрэс трымаецца і дасюль, быццам над “цёмным” народам уладарыць лягчэй, чым над “адукаваным”. Магчыма, “цёмны” народ лягчэй паняволіць і трымаць у каланіяльным стане, але вялікае і трывалае панаванне верагоднае

толькі праз мову (пісьмо). Хрысціянская Царква шматкроць павялічыла прастору сваёй улады, калі даўмелася перакладаць “Біблію” і “Святое Дабравесце” на нацыянальныя мовы. Злучаныя Штаты Амерыкі наўрад ці дасягнулі б сёння амаль сусветнага панавання, каб Вялікая Брытанская імперыя (над якой, як вядома, ніколі не заходзіла сонца) у сваю пару не разгарнула дыскурс англійскай мовы на ўсю зямную кулю. Калі Брытанская імперыя змарнела і заняпала, амерыканцам толькі і заставалася напампаваць гэты (даўно сфармаваны) дыскурс “сусветнай” мовы ўласнай энергіяй і прагай экспансіі.

Цяпер становіцца зразумелым, чаму ніхто з крывавых рамантыкаў ранейшых эпохаў так і не змог здзейсніць запаветную мару — апанаваць усім светам. Рэч не ў тым, што ім не хапала жарсці ўлады, войскаў ці тадышніх магчымасцяў камунікацыі — ім не хапала іншага: тэхналогіяў разгортвання мовы інтэрвенцыі на ўсё чалавецтва.

Сусветнае панаванне нейкай *адной* сілы станецца магчымым толькі тады, калі ўсё людства будзе размаўляць *адной* мовай (ці прынамсі, хаця б ёю збольшага валодаць). І, падобна, гэты час не за гарамі. Прынамсі, яго тэарэтычную магчымасць сёння ўжо досыць цяжка аспрэчваць з узгляду на татальную глабалізацыю цывілізацыйных працэсаў, якія адбываюцца праз англійскую мову.

***

Але давайце пакінем універсалісцкія абсягі праблемы улада/мова і звернем на яе ўвагу ў канкрэтнай палітычнай сітуацыі Беларусі. Дакладней, нават не на ўсю гэтую праблему ў яе неверагодна зблытанай шматстайнасці, а толькі на той фрагмент, дзе палітычная ўлада і беларуская мова апынуліся ў жорсткай апазіцыі.

Час, як вядома, ляціць імкліва. І гэтаксама імкліва забываюцца падзеі, якія яго стваралі — нават і самыя яркія. Таму сёння ўжо нават цяжка сабе ўявіць (няўжо яно сапраўды такое было?!), што ад канца васьмідзесятых цягам шэрагу гадоў нацыянал-дэмакратычная апазіцыя выводзіла на вуліцы і плошчы гарадоў (найперш Менска) дзесяткі тысяч людзей пад бел-чырвона-белымі сцягамі. І тады на гэтых вуліцах і плошчах спрэс гучала беларуская мова, бо нават той, хто ёю не карыстаўся, спрабаваў згадаць што-кольвек з школьных гадоў (ці вясковага дзяцінства), каб хоць трохі дадаць і свайго голасу ў агульны гоман свабоды...

Аб прычынах заняпаду і татальнай паразы некалі магутнага нацыянал-дэмакратычнага руху ўжо хто толькі не пісаў (і я таксама) — таму не будзем туды вяртацца. Даволі пісалася і пра тое, што адной з іх было непрыхаванае жаданне “бел-чырвона-белых” збеларусіць усю Беларусь, хай сабе і гвалтам. Магчыма, наконт “гвалту” апаненты нацыянал-дэмакратаў і моцна перабольшвалі, хаця не магу не пагадзіцца, што яны мелі пэўныя падставы для сваіх засцярогаў.

Насамрэч, якраз беларуская мова сталася адной з галоўных прычынаў палітычнага заняпаду нацыянал-дэмакратычнага руху (вось яны нашыя айчынныя парадоксы!), аднак зусім не таму, што паспалітых надта напалохала перспектыва яе прымусовага вывучэння і з гэтага яны наладзілі “свядомым” собскую *вандэю*. Не, шаноўныя, і яшчэ раз — не! Праблема масавага астракізму нацыянал-дэмакратаў палягала ў куды большай безнадзейнасці, чым кансерватызм ды інтэлектуальная лянота “беларускай вандэі”. Рэч зусім у іншым, а менавіта ў тым, што беларуская мова ў самой сабе не мела тады *патэнцыялу ўлады*, прынамсі, дастатковага, каб, карыстаючыся ёю, заваяваць і трымаць уладу (выбачаюся за таўталогію) над усёй краінай.

Дзеля абгрунтавання гэтай тэзы нам не абысціся без хаця б

караценькага гістарычнага экскурсу. Старабеларуская мова, мова канцэлярыі Вялікага Княства Літоўскага, была найперш мовай улады. Менавіта на ёй трымалася вялізная дзяржава (ад Балтыйскага да Чорнага мора). Але як толькі цэнтр улады перасунўся ў Польшчу (пасля аб'яднання ВКЛ з Рэччу Паспалітай), старабеларуская мова заняпала і ўжо ніколі не адрадзілася.

Сучасная беларуская мова выспела ва ўлонні беларускай вёскі, пазбаўленай каналаў хоць якой улады. І доўгі час ёю карысталіся адно тая ж самая вёска ды плебейскія ўскраіны мястэчкаў і гарадоў. Першае злучэнне (вельмі кароткае па часе) беларускай мовы і ўлады адбылося ў 1918 годзе, калі была створаная Беларуская Народная Рэспубліка. Затым гэтае задзіночанне паспрабавалі аднавіць бальшавікі ў БССР (вядомая "беларусізацыя" 20-х гадоў), але неўзабаве яны пад корань вынішчылі ўсіх, хто выявіўся свядомым адэптам роднай мовы. Менавіта тады беларуская мова ператварылася са знаку бядоты ў "знак бяды" (бяды рэальнай, бязлітаснай і татальнай).

І вось зусім не зважаючы на тое, што беларуская мова не тоеснілася з уладай ні гістарычна (досвед БНР і зачыну БССР даўно забыўся), ні сітуацыйна (апрача часткі апазіцыі ў Вярхоўным Савеце, ніхто ва ўладных структурах ёю не карыстаўся), ні сацыяльна (большыня насельніцтва размаўляла калі не на рускай мове, дык на "трасянцы"), нацыянал-дэмакраты абралі беларускую мову галоўнай зброяй і адначасна ідэалагічным штандарам, які ўзнялі над паспалітым рушэннем "па ўладу". Хаця, як на сённяшні розум ("задним умом"), дык трэба было рабіць цалкам наадварот. Прынамсі, калі нацыянал-дэмакраты **сапраўды** хацелі ўзяць уладу, дык "мову" трэба было прыхаваць куды-небудзь у "абоз" і выкарыстоўваць хіба адно ў якасці нечага падобнага да "франтавога ансамблю песні і пляскі", як гэта сёння робіць Аляксандр Лукашэнка…

Калісьці я думаў, што Аляксандру Лукашэнку прасцей змусіць усіх "нацыяналістаў" размаўляць па-руску, чым самому навучыцца (сістэмна і годна) гаварыць па-беларуску. З гэтага, маўляў, і яго непрыхаваная агрэсія да "мовы". Але гэтак я думаў не лішне доўга, бо досыць хутка зразумеў, што калі б улада Аляксандра Лукашэнкі залежала ад санскрыту, дык ён раніцай наступнага дня ўжо гаварыў бы на санскрыце.

Цяпер я ўпэўнены: яшчэ да таго, як Аляксандр Лукашэнка канчаткова вырашыў балатавацца ў прэзідэнты, ён ужо добра разумеў (ці, хутчэй, інтуітыўна прадбачыў), што беларуская мова не мае таго палітычнага патэнцыялу, якога б хапіла, каб займець уладу над усёй Беларуссю. І ён выбраў мову, якая гэты патэнцыял мела, — рускую.

(Зрэшты, зусім верагодна, што будучы беларускі прэзідэнт яшчэ дэпутатам Вярхоўнага Савету ўжо мроіў маскоўскім Крамлём, а значыць, праблемаў з выбарам мовы ўлады ў яго ад самага пачатку не было.)

***

Сёння ў Беларусі расейская мова — гэта тэрыторыя ўлады, а беларуская — тэрыторыя свабоды. (Хаця свабоду без улады больш дакладна было б называць жабрацтвам.)

Цалкам усведамляю, што гэты падзел залішне схематычны, да таго ж ва ўласна палітычным сэнсе і не карэктны, бо мы маем даволі прыкладаў, калі ўлада прамаўляе па-беларуску (скажам, газета "Звязда" ці літарацкі холдынг "ЛіМ"), а руская мова спеліць дыскурсы свабоды (хаця б узяць сайт "Наше мнение"). Аднак у канцэптуальным плане я б на гэтым падзеле заўпарціўся, каб у сваю пару не паверыў знакамітаму выказванню Ралана Барта ("Лекцыя"): "Мова — гэта не рэакцыянер і не прагрэсіст, мова — гэта звычайны фашыст, бо сутнасць фашызму

не ў тым, каб забараняць, а ў тым, каб змушаць гаварыць”.

І ў гэтым сэнсе ніхто з нас не размаўляе ні па-французску, ні па-расейску, ні па-беларуску, усе мы гаворым адной мовай — мовай не той, дык іншай улады.

# ЛІРЫЧНЫ

# (МЕТАФІЗІЧНЫ)

# ЭПІЛОГ

Пачыналася гэтая кніга цверджаннем, што “Нацыянальны чалавек паўстаў з крызы рэлігійнага чалавека і, шырэй, з крызы цывілізацыі рэлігійнага тыпу”. Аднак у сваім расповядзе я толькі напрыканцы закрануў праблему *нацыянальнага чалавека* (зразумеўшы яго як форму супраціву баналізацыі сучаснага свету), бо яна патрабуе асобнай кнігі. І да таго ж гэта мусіць быць мастацкая кніга (ці драма). Інакш ніякім чынам не зразумець тую высокую трагедыю, якую спеліць у сваёй душы беларускі нацыяналіст, увесь час знаходзячы сябе на краені татальнай адсутнасці, якая пачынаецца з анталагічнага вымеру…

Я ёсць — значыць, мяне ўжо не будзе. Ніколі. Нідзе.

Мяне ніколі болей не будзе!

Быццё — гэта месца, дзе збіраюцца канаць назусім усе магчымасці быцця. Татальны могільнік усяго, што мела волю быць.

Вусціш быцця ў тым, што *быць* больш трагічна, чым не быць. Бо быць — гэта *ўжо* быць, а не быць — гэта толькі *яшчэ* не быць.

У *быць* адзін сэнс — болей не быць. Нідзе. Ніколі.

Гэтаму мета-песімістычнаму разуменню быцця, як тэктанічнага анігілятару ўсяго, што было вымкнутым у быццё, стаецца ў апазіцыю метааптымістычная ідэя быцця, як месца, дзе ўсё, што з'яўляецца быць, застаецца назаўжды альбо ў вечным кругазвароце, альбо ў несупынных працэсах трансмутацыяў, альбо...

Але і той, хто кажа, што ўсё несмяротнасць і той, хто кажа, што ўсё смяротнасць, пражывае аднолькавае жыццё. І, напэўна, пасля смерці яны не разыходзяцца ў розныя бакі — адзін у вечнае Нешта, другі ў вечнае Нішто,— а трапляюць у нейкую аднолькавую наканаванасць. У наканаванасць адсутнасці таго, што было.

Жах быцця — яно адбірае ў цябе быццё.

Неяк бацька паскардзіўся маці:

— Пражыў жыццё, а навошта жыў? Ужо смерць падсоўваецца, а навошта жыў?..

— Куды ад смерці падзенешся? З воронамі не паляціш! — адказала маці.

— Навошта жыў? — скрушна паўтарыў, сціснуўшы кулакі, бацька.

Гэтак і я яшчэ малады і поўны, як вока, жыццём да болю біў па сцяне кулакамі ў адчаі непатрэбнасці сябе ні сабе самому, ні свету.

Цяпер ужо не памятаю, ці быў у тым адчаі сваёй непатрэбнасці дамешак тугі па незваротнасці быцця. Напэўна, быў, бо гэтыя дзве зусім розныя эмоцыі нейкім дзіўным, неэўклідавым чынам заўсёды перасякаюцца на прасторы чалавека.

Я ўкрыжаваны на нелінейным крыжы незапатрабаванасці быццём і любові да быцця. Хаця дакладней будзе казаць не пра маю незапатрабаванасць быццём, а пра неабавязковасць *менавіта мяне* ў быцці. Бо казаць, што быццю непатрэбны чалавек, як адзін з феноменаў быцця (да якога, зразумела, дастасаваны і я), было б залішне безадказна.

Чалавек увогуле, чалавек, як феномен быцця, пэўна ж, для нечага патрэбны быццю. Прынамсі, цяжка, амаль немагчыма пагадзіцца, што феномен чалавека паўстаў з выпадковага збегу акалічнасцяў фізічнага свету, што чалавек у сваім цэлым нічым большым за гэтае цэлае не абгрунтаваны, ніякай сакральнай ці астральнай задумай не абумоўлены. Занадта буйна, мудрагеліста і адначасна вытанчана арганізавана быццё, сам чалавек і той неверагодна багаты ды фантастычна згарманізаваны свет, які чалавек стварыў,— каб лічыць усё гэта зборам выпадковых абставінаў…

Разам з тым, феномен чалавека і я-чалавек — гэта рашуча розныя падзеі. Калі пакарыстацца фальклорным архетыпам, дык феномен чалавека — гэта дрэва, а я-чалавек — лісток на тым дрэве. Таму мяне найперш цікавіць не той, хто пасадзіў дрэва і

нават не само дрэва, а лісток на ім.

Мая цікаўнасць зразумелая. Я сам — лісток, і неўзабаве восень. *Вечнаму дрэву* яшчэ быць тысячагоддзі, і не адну тысячу вёснаў на ім будзе шапацець лістота... А я ўсё часцей паглядаю на дол. Адтуль пад ранак ужо цягне холадам, і я пачынаю разумець, што ў лістка і дрэва розныя наканаванні: дрэву наканаваны лёс, лістку — толькі доля…

Можа, яно і добра, што ад вясны да восені лісток мысліць і пачувае сябе дрэвам, бо з гэтага ён мае хоць нейкі аптымізм быцця. Мною жыццё не вершыцца,— кажа ён. І яму лягчэй сыходзіць у невараць.

Але не толькі сыходзіць з быцця — трываць быццё яму лягчэй, калі ён атаясамляе сябе з усім чалавечым... Які я вялікі і бясконцы, які я разумны і здольны, — думае задзіночаны з усім светам я-чалавек і таксама пачувае сябе трохі бясконцым і трохі вечным… А бывае нават, што з гэтага пачування бярэцца выдумляць сябе ўжо зусім бясконцым і назаўжды вечным…

Вядома, пры жаданні можна цешыць сябе рознага тыпу містычнымі надзеямі на працяг свайго бытавання ў іншых вымярэннях ці светах, але ва ўсіх варыянтах самых мудрагелістых прыдумак я-чалавек смерцю аднолькава анігілюецца як цэлае і застаецца толькі фрагментам (найчасцей — інтэлігібельным) самога сябе. Але ж фрагмент чалавека гэта не тое, што ўвесь чалавек. Зусім не тое…

Хаця нават такое нішчымнае суцяшэнне, якое абапіраецца на гіпатэтычна-інфернальную магчымасць “перасялення” калі не ўсяго я-чалавека, дык хаця б нейкіх яго элементаў у іншасвет ёсць усяго толькі аптымізацыяй жаху небыцця. І рэч зусім не ў тым, што няма куды перасяляцца — няма што перасяляць. Я-чалавек рэалізуе ў тут-быцці сябе, як магчымасць самога сябе — цалкам. Напрыканцы ў ім не застаецца нічога, што патрабавала б дадатковага тэрміну жыцця, а тым болей — вечнасці.

Напрыканцы я-чалавек дасягае не толькі мяжы свайго розуму, краеня сваіх жаданняў, але і скрані магчымасці сябе ўвогуле. Няма ў ім чаму жыць далей нават тут, дзе ён цяпер жыве. Патэнцыял захопленых я-чалавекам прасторы і часу ім жа спрэс і дарэшты выбраны. Біялагічна, сацыяльна, дзейна, экзістэнцыйна, інтэлігібельна…

Быць — гэта значыць адбыцца. Цалкам.

Праз дарогу ад хаты, дзе я нарадзіўся і асталеў, за высокім каменным мурам пачыналіся старыя зарослыя могілкі. Як толькі мне было дазволена перабягаць праз дарогу, увесь вольны час я бавіў з сябрукамі на могілках. Яны былі для нас дзіцячай пляцоўкай, садком, піянерлагерам, стадыёнам. Там мы гулялі ў хованкі, індзейцаў, карты, футбол. Пазней там сустракаліся і гулялі з дзяўчатамі…

На ўжо ледзь прыкметных магільных капцах добра спелі суніцы. Яны былі буйнымі і салодкімі. Больш буйнымі і салодкімі за звычайныя — ці гэта нам толькі здавалася, бо патрэбна была пэўная адвага, каб ласавацца ягадамі з капцоў над дамавінамі, хай сабе і спарахнелымі.

Могілкам было шмат стагоддзяў, і пад нашымі нагамі спрэс пластаваўся чалавечы прах. Але калі не лічыць рэшткаў збуцвелых каменных крыжоў ды плітаў і рудых ад іржы жалезных агароджаў, запакаваных у густое кустоўе, дык гэтае месца нічым не адрознівалася ад старога парку ці вячыстага лесу, паколькі ніхто ўжо не памятаў пра тых — пад дзірваном...

Хто быў, а хто не быў?! Нехта быў — гэта адзінае, што мы ведалі. Бадай, нават не Нехта, а толькі Нешта... Нешта было тут, адбывалася, і ў гэтым адбыванні неяк прысутнічалі тыя, над сатлелым прахам якіх ужо даўно раскінулі шаты ліпы ды ясені...

Напэўна, мне не трэба было гойсаць па напластаваннях праху, скакаць праз здзірванелыя магільныя капцы, есці жменяй сакавітыя суніцы, мілавацца з дзяўчынай на заімшэлых

магільных плітах... Напэўна, мне не трэба было перабягаць праз дарогу на могілкі, і тады я разам з іншымі суцяшаў бы сябе, што не знікну дазвання ў невараці, а нейкім чынам перакінуся ў наступнае быццё...

Але я залішне доўга бавіўся на старых могілках, каб не помніць, ува што згортваецца жыццё чалавека, і дзе яно вершыцца. І таму, калі потым закарцела дазнацца пра самае кранальнае — чым ёсць быццё, хто ёсць ты і ці знойдзецца ў табе нешта, праз што ты апасля не згубішся ў невараці, я ўжо ведаў пачатак адказу: быццё падобнае да старых могілак за каменным мурам, дзе жывыя мілуюцца на надмагільных плітах, з якіх шурпаты час паздзіраў усе літары... Заставалася апазнаць працяг гэтага ведання. Але чым далей я заглыбляўся ў росшукі самога сябе, тым больш выразна разумеў, што спакваля губляю тое, што шукаю. А потым і дазвання згубіў. І ў які бок ні аглядаўся, куды ні зазіраў — няма мяне.

Чалавека можна прыдумаць — нельга знайсці. Без ліхтара ці з ліхтаром.

Нельга знайсці тое, чаго няма. Марна шукаць я-чалавека ў нейкіх яшчэ значэннях, апрача тых, што можна памацаць пальцамі. Я-чалавек не мае повязяў з трансцэндэнтным, ён цалкам знаходзіцца ў іманентным (рэальным) і ўвесь дарэшты вычэрпваецца тым месцам, якое займае ў часе і прасторы. І нічога болей, апрача гэтага месца, у ім няма.

Вось чаму, калі персаналізуючы праблему *хто ён, чалавек*, я пытаўся ў сябе *хто ён, я*, дык у адказ не чуў нават рэха. Пытанне душыла сябе моўчай.

Цяпер я ведаю, скуль тая моўча: недарэчна пытацца пра таго, каго няма — *хто ён*?

Інакш кажучы (мовай постструктуралістаў), чалавек — гэта пусты знак, "мнимая" велічыня, сімулякр свайго азначальніка... Таму чалавек заўсёды нагружаў сваю анталагічную адсутнасць альбо трансцэндэнтнай перспектывай альбо ідэалагемнай мэтай.

Бо адно такім чынам “мнимая” велічыня магла быць уяўленай у нейкіх канцэптуальных значэннях. Раб Божы, будаўнік камунізму, змагар за Бацькаўшчыну…

Карацей кажучы, месца (сутва) чалавека не ў ім самім, а ў тым прыметніку, якім ён сябе абцяжарвае. Усё гэта стасуецца і да *нацыянальнага* чалавека. Ён таксама “пусты знак” — толькі запоўнены *нацыянальным тэкстам*. І калі вышэй я казаў пра высокую трагедыю, якую паводле азначэння спеліць у сваім сэрцы беларускі нацыяналіст, дык перадусім меў на ўвазе наступнае. У сітуацыі, калі нацыянальны тэкст апынуўся пад пагрозай знікнення, кожны з нас, заангажаваных у беларускую Беларусь, рызыкуе аднойчы сустрэцца сам-насам з сваёй адсутнасцю. Паколькі без гэтага тэксту нам застанецца толькі “пусты знак”, азначаны сімулякрам нашага ўласнага імя.

Вось чаму свядомы беларус — гэта a priori трагічны чалавек. Калі заўгодна, ён і нарадзіўся з *духу трагедыі*, дзе пакуты і трагічная смерць героя абумоўлены самім жанрам. І таму яго існаванне на скраені дрогкай нацыянальнай субстанцыі заўсёды было спрэс праблематычным…

Але з чаго яшчэ, як не з духу высокай трагедыі, можа паўстаць воля да супраціву свайму немілажальнаму кону?